КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 52 (1282) 24 снежня 2016 г.

Падзея

Выступаючы на навагоднім дабрачынным свяце для дзяцей у час акцыі "Нашы дзеці" ў Палацы Рэспублікі, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што мы жывём на цудоўнай, шчодрай зямлі і нам ёсць чым ганарыцца. "У нас вялікая і слаўная гісторыя, багатая культура, прыгожая прырода. Але самае галоўнае — гэта шчырыя і працавітыя людзі, — сказаў ён. — Многія пакаленні беларусаў абжывалі нашу зямлю, бераглі яе і абаранялі. Яны будавалі фабрыкі і заводы, на якіх працуюць вашы бацькі. Яны глядзелі ў будучыню. І нам з вамі трэба як мага далей зірнуць у будучыню нашай Беларусі. Менавіта ад вас будзе залежаць, як будзе выглядаць наша зямля і якой стане краіна праз 20, 30 або 50 гадоў".

Дзяцінства і юнацтва — гэта вельмі важная пара ў жыцці чалавека, калі ў кожнага ёсць магчымасць навучыцца чамусьці новаму. "Вы можаце асвоіць любімы від спорту, можаце стаць добрымі музыкантамі, займацца выяўленчым мастацтвам, спасцігаць любы напрамак культуры ў нашай краіне. Педагогі навучаць вас усяму таму, што вы хочаце асвоіць. Мы, дарослыя, заўсёды дапаможам вам ва ўсіх добрых пачынаннях", — запэўніў Кіраўнік дзяржавы.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР: АКНО Ў КІТАЙ

21 снежня ў адным з самых сучасных будынкаў сталіцы па адрасе вуліца Клары Цэткін, 51а адкрыўся Кітайскі культурны цэнтр у Мінску.

Пасол Кітая Цуй Цымін і міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў на цырымоніі адкрыцця Кітайскага культурнага цэнтра ў Мінску.

Рашэнне стала лагічным вынікам амаль 25-гадовай гісторыі дыпламатычных зносін дзяржаў, а таксама пагаднення ад 10 мая 2015 года паміж старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзыньпінам і Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам аб узаемным устанаўленні культурных цэнтраў.

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў зазначыў, што ў 2017 годзе плануецца правесці Дні культуры Беларусі ў Кітаі. Менавіта да гэтай падзеі і будзе прымеркавана адкрыццё Беларускага культурнага цэнтра ў Паднябеснай. Дарэчы, прадстаўляць краіну ў рамках такой падзеі будуць артысты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета і айчынныя мастакі, якія прывязуць у Кітай выставу.

Работа Кітайскага культурнага цэнтра будзе скіравана на азнаямленне з гэтай краінай, інтэлектуальныя абмены і дыялогі, дэманстрацыю культуры і навучанне. У цэнтры рэгулярна плануюць праводзіць мерапрыемствы рознага кшталту, напрыклад, прадстаўленні ды выставы, навуковыя семінары, пераклады і рэкамендацыі літаратуры, мяркуецца наладзіць культурныя абмены і іншыя актыўнасці.

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Цуй Цымін упэўнены, што гэты культурны цэнтр выканае ролю пляцоўкі для бесперапыннага паглыблення ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва ў сферы кітайскай і беларускай культур, узмацніць разуменне, сяброўства паміж народамі краін, як і сацыяльную аснову ўзаемнага даверу.

Жаночы нацыянальны аркестр правінцыі Цзянсу.

У Кітайскім культурным цэнтры. / Фота Аліны САЎЧАНКА

Рэдакцыя плюс...

"Песняры" без эквівокаў

Мы палічылі слушным у год 75-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна завяршыць рубрыку "Рэдакцыя плюс..." у адыходзячым 2016-м сустрэчай з музыкантамі Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры". Калектыў не адмовіў нам у гэтым парыванні ды прыняў журналістаў "К" у сваёй студыі, дзе рэпеціраваў новыя песні, а чаканых гасцей з надыходзячымі зімовымі святамі павіншаваў бессмяротным хітом "Каляда" (дарэчы, 12 студзеня — у дзень нараджэння Мулявіна — гурт дасць прысвечаны яму сольны канцэрт у вялікай зале Белдзяржфілармоніі). Расчуленыя такім прыёмам, журналісты "К" усё ж адказалі на праяўленую ўвагу пытаннямі не толькі ветлівымі, але і падступнымі, як часам падавалася. У цэлым жа гутарка выйшла канструктыўная, у чым і прапануем вам пераканацца...

Падрыхтаваў Алег КЛІМАЎ

Арыентацыя — інтэлект

— Не было жадання перааранжыраваць "залатыя" кампазіцыі ансамбля зусім па-новаму, дапусцім, у рэп-стылістыцы? Каб юная публіка ажно завішчала ў захапленні?

Мікалай ПОТРУСАЎ (клавішныя; далей — **М.П.**): — А старыя песні і гучаць крыху па-новаму, тыя ж "Белоруссия" або "Беловежская пуща". Але моцна сыходзіць ад асновы не хочацца, прагназуючы розную рэакцыю слухачоў, частка якіх абавязкова застанецца незадаволенай такімі эксперыментамі.

Алег ЖАЛЕЗНЯКОЎ (гітара, вакал; **А.Ж.**): — Вядомы каларыт павінен заставацца, рэзка нічога мяняць нельга.

— Ці здаралася такое, што ансамбль потым адмаўляўся ад эксперыментаў, аднойчы вынесеных на публіку? Альбо яны наогул не выходзілі за сцены студыі?

А.Ж.: — Звычайна ўсё, што нараджаецца ў ёй, мы на публіку выносім. І новыя версіі старых хітоў, і проста новыя песні. Так, бывае, што людзі літаральна патрабуюць адно "залатога" рэпертуару, прычым толькі ў кананічным выглядзе. Але мы ўжо неяк прызвычаілі свайго асноўнага гледача да таго, што наша праграма складаецца і з шлягераў часоў Мулявіна, і з кампазіцый, якія з'явіліся ў нас у апошнія гадоў трынаццаць.

Раман КОЗЫРАЎ (дырэктар-мастацкі кіраўнік, клавішныя; **Р.К.**): — На адным з апошніх, акустычных, канцэртаў мы не сыгралі ні "Вологды", наогул нічога з той серыі, і былі прынятыя выдатна. Мы пераканалі трыста чалавек гледачоў у тым, што постмулявінская творчасць "Песняроў" мае права на існаванне.

Артур МІХАЙЛАЎ (вакал; **А.М.**): — Некалькі новых песень, якія зроблены не ў духу тых "Песняроў", публіка палюбіла абсалютна шчыра. Напрыклад, "Разам плыць". Што да старых, у іх хочацца прыўнесці свой характар, новую афарбоўку, праспяваць іх інакш, не як ранейшыя, знакамітыя вакалісты ансамбля, каб ужо як бы нас лічылі першымі іх выканаўцамі.

— Цяжка вам...

М.П.: — Так, адказнасць цісне.

— Чаго чакае ад вас маладая публіка?

М.П.: — Любая публіка, ідучы на канцэрт "Песняроў", настроена на пэўнага кшталту музыку, песню, стыль, характэрныя толькі для нас.

— У рамках канцэрта "Re: "Песняры" ў 2014 годзе вы гралі сэт дакладна не для "песняроўскага" слухача. І якія засталіся ўражанні?

Р.К.: — Нават нашы самыя непрымірымыя крытыкі адзначылі, што мы былі самым прафесійным складам на тым мерапрыемстве. І для публікі мы апынуліся сваімі, зала выдатна рэагавала — танцавала, падпявала. Такія метамарфозы адбываюцца пастаянна на выступах ансамбля, калі моладзь прыходзіць на іх, чакаючы нейкага рэтра, а сыходзіць, праслухаўшы сучасную музыку ў актуальных аранжыроўках. Антаганізму паміж намі няма, расчараваных не бывае.

Заканчэнне — **на старонках 6 — 7.**

Наша спадчына на ВДНГ

У снежні 2016 года завяршылася рэстаўрацыя скульптурнай кампазіцыі "Працаўнікі Беларусі" павільёна "Рэспубліка Беларусь", што месціцца на тэрыторыі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.

Работы выконваліся за кошт сродкаў бюджэту Саюзнай дзяржавы на падставе пастановы Савета міністраў Саюзнай дзяржавы. Гэтым дакументам на Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі ўскладзены функцыі дзяржаўнага заказчыка-каардынатара работ па рэстаўрацыі. Аднаўленнем скульптурнай кампазіцыі "Працаўнікі Беларусі" займалася творчая група ЗАТ "Белрэстаўрацыя" пад кіраўніцтвам намесніка генеральнага дырэктара па рэстаўрацыі Аляксандра Клімашонка. Над "Аграномам" працавалі скульптары Канстанцін Касцючэнка і Сяргей Логвін, фарматар Дзмітрый Захарэвіч. "Даярку" аднаўлялі скульптары Уладзімір Піпін і Міхаіл Шкробат, фарматар Уладзімір Маркевіч. "Механізатарам" займаліся скульптары Уладзімір Нефёд і Іван Арцімовіч, фарматар Аляксей Мысліўцаў. Копію "Калгаснікі" выканалі скульптар Валерый Дудко і фарматар Максім Паляшчук. "Хлебароб" выйшаў з-пад рук скульптараў Яраслава Філіповіча (ён таксама выступіў у ролі фарматара) і Ганны Дыдышка, фарматара Яўгена Білея. Паўторна адноўленыя, скульптуры ўжо занялі свае месцы на другім ярусе вежы павільёна.

Праца была высока ацэненая Урадам горада Масквы, а Урад Рэспублікі Беларусь быў узнагароджаны дыпломам лаўрэата конкурсу "Маскоўская рэстаўрацыя-2016" за лепшую арганізацыю рамонтна-рэстаўрацыйных работ на аб'екце культурнай спадчыны.

Скульптурная кампазіцыя да і пасля рэстаўрацыі. / Фота прадастаўлена ЗАТ "Белрэстаўрацыя".

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Віншаванні

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — члены Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы сардэчна віншуюць работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва, рэдакцыйны калектыў і чытачоў газеты "Культура" са светлымі святамі — Нараджэннем Хрыстовым і Новым годам!

Год культуры, які адыходзіць у гісторыю, для грамадзян нашай краіны быў багатым і шчодрым на культурныя падзеі, а для работнікаў культуры і дзеячаў мастацтва — адказным і напружаным. Мы глыбока ўдзячны вам за высакародныя намаганні, прафесіяналізм, майстэрства, добрасумленную працу дзеля развіцця духоўнага, інтэлектуальнага і культурнага патэнцыялу грамадства.

Няхай жа новы год прынясе вам шчаслівыя перамены, поспех у справах і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Хай спраўдзяцца вашы ідэі і задумы, а сілы, веды і ўдача дапамогуць у дасягненні намечаных мэт.

Моцнага вам здароўя, шчасця і дабрабыту.

Старшыня камісіі Ігар МАРЗАЛЮК

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" шчыра віншуе нашых падпісчыкаў і чытачоў з надыходам Новага 2017-га года і Нараджэннем Хрыстовым!

Жадаем плёну ў Вашай працы на карысць беларускай культуры, моцнага здароўя, дабрабыту і поспеху ва ўсіх пачынаннях. Спадзяёмся, што газета "Культура" і часопіс "Мастацтва" і надалей застануцца вашымі вернымі навігатарамі ў культурным працэсе Беларусі і свету.

Ёсць мільённы!

Падчас сустрэчы мільённага наведвальніка музея.

У 15 гадзін 21 снежня 2016 года ў касу Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны па ўваходны білет звярнуўся звычайны наведвальнік, але касір Людміла Шкурская ўрачыста абвесціла, што ён — мільённы!

Два з паловай гады таму музей гасцінна расчыніў свае дзверы для наведвальнікаў у новым будынку ля стэлы "Мінск — горад-герой". Штогод установу наведваюць звыш тысячы чалавек розных узростаў, прафесій, нацыянальнасцей. Сярод іх шмат гасцей з краін СНД, Кітая, Вьетнама, Ізраіля, Польшчы, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША. "Мільённшчыкам" жа стаў 50-гадовы мінчанін Барыс Казамель — майстар вытворчай адукацыі Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых працаўнікоў і спецыялістаў ДТСААФ Рэспублікі Беларусь. Як высветлілася, Барыс — унук ветэрана вайны мінамётчыка Васіля Казамеля. Дырэктар установы Дзмітрый Шляхцін цёпла павіншаваў шчасліўчыка і ўручыў яму імянны ўваходны білет. У Зале перамогі Барысу Васільевічу ўручылі сертыфікат на бясплатнае наведванне музея і сувенір, а яго сынам Матвею і Ціхану, якія прыйшлі разам з бацькам на экскурсію, — навагоднія падарункі і буклеты.

Мікалай ШАЎЧЭНКА, член Беларускага саюза журналістаў

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 3 910. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 23.12.2016 у 19.00. Замова 4842. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Мільярды, кадры

На рэдакцыйнай планёрцы было вырашана, што падвядзенне вынікаў 2016 года варта пачынаць ужо з гэтага нумара. Што мы і зрабілі. Так што ў сённяшняй "К" свае меркаванні наконт набыткаў мінулага Года культуры прадставяць начальнікі і намеснікі начальнікаў галоўных упраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў, а ў наступных — кіраўнікі шэрагу раённых аддзелаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Ларыса АЛЕНСКАЯ:

— Мінулы Год культуры прайшоў для нас пад знакам розных маштабных мерапрыемстваў і юбілейных урачыстасцей. Так, мы сёлета адсвяткавалі 25-годдзе Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" і 25-годдзе Музея Марка Шагала ў абласным цэнтры, 30-годдзе Беларускага тэатра "Лялька", 50-годдзе Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова, 45-годдзе Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў ды некаторыя круглыя юбілейныя даты. Цягам першага паўгоддзя ў нас ладзіўся абласны агляд-конкурс творчых калектываў, удзел у якім прынялі каля 5 тысяч чалавек, а выніковы канцэрт на сцэне Летняга амфітэатра ў канцы мая сабраў каля паўтары тысячы артыстаў.

Згадаю таксама і маштабны абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла "Дажынкі", які прайшоў сёлета ў Сянно. Да гэтага свята былі прыведзены да ладу мясцовыя Дом культуры, бібліятэка, музей, ДШМ. Таксама 9 мая пасля маштабнай рэканструкцыі быў урачыста адкрыты мемарыяльны комплекс "Прарыў" на Ушаччыне і цалкам у новым фармаце 2 ліпеня адбылася 57-я сустрэча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны на Кургане Дружбы.

Цягам года на рамонтна-будаўнічыя работы на аб'ектах культуры вобласці было асвоена каля 50 мільярдаў "старых" рублёў. Мы адкрылі культурна-аздараўленчы цэнтр у Лёзна, дом культуры ў аграгарадку Асінторф Дубровенскага раёна, завяршылі асноўныя рамонтныя мерапрыемствы ў будынку музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Акрамя таго, у верасні ў абласным цэнтры адкрыўся музей гісторыі прыватнага калекцыянавання, на рамонт якога цягам некалькіх гадоў было выдаткавана каля 4,5 мільярда недэнамінаваных рублёў, а на стварэнне новай экспазіцыі — яшчэ 700 мільёнаў "старых" рублёў. Таксама ў нас працягваецца аптымізацыя, дзякуючы якой эканомія бюджэтных сродкаў склала прыкладна 500 мільёнаў недэнамінаваных рублёў, а паступленні ад пазабюджэтнай дзейнасці ўстаноў культуры склалі прыкладна 17 % ад бюджэтнага фінансавання сферы.

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама — начальнік упраўлення культуры Ірына ПЫРКОВА:

— Са знакавых мерапрыемстваў адразу ж згадаю Дзень беларускага пісьменства, што прайшоў у верасні ў Рагачове, а таксама творчы марафон "Адраджэнне", прысвечаны 30-й гадавіне катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (фінальны канцэрт яго адбыўся ў Ельску 26 красавіка з удзелам Прэзідэнта Беларусі). Акрамя гэтага, цягам года ў вобласці "прагучалі" маштабныя рэспубліканскія акцыі: фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" ў гарпасёлку Акцябрскі, фестываль этнакультурных традыцый "Покліч Палесся" ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна, VIII Міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод" і некаторыя іншыя.

Таксама не магу не адзначыць і тое, што ў Рагачове сёлета быў адкрыты абноўлены раённы музей, а таксама Дом кнігі з новай кніжнай крамай. Дарэчы, у Доме кнігі на сёння ўжо адбываюцца абласныя і рэспубліканскія мерапрыемствы і семінары. А яшчэ мы набылі новы канцэртны раяль "Yamaha", сродкі на які выдаткаваў спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ў Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Нестара Сакалоўскага, так што цяпер міжнародны дзіцячы конкурс "Музыка надзеі" напоўніцца зусім новым гучаннем…

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана БАРАНОК:

— Згадаць пра найбольш адметную акцыю мне даволі лёгка: гэта, натуральна, усе мерапрыемствы, праведзеныя ў Год культуры ў культурнай сталіцы Беларусі — Маладзечна. На працягу 2016-га тут адбыліся некалькі соцень культурных праектаў рознага ўзроўню, у тым ліку міжнародныя пленэры, фестывалі, тэлездымкі і форумы, а таксама гастрольна-канцэртныя праекты. Кожны з іх меў свой стыль і тэматыку.

З іншых знакавых падзей года адзначу XXVI Адкрыты абласны фестываль духавой

Ларыса Аленская.

Ірына Пыркова.

Святлана Баранок.

Калі квітнее кактус

Што замінае развіццю рэгіянальнай культуры

Я вельмі кепскі кветкавод. Але ўсе падваконні ў маёй кватэры застаўлены вазонамі з самымі рознымі раслінамі. Я забываюся іх паліваць, часта лаюся, асабліва на кактусы, а яны ўпарта цягнуцца ўверх, і раз-пораз так мудрагеліста квітнеюць, што я мімаволі пачынаю разважаць пра нелагічнасць любові ды кахання… Культура нашых раёнаў і вёсак нагадвае мне кактус, які можна не паліваць, не аддзячваць пяшчотным словам, бо перыядычнасць яго квітнення ўсё роўна будзе залежаць ад нейкіх іншых, не надта зразумелых нам абставін.

Яўген РАГІН

У раённай культуры разбіраюцца ўсе. Колькі разоў быў сведкам таго, як пэўныя старшыні райвыканкамаў (аграрыі па адукацыі), стомленыя надоямі і прывагамі, актыўна займаліся рэжысурай і адборам нумароў для канцэрта з нагоды ці не любога ўрачыстага сходу. І вынікі дзейнасці работнікаў культуры можа ацаніць кожны. Праўда, па розных крытэрыях. Пенсіянер з настальгіяй пра мінулае — па ўласных эмоцыях, фінансіст з праверкай — па адхіленнях ад заканадаўчай базы. Так было заўжды. У тых раёнах, дзе начальнік аддзела, што адказвае за мясцовую культуру, змог давесці кіраўніку райвыканкама сваю незаменнасць, работнікі клубаў, бібліятэк, музеяў адчуваюць, хоць і мінімальную, але пастаянную фінансавую ўвагу. Так было заўжды… А цяпер — уласна пра тэндэнцыі менавіта сённяшняга стану сельскай культуры.

Што непакоіць…

Дзве чуткі настойліва блукаюць па культурных абсягах краіны. Пра працяг аптымізацыі і пра падзел аддзела на самастойныя структуры — культурную ды ідэалагічную. Вакол гэтага і паспрабуем паразважаць.

Аптымізацыя вытворчасці арт-прадукта (нават у раённых умовах) — гэта ўдасканаленне вытворчага працэсу для павышэння якасці працы. Заўважце, пра скарачэнне ўстаноў і працоўных гаворкі няма аніякай. У нашым жа выпадку, калі клубы з бібліятэкамі скасоўваюцца і пасады іх супрацоўнікаў беззваротна знікаюць, мы маем тэндэнцыю не развіцця, а заняпаду. Думка — не толькі мая. Пад гэтым меркаваннем гатовыя падпісацца шматлікія начальнікі раённых аддзелаў з немалым вопытам працы.

Вось доказы таго, што якасць клубных ды бібліятэчных мерапрыемстваў сям-там падае. Проста за іх правядзенне адказваюць, скажам, не два-тры чалавекі, як калісь, а адзін. І ўвогуле аптымізацыйнае пераўтварэнне ўстановы культуры ў клуб-бібліятэку ці ў бібліятэку-клуб — гэта першы крок да непазбежнага скасавання такой установы і цалкам заканамернага знікнення вёскі.

Прафесіянал запярэчыць, калі гэты заптымізаваны работнік культуры ў колькасці аднаго чалавека на ўстанову — дасведчаны, дык ён падключыць актыў, больш шчыльна пачне супрацоўнічаць з мясцовымі школай ці дзіцячым садком (пры ўмове, што яны засталіся) і ў выніку захавае ранейшую якасць працы. Пярэчанне — справядлівае. Але ці здольны на такое работнік культуры, калі ён не мае спецыяльнай адукацыі ды прыйшоў у клуб ці бібліятэку з сельскай гаспадаркі або з сістэмы, скажам, гандлю. І гэта пры тым, што ў пэўных сельскіх бібліятэках безнадзейна састарэў камп'ютарны парк, а да стварэння яго ў асобных сельскіх ДК так і не прыступалі.

Вельмі істотны, на мой погляд, момант яшчэ вось у чым. Як паказвае журналісцкая практыка, іншым разам маланаселеныя і аддаленыя вёскі, што ўжо не маюць стацыянарных клубаў ды бібліятэк, цягам года не бачаць бібліёбусаў і аўтаклубаў. Асабліва ўзімку, калі дзень кароткі, калі пенсіянерскую душу сум захоплівае ў палон (прачытайце пра гэта артыкул Фаіны Малюжэнец на старонцы 5) і абавязкова хочацца з кім-небудзь сустрэцца ды пагаварыць па душах. Абсалютна не адмаўляю та-

і эстрадны мікс

музыкі "Майскі вальс", на які з'ехаліся прадстаўнікі з усёй Міншчыны, а таксама з Латвіі, Расіі і Украіны, фестываль народнай творчасці "Напеў зямлі маёй", які традыцыйна прымала Мар'іна Горка і дзе ўдзельнічала каля 700 выканаўцаў, абласны фестываль народных тэатраў "Бярэзінская рампа". Таксама згадаю, што сёлета адрамантавалі дзіцячую школу мастацтваў у Лагойску. Акрамя таго, пры дапамозе прафсаюзаў на мемарыяльным комплексе "Курган Славы" ў Смалявіцкім раёне напярэдадні Дня Перамогі, 7 мая, адкрылася сонечная фотаэлектрычная станцыя, дзякуючы якой мемарыяльны комплекс цяпер асвятляецца круглыя суткі.

Сяргей Панасюк.

Андрэй Кунцэвіч.

Аляксандр Вярсоцкі.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Сяргей ПАНАСЮК:

— У Год культуры ў нас значна ўзрасла колькасць культурных мерапрыемстваў у многіх раёнах вобласці. Традыцыйнымі і маштабнымі сталіся акцыі, прымеркаваныя да 9 мая, 22 чэрвеня, іншых знакавых дат і падзей у гісторыі Беларусі і Брэстчыны. Цікавым мне падаецца новы фармат, які атрымаў абласны конкурс-фестываль сучаснага мастацтва "Эстрадны мікс" у Пружанах (у ім мы аб'ядналі адразу тры абласныя фестывалі-конкурсы). Таксама адзначу абласное свята-кірмаш працаўнікоў сяла "Дажынкі", якое прайшло ў верасні бягучага года ў Драгічыне, і, натуральна, нашы абласныя брэнды — міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія музычныя вечары" і тэатральны фестываль "Белая вежа"...

Таксама вельмі рад, што сёлета нам удалося завяршыць будаўніцтва новага Палаца культуры ў горадзе Бяроза і ў лістападзе адчыніць дзверы ў гэтую ўстанову культуры для жыхароў і гасцей раённага цэнтра. Будоўля расцягнулася на чатыры гады і абышлася абласному бюджэту ў больш як 7 мільёнаў дэнамінаваных рублёў. Акрамя таго, у 2016-м працягваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы ў палацы Пуслоўскіх, што ў Косаве. Агульная сума фінансавання з бюджэту Брэстчыны і са сродкаў Міністэрства культуры краіны склала каля 4 мільярдаў "старых" рублёў. У наступным годзе з абласнога бюджэту запланавана выдаткаваць на працяг гэтых работ прыкладна 2 мільярды "старых" рублёў. Спадзяемся ў гэтым плане і на далейшую фінансавую падтрымку гэтага аб'екта з боку Міністэрства культуры Беларусі.

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ:

— З найбольш знакавых мерапрыемстваў, якія адбываліся на Магілёўшчыне цягам Года культуры, адзначу, зразумела, III Нацыянальны музейны форум "Музеі Беларусі", што прайшоў у абласным цэнтры. Таксама хацеў бы сказаць пра наш унікальны праект па выданні кнігі "Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадрукавання", які з'явіўся дзякуючы намаганням многіх людзей.

У гэтым годзе мы завяршылі рэканструкцыю Быхаўскага краязнаўчага музея і гэта вельмі значная падзея як для вобласці, так і для раёна, які пацярпеў ад радыяцыйнага забруджвання пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Таксама мы нядаўна адкрылі новую кіназалу ў Чавусах, дзе любы ахвотны можа паглядзець цяпер фільмы ў фармаце 3D. Таксама не магу не згадаць тыя болевыя кропкі, што перашкаджаюць упэўненаму развіццю галіны. Урэшце, варта ведаць, што лячыць.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

го, што ў большасці рэгіёнаў мабільныя ўстановы культуры працуюць цяпер з павышанай нагрузкай. Але застаецца фактам і тое, што год таму "К" пісала, як у адным з раёнаў аўтабібліятэка не выязджала на маршруты, бо не было з чаго прыдбаць зімовую гуму на колы. А машыну раз-пораз яшчэ і бензінам запраўляць трэба, і рамантаваць неабходна. А сума пазабюджэтных даходаў — не гумавая.

У раёнах баяцца чарговай хвалі аптымізацыі. Бо ў выніку яе кваліфікаваных кадраў іншым разам не стае не толькі ў аграгарадках, але і ў раённых цэнтрах. Цэнтралізацыя і пераўтварэнне ў юрыдычныя асобы ладзіліся ў кожнай вобласці па свойму. І дасюль сям-там не разабраліся са статусамі, скажам, цэнтралізаваных бухгалтэрый ці гаспадарчых груп. А сельскія клубы нечакана пераўтварыліся ў аддзелы, сектары ці філіялы. Што будзе заўтра?

Пра эканоміку культуры нам застаецца толькі марыць. Нават тыя будынкі колішніх устаноў, што пайшлі з малатка, не прынеслі аддзелам ніякага грашовага "навару". Так, сельская культура навучылася зарабляць. Балазе яе камерцыйны складнік не стаў вядучым. І ніхто пакуль не настойвае, каб установы культуры пачалі пераходзіць на самаакупнасць. Але гаворка пра павелічэнне долі ўласных даходаў вядзецца пастаянна. Вось толькі без укладання грошай растуць толькі кактусы.

Праблемным застаецца і кадравае пытанне. Яно такім і застанецца, пакуль у вёсках і раённых цэнтрах не з'явіцца якаснае ды гарантаванае жыллё для маладых спецыялістаў ад культуры. Мала маладых творцаў, мала новых форм працы. Далёка не паўсюль усвядомілі, што такое праектная дзейнасць, падмацаваная нестандартным пошукам пазабюджэтных грошай (іншым разам яго называюць "краўдфандынг"). Мы толькі пачынаем прыглядвацца да таго, чым заняты ўвесь вольны творчы свет.

Сілы работнікаў культуры распыляюцца яшчэ і з той прычыны, што культурны базіс у межах аддзела ІРКСМ мае ідэалагічную надбудову. Такая "архітэктура" не надта спрыяе развіццю сапраўды творчага стаўлення да працы. Шматлікія пасяджэнні і нарады замінаюць.

Я — не аматар негатыву. Проста хачу акрэсліць (з дапамогай шэрагу неабыякавых начальнікаў аддзелаў ІРКСМ) палягаюць на сёння ў інтэграванай прасторы, дзе знітаваны клопаты музейныя, краязнаўчыя, клубныя. Унікальнымі раённымі музеямі, якіх пакуль няшмат, але якія паспелі стаць нацыянальнымі брэндамі. Вельмі маштабным аматарскім тэатральным рухам, што разнявольвае рабочых людзей і пастаянна пашырае атрад творцаў…

Гэтыя "плюсы" пераважаюць вышэйзгаданыя "мінусы". Інакш кажучы, нам ёсць што адстойваць і ўдасканальваць. І я схлусіў наконт таго, што не ведаю, чаму квітнее "кактус". Адказ тут не надта складаны: на трох невукаў у рэгіянальнай культуры заўжды знойдзецца адзін неабыякавы прафесіянал, які будзе працаваць не за грошы, а за ідэю выратавання свету прыгажосцю. Так, ён не бачыць выхаднога дня, працуе да позняй ночы, не мае звычкі хлусіць, можа прарэджваць буракі, але і ў фугах Баха арыентуецца, як у родных. Ён вытрывае, перацерпіць, недаспіць, урэшце, паплача ў адзіноце, але данясе да людзей тое, што прынята называць нацыянальнай культурай.

Год культуры заканчваецца. Час культуры доўжыцца бясконца.

...і ўсяляе надзею

Я веру ў нацыянальную культуру, якая мацуецца на традыцыйных каранях, што знітоўваюць нас з вёскай, з непасрэднымі носьбітамі народнага мастацтва. Не проста веру, а ганаруся. Непаўторнымі рамёствамі, што атрымалі развіццё і сёння ўдасканальваюцца. Адметнай мастацкай самадзейнасцю, якая не мае, на мой погляд, аналагаў у свеце па сваёй "прафесійнасці". (Адной з галоўных падзей адыходзячага года стаў для мяне не столькі юбілейны "Славянскі базар у Віцебску", колькі бліскучыя справаздачныя канцэрты мастацкай самадзейнасці ў абласных цэнтрах. Вось гэта — тэндэнцыя развіцця!) Ганаруся неўміручым самабытным фальклорам, які таксама развіваецца ў маладзёжным асяродку, нягледзячы на амаль паўсюдны недахоп прафесійных фалькларыстаў, харэографаў, харавікоў. Цікавымі бібліятэчнымі знаходкамі, якія пра той унікальны аб'ект, які паўстаў на Замкавай гары ў Мсціславе: сёння гэтае гістарычнае месца ўпрыгожваюць драўляныя пабудовы ў стылі XII стагоддзя, а таксама тут можна паглядзець на закансерваваны старажытны горад. Акрамя таго, у Мсціславе ў будынку былога кінатэатра сёлета быў адкрыты новы Палац шлюбу і ўрачыстасцей. Але тое не значыць, што жыхары горада засталіся без кіно: у мясцовым раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці цяпер таксама функцыянуе кіназала, дзе можна пабачыць фільмы ў папулярным фармаце 3D.

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ:

— Цягам года ў нас адбылося даволі шмат знакавых культурных акцый, з якіх у першую чаргу адзначу Фестываль нацыянальных культур у Гродне, Міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў "Каложскі Дабравест", Міжнароднае свята арганнай музыкі "Арганы Еўропы гучаць у Гродне", Міжнародны фестываль класічнай музыкі "TyzenHouse-2016" і іншыя.

Таксама паляпшаем і матэрыяльна-тэхнічную базу ўстаноў культуры вобласці. Напрыклад, сярод іншага, зроблена першая чарга рэканструкцыі Гродзенскай абласной філармоніі: дзякуючы гэтаму ўведзены ў дзеянне адміністрацыйны будынак установы. Рэканструкцыя філармоніі, натуральна, будзе працягвацца і далей, як і рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы на Старым замку ў Гродне: на гэтым аб'екце запланавана асвоіць 10 мільярдаў "старых" рублёў.

К

Дзяжурны па нумары

Пра пяць гадоў і адзін скандал

У перадднавагодняй мітусні неяк зусім забыўся цікавы юбілей. Пяць гадоў таму будынак па мінскім адрасе Някрасава, 3 змяніў шыльду і адчыніў дзверы для ўсіх ахвотных. Так распачаў сваю публічную гісторыю Цэнтр сучасных мастацтваў. Далей былі самыя розныя пертурбацыі: змена кіраўніцтва, потым — рэарганізацыя і наданне статуса нацыянальнага, урэшце, паступовы рамонт… Але самае галоўнае — іншае. Сёння ўжо нікому не трэба тлумачыць, дзе гэты цэнтр знаходзіцца. Ён — сапраўды адбыўся.

Ілья СВІРЫН

Калі хто не памятае, варта нагадаць, што сваю перадгісторыю новая ўстанова культуры распачала ў трохі іншай эканамічнай рэальнасці, калі зусім не шкодна было марыць пра шыкоўны гмах з ультрасучаснай начынкай, здатны ўцерці нос аналагічным цэнтрам прынамсі ў суседніх краінах. Мары развеяліся як дым, пакінуўшы па сабе толькі даволі сціплае памяшканне былых Творчых майстэрняў — у дадатак да ўжо існых не менш сціплых плошчаў музея.

І тым не менш, будынак на Някрасава і сапраўды стаў цэнтрам. Там рэгулярна ладзяцца смелыя паводле ўсіх параметраў выставы, чыя прыналежнасць да contemporary art не выклікае сумневаў нават у скептыкаў, там ледзь не штодня праходзяць размаітыя спектаклі, імпрэзы, кінапаказы… Сам гэты досвед пераканаўча засведчыў: для поспеху трэба не так і шмат. Хаця б мінімальная матэрыяльная база і, найперш, добрая каманда. Пасля таго як цяперашняй дырэктарцы НЦСМ Наталлі Шаранговіч удалося яе сабраць, завабіўшы на працу цэлы шэраг ужо "здзейсненых" куратараў і проста шчырых культуртрэгераў, справа адразу пайшла. І людзі на Някрасава пацягнуліся — хто са сваімі ідэямі і праектамі (а да іх тут ставяцца надзвычай прыязна), а хто і проста дзеля цікаўнасці.

Дзейнасць Цэнтра многія крытыкуюць, прычым з самых розных пазіцый. Яно і зразумела: кожны і дасюль разумее паняцце "сучаснае мастацтва" па-свойму. Але ў чым не адмовіш НЦСМ, дык гэта ў адэкватнасці — адэкватнасці той культурнай сітуацыі, якая ў нас склалася на дадзены момант. Цэнтр наўрад ці спрабуе яе фарматаваць, па-валюнтарысцку вызначаючы актуальныя трэнды і адсоўваючы ў бок тых, хто ім не адпавядае. Хутчэй, ён проста транслюе тое, што ў нас ёсць. І другі аспект, які непасрэдна вынікае з першага — адкрытасць да "вонкавых" ініцыятываў. Як выявілася, іх у нас даволі шмат, і калі знайшлася пляцоўка для рэалізацыі, яны адразу сталі бачнымі.

…Тым не менш, акурат пад першы юбілей, які чамусьці ніхто не святкуе, НЦСМ апынуўся ў эпіцэнтры немалога (для тутэйшага штылю) скандалу. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь Аляксей Талстоў падаў на яго ў суд, не атрымаўшы адказу на запыт пра змест фондавых калекцый Цэнтра, кошт закупленых установай твораў мастацтва, а таксама склад экспертнай камісіі. Суд прыйшоў да высновы, што правы грамадзяніна ў дадзеным выпадку не парушаныя.

Не буду каментаваць ані вырак, ані сам учынак грамадзяніна, не буду і дашукваца тых матывацыяў, якія падахвоцілі яго да гэткага кшталту актыўнасці. Звярну ўвагу толькі на адну акалічнасць — папраўдзе сімптаматычную для нашага часу. Судовы інцыдэнт спарадзіў ці не больш публікацыяў у СМІ, чым любая з сёлетніх выставаў, што ладзіліся ў НЦСМ. А іх было шмат, цікавых і розных. І інтравертная "Усё было па-іншаму", і даволі правакатыўная "Анатомія", і добрая падборка маладых аўстрыйскіх мастакоў, якая дэманструецца там сёння…

Але ніводная з іх не ўспеніла сацсеткі ды не выклікала тых хваляў эмоцый, якія здолела спарадзіць судовая позва аднаго неабыякавага грамадзяніна. Раней сцверджанне пра тое, што ваколмастацкія скандалы цікавяць публіку болей за само мастацтва, выглядала спрэчным і занадта рэзкім. Цяпер жа пэўную частку публікі, падобна, нічога апрача скандалаў і не цікавіць.

К

Увага! Аб'ява!*

Установа адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— дацэнт кафедры майстэрства акцёра;
— загадчык кафедры жывапісу;
— загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва;
— дацэнт кафедры графічнага дызайну;
— дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дызайну.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас:
220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 366-93-41.

“...Рампа” ёсць, артыстаў хапае: дзе ж маладыя рэжысёры?

У Беразіно прайшоў юбілейны X Абласны фестываль народных тэатраў “Бярэзінская рампа”. Атмасфера свята, гасціннасць гаспадароў, безліч намінацый і прызоў, цудоўная арганізацыя, шыкоўная “трыумфальная арка” ў выглядзе адметнага тэатралізаванага адкрыцця і бліскучага гасцявога спектакля закрыцця — усё гэта памножылася на праблемы развіцця аматарскіх калектываў. Што ж маем у выніку — а галоўнае, на перспектыву?

Надзея БУНЦЭВІЧ,
Мінск — Беразіно — Мінск

Сцэна са спектакля “Чума на абодва вашыя дамы” тэатра-студыі “Паралель” Палаца дзіцячай творчасці з Баранавічаў.

Сцэна са спектакля “Гульня інтарэсаў” драматычнага тэатра “Відарыс” Палаца культуры імя Максіма Горкага з Барысава.

Магчымае і немагчымае

Арганізатары зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб фестываль стаўся святам і адначасова своеасаблівай “творчай майстэрняй”, карыснай для ўсіх удзельнікаў. Мінаблвыканкам, яго галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, Бярэзінскі райвыканкам, Мінскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, Бярэзінскі РЦК, дзе адбываюцца ўсе прагляды, — кожны рабіў свой унёсак у агульную справу: ад фінансавання да хатніх страў для членаў журы, якія глядзелі спектакль за спектаклем.

Фестывальная “матэматыка” — гэта шэсць конкурсных тэатральных работ (з Маладзечна, Барысава, Слуцка, Жодзіна і з самога Беразіно) і дзве пазаконкурсныя (са Слуцка і Баранавічаў). Калектывы-ўдзельнікі не проста выступалі і з’язджалі, як гэта часцяком робіцца на прафесійных форумах (дзе сказваецца і занятасць артыстаў, і недахоп “прагонных” грошай), а маглі застацца на ўсе тры дні і паглядзець, што прывезлі іх калегі. Чым не своеасаблівы майстар-клас? Асабліва ў дачыненні да бліскучых пазаконкурсных паказаў, якія задалі настолькі высокую планку, што маглі б скласці канкурэнцыю не толькі ўдзельнікам бярэзінскага творчага спаборніцтва, але і намінантам Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі, якая прайшла літаральна напярэдадні (дарэчы, спачатку яны ўвогуле супадалі, бо тэрміны Нацпрэміі “наклаліся” на даўно заяўленыя даты “…Рампы” — і апошнюю давялося пераносіць, з-за чаго, на жаль, з праграмы выбыў нясвіжскі тэатр).

У бярэзінскага фестывалю склаліся свае традыцыі. У час адкрыцця ўсе ўдзельнікі запальваюць свечы на падсвечніках, а само адкрыццё выдумляе і ладзіць уладальнік Гран-пры пазалеташняга конкурсу (апошні праходзіць біенале — раз у два гады). Сёлета таксама не абышлося без сюрпрызаў. Ужо на ўваходзе гасцей сустракалі сталічныя мімы — з комік-шоу-групы “Доктар Ю.М.О.Р.” Маладзёжнага тэатра эстрады пад кіраўніцтвам Вячаслава Паніна. Але галоўны падарунак быў ад “гранпрыстаў” — народнага тэатра драмы і камедыі “Папарацьквятка” Слуцкага ГДК. Казка пра Курачку Рабу, творча перапрацаваная самімі ўдзельнікамі, выкладалася не толькі ў вершах, але і адметнай тэатральнай мовай — з гумарам, бліскучымі акцёрскімі працамі, з высокай эстэтычнай планкай і глыбока сімвалічным сэнсам, скіраваным на мастацтва і культуру (дыплом “За арыгінальнае ўвасабленне традыцыйнага матэрыялу ў сучаснай форме”).

Як “тапельцы” становяцца “цвікамі”

Вельмі парадаваў Узорны тэатр-студыя “Паралель” Палаца дзіцячай творчасці з Баранавічаў. Спектакль “Чума на абодва вашыя дамы” ўразіў не толькі добрым артыстызмам і маладой энергетыкай (рэжысёр Ларыса Сартакова), але і выразным пластычна-харэаграфічным рашэннем, быццам быў задзейнічаны нейкі дадатковы юнацкі склад вядомага расійскага балета “Тодэс” (дыплом “За прапаганду тэатральнага мастацтва і ўмацаванне творчых сувязяў”). Паглядзеўшы гэты спектакль, многія тэатры павінны былі б задумацца. Бо справа не адно ў моладзі, якая ўмее і любіць танцаваць, але і ў пошуку такога сцэнічнага рашэння, якое зможа натхніць і артыстаў і гледачоў. Міжволі ўзгадаліся апошнія балетныя пастаноўкі нашага Вялікага тэатра — не з замежнай, а з уласнай харэаграфіяй, дзе бліскучыя артысты экстракласа вымушаны марнаваць час на нягеглыя, нічога не гаворачыя экзэрсісы. А тут — усё наадварот: зусім не прафесіяналы, але з цікавымі пастаноўчымі ходамі, выразнымі рухамі, дзе пластыка гаворыць больш за словы.

Шэсць конкурсных спектакляў з Міншчыны былі больш сціплымі, без сінтэзу жанраў, але ў іх таксама можна было заўважыць пошук — найперш, у рэпертуары і тэматыцы. А вось дыплом “За ўдалы творчы эксперымент” не быў прысуджаны нікому: не было ні ўласна эксперыментаў, ні, тым больш, удалых. Затое ў той час, калі сярод прафесійных тэатраў замацавалася тэндэнцыя ставіць касавыя камедыі, каб выканаць ускладзеныя на іх планы, тэатры аматарскія могуць “дазволіць” сабе звяртацца да сацыяльна вострых тэм. Гэта і “Забыць Герастрата” народнага тэатра Бярэзінскага РДК, і “Каралева прыгажосці” народнага тэатра “Метамарфозы” Палаца культуры Маладзечна, а таксама “Не наракай” (паводле п’есы Аляксея Дударава “Вечар”) Тэатра драмы і камедыі імя Уладзіслава Галубка Слуцкага ГДК і “Там наверсе — неба!” (паводле “Памінальнай малітвы”) народнага тэатра ПК “БелАЗ” з Жодзіна. Усе гэтыя п’есы ідуць сёння і ў нашых рэпертуарных тэатрах. Праўда, там яны “патанаюць” у агульнай афішы, у народных жа становяцца “цвіком” праграмы.

Праўда, не ўсё было вырашана дастаткова глыбока, штосьці скатвалася з філасофіі ў побыт. І гэта дадатковы раз сведчыла, як важна “прымерваць” цікавую для рэжысёра п’есу на канкрэтных артыстаў. Так робіць, да прыкладу, рэжысёр Мікалай Пытляк з Беразіно (Гран-пры і дыплом “За лепшае мастацка-вобразнае ўвасабленне спектакля” — тэатру, “За адданасць тэатральнаму мастацтву і шматгадовую творчую працу” — уласна рэжысёру, “За лепшае выкананне мужчынскай ролі” — Аляксею Бабашаву, за выкананне ролі Турэмшчыка — Віталю Шамко). Нават у час фестывалю даводзілася бачыць, як Мікалай Мікалаевіч, заўважыўшы акцёрскую “жылку” ў кімсьці з супрацоўнікаў,

---

Вяртаючыся да надрукаванага

Іншы погляд на Агінскага-3

Аўтар спрэчнай кнігі пра жанры і свайго героя

Я вельмі рад, што мая кніга “1813” выклікала жывое абмеркаванне на старонках газеты “Культура” (№№ 49 — 50). Асабіста я бачу, што непрыняцце кнігі “1813” выклікана ў большасці выпадкаў неразуменнем сутнасці літаратурнага жанру, у якім напісана аповесць. У гэтым тэксце пастараюся патлумачыць мастацкія асаблівасці твора і раскажу, чаму менавіта Міхал Клеафас Агінскі стаў яго галоўным героем.

Наогул, спачатку хацеў бы адзначыць, што, на маю думку, перш чым брацца крытыкаваць пэўны літаратурны тэкст, варта яго спачатку прачытаць цалкам. Меркаванні, пабудаваныя на ўрыўках з інтэрнэта і на водгуках іншых чытачоў, не могуць быць аб’ектыўнымі. Магчыма, каб аўтары адмоўных рэплік, у тым ліку на старонках “К”, прачыталі ўсю аповесць “1813”, а не яе часткі, пэўнага непаразумення ўдалося б пазбегнуць. Безумоўна, з’явіліся б новыя пытанні, але гаворка рушыла б ужо ў кантэксце цэласнага разумення твора. Інакш атрымліваецца, бы з савецкіх часоў выслоўе, якое стала, як зараз модна казаць, мемам: “не чытаў, але асуджаю”.

Яшчэ хачу сказаць, што кніга “1813” — гэта цалкам мастацкі твор з вялікай доляй выдумкі, на навуковае гістарычнае даследаванне я не прэтэндаваў і не прэтэндую. Мяркую, што чытач, які возьме ў рукі “1813”, будзе разумець, што перад ім выдуманая гісторыя, у якой пэўная частка рэальных гістарычных фактаў выкарыстоўваецца для стварэння атмасферы, для пагружэння чытача ў свет пачатку XIX стагоддзя і не больш. Дакладна, ніхто не дадумаецца вывучаць па “1813” біяграфію Міхала Клеафаса Агінскага. Дадам яшчэ, што “1813” — гэта з’ява масавай культуры, а навуковая праца, якой займаюцца супрацоўнікі музея-сядзібы ў Залессі — культура элітарная. Таму ацэньваць “1813” з пункту гледжання адпаведнасці тэкста канонам навуковай дзейнасці абсалютна няслушна.

Дык што ж за жанр такі, згодна з правіламі якога я пісаў “1813”? Кніга пазіцыянуецца выдаўцом як першы зомбі-хорар, напісаны па-беларуску, і я цалкам падтрымліваю такую фармулёўку. Безумоўна, Таццяна Кляшчонак мае рацыю, калі адзначае, што вобразы ажылых мерцвякоў здаўна сустракаюцца ў нашай літаратуры. У беларускіх казках і паданнях поўна такіх герояў, што вяртаюцца ў свет жывых пасля смерці. Але той вобраз паўсталых мерцвякоў-зомбі, які я выкарыстоўваю ў кнізе — гэта з’ява цалкам сучасная. Цяперашні вобраз зомбі сфармаваўся ў другой палове XX стагоддзя, развіваецца ён і цяпер. Само слова “зомбі” пазычана з гаіцянскіх магічных практык вуду, але ў свеце масавай культуры зомбі ўсё радзей звязваюцца з магіяй. У мадэрновым свеце і прычыны замбавання таксама мадэрновыя, у большасці выпадкаў да паўстання памерлых прыводзяць мутаваныя вірусы, выробленыя ў сакрэтных лабараторыях. У шырокім сэнсе зомбі-зараза з фільмаў і гульняў гэта разнавіднасць пандэміі — масавай хваробы, што перадаецца ад чалавека да чалавека. І калі ў рэальным свеце хворыя паміраюць ад грыпа-іспанкі ці тыфу, то ў выдуманым свеце зомбі-вірусаў яны падчас захворвання ператвараюцца ў пачвар. Акрамя таго, у казках мерцвякі маглі размаўляць з жывымі, валодалі розумам і самаўсведамленнем, іх можна было залагодзіць ці падмануць. Мадэрновыя зомбі — гэта па сутнасці біяробаты, бяздумныя і бязглуздыя, у якіх захавалася толькі дзве функцыі: хадзіць і есці. Менавіта такімі хадзячымі мерцвякамі запоўнены папулярныя фільмы, серыялы, камп’ютарныя гульні і кнігі пра зомбі. Такімі ж я паказаў і паўсталых французскіх жаўнераў у сваёй кнізе.

Яшчэ адзін жанр масавай культуры сучаснасці, на які я абапіраўся пры стварэнні “1813”, — гэта мэшап (ад англійскага “mashup” — мяшанка). Ён увогуле з’ява XXI стагоддзя. Кніга, якую лічаць першым узорам жанра, з’явілася ў 2009 годзе. Амерыканскі пісьменнік Сэт Грэм-Сміт узяў за аснову класічны раман Джэйн Остэн “Пыха і перадузятасць” і дадаў у яго сцэны змагання галоўных герояў з зомбі. Кніга “Пыха і перадузятасць і зомбі” мела вялікі поспех і нядаўна была экранізавана. Той жа аўтар праз год напісаў яшчэ адзін вядомы раман у жанры мэшап — “Аўраам Лінкальн: паляўнічы на вампіраў”. Згодна з сюжэтам кнігі, шаснаццаты прэзідэнт ЗША вёў двайное жыццё і прыхавана змагаўся з таемнай арганізацыяй вампіраў, якая мела на мэце падпарадкаваць Злучаныя Штаты. Сэт Грэм-Сміт апісвае рэальныя гістарычныя падзеі (напрыклад, грамадзянскую вайну 1861 — 1865 гадоў) і факты біяграфіі Лінкальна з пункту гледжання гэтай барацьбы з вампірамі. Аўраам Лінкальн постаць сусветнага маштабу, яго біяграфію вывучаюць у амерыканскіх школах, а пра яго лёс і змаганне з рабствам зняты не адзін дзясятак фільмаў. Тым не менш, творчае пераасэнсаванне дзейнасці знакамітага прэзідэнта ЗША, рэалізаванае пісьменнікам у межах жанра мэшап, не выклікала абурэння ў грамадстве. Кніга “Аўраам Лінкальн: паляўнічы на вампіраў” атрымалася ўдалай і была цёпла прынята чытачамі. Увогуле, удзел рэальнай гістарычнай асобы ў творы масавай культуры моцна падагрэў цікавасць да постаці Лінкальна, услед за забаўляльнымі кніжкамі чытачы

пачынаў заахвочваць таго стаць удзельнікам тэатральнага калектыву. І адразу прапаноўваў магчымую ролю. Абсалютна дакладным "трапляннем" у вобразы вылучаўся згаданы жодзінскі спектакль на балючую яўрэйскую тэму (дыплом лаўрэата першай ступені — тэатру, "За лепшую рэжысёрскую працу" і "Лепшае выкананне жаночай ролі" — Наталлі Радзівонавай, за выкананне ролі Тэўе — Канстанціну Міхайлаву, ролі Менахема — Максіму Маслоўскаму, ролі Сцяпана — Дзмітрыю Бондару).

Ці ёсць лідары на заўтра?

У адрозненні ад мінулых фестываляў, у цяперашнім удзельнічала шмат артыстаў-мужчын. Нават куды больш, чым жанчын! І гэта пры тым, што хлопцаў традыцыйна не стае і ў навучальных установах, і ў тэатрах, асабліва рэгіянальных, дзе рэжысёрам часам даводзіцца "перапісваць" некаторыя мужчынскія ролі на жаночыя. Адкуль такая прага? Улічваючы, што ў закуліссі сустракала некаторых былых выхаванцаў Акадэміі мастацтваў, выкажу меркаванне: мужчын становіцца болей, магчыма, яшчэ і таму, што некаторыя прафесійныя акцёры вымушаны сыходзіць з прафесіі ў пошуках больш аплочваемай працы, а любоў да тэатра і жаданне рэалізаваць сябе прыводзіць іх у народныя тэатры. Хаця… у кожнага — свой разлік, свае прычыны і свой творчы лёс. Але як многа залежыць ад рэжысёра! Бо многія прыходзяць у калектывы, запаліўшыся творчым агеньчыкам і ўласна асобай кіраўніка, побач з якім пачынаеш глядзець на свет іншымі вачыма.

А між тым, гэта застаецца на сёння самай, бадай, асноўнай праблемай аматарскіх тэатральных калектываў. Ёсць лідар — ёсць усё. А калі няма? Сярод рэжысёраў былі прадстаўнікі старэйшага і сярэдняга пакаленняў. А дзе творчая моладзь, якую штогод выпускае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў? Дзе тыя маладыя рэжысёры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якія любяць скардзіцца на адсутнасць магчымасці рэалізаваць свае творчыя памкненні? Канешне, у народных калектываў — свае асаблівасці, іншы "акцёрскі" кантынгент. Але даволі часта менавіта пэўныя абмежаванні стымулююць творчую фантазію, штурхаюць да эксперыментатарства, вымушаюць шукаць іншыя пастаноўчыя рашэнні.

Паглядзім на гэту праблему і з іншага боку. Ці ўсе кіраўнікі аматарскіх калектываў гатовыя даверыць моладзі калі не ўвесь тэатр адразу, дык хаця б нейкую пастаноўку — у якасці гэткага эксперыменту, дыпломнай працы ці чагосьці падобнага? Справа ж не толькі ў грошах: якімі б важнымі ні былі матэрыяльныя рэчы і дабрабыт, не перавяліся яшчэ ў нас людзі, аддадзеныя тэатральнай справе. Якія хочуць не толькі іграць, але і ставіць!

Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова было зірнуць, з якой любоўю і фантазіяй былі афармлены некаторыя спектаклі. Дыпломамі II ступені і "За лепшую сцэнаграфію" быў адзначаны Заслужаны аматарскі калектыў драматычны тэатр "Відарыс" Палаца культуры імя Максіма Горкага з Барысава. Узяўшыся за "камедыю на мяжы фарса" Хасінта Бенавентэ-і-Марцінэса "Гульня інтарэсаў", рэжысёр Ігар Куніцкі заінтрыгаваў сапраўды тэатральнай мовай разнастайных сцэнічных пераўвасабленняў. Звычайны металічны разнос ператвараўся і ў люстэрка, і ў акенца. Мыліца — у мікрафон. Габляваная дошка — то ў стол, то ў арэлі. Галоўны ж элемент сцэнаграфіі — шафа (у перакуленым выглядзе — куфэрак) пабывала "ў ролі" і лавы, і ложка, і барнай стойкі, і ванны, і, вядома, варотаў. А якія сцэнічныя строі пашыла адна з удзельніц калектыву — Людміла Гудзіліна, адзначаная таксама "За лепшае выкананне эпізадычнай ролі"!

Але ж былі, на жаль, і супрацьлеглыя прыклады, калі рэжысёр, не прыкладаючы асаблівых намаганняў, узвальваў на артыстаў адно тэкст, складаны ў трапным данясенні нават для прафесіяналаў. Ці вымушаў удзельнікаў рабіць тое, да чаго яны ніяк не схільныя, з-за чаго нам, гледачам, станавілася няёмка: навошта такая "пародыя"! Ці калі тая ж аконная рама, выстаўленая ў якасці адной з цэнтральных сцэнаграфічных дэталяў, ніяк не "працавала". Ці калі абіралася папросту "не самая лепшая" сучасная расійская камедыя, да якой так і не быў знойдзены рэжысёрскі "ключык".

■■■

Журы было, як нідзе і ніколі, лагодным, добразычлівым. Яго ўзначальвалі заслужаны артыст краіны, дэкан тэатральнага факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, прафесар Уладзімір Мішчанчук і, у якасці сустаршыні, народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч — сама дабрыня і зачараванасць. Каштоўныя падарункі атрымалі ўсе калектывы-ўдзельнікі: журы імкнулася падтрымаць кожнае выяўленне творчай іскрынкі. Але невыпадкова ў паветры лунала пытанне: можа, зрабіць гэты фестываль не абласным, а адкрытым? Каб калектывы Міншчыны адчулі годную альтэрнатыву і пачалі імкнуцца да яшчэ больш высокіх мастацкіх мэтаў.

К

сталі звяртацца і да сур'ёзных гістарычных прац пра гэтага палітыка.

Такім чынам, я не бачу нічога дрэннага ў тым, каб героем падобнай гістарычна-фантастычнай "мяшанкі" мог стаць наш знакаміты зямляк — Міхал Клеафас Агінскі. Спадарыня Таццяна піша, што я надаю Агінскаму неўласцівыя яго асобе рысы і функцыі. З гэтым я пагадзіцца не магу. Варта ўзгадаць, што Міхал Клеафас быў не толькі палітыкам ці кампазітарам — граф кіраваў атрадам інсургентаў, ведаў, як абыходзіцца са зброяй і прымяняў яе ў бітвах "касцюшкоўцаў" з царскімі войскамі. Менавіта на такі вобраз я абапіраўся, калі вырашыў выбраць Агінскага ў якасці галоўнага героя свайго твора. Міхалу Клеафасу даводзілася змагацца за сваю Радзіму са зброяй у руках, і ў маёй кнізе ён робіць гэта паўторна, няхай і пры выдуманых абставінах. Таццяна Кляшчонак называе местачковым патрыятызмам тое, што месцам дзеяння кнігі я абраў Маладзечна. Але ў чым тут мая віна, я не разумею. Лёс Міхала Клеафаса Агінскага звязаны і з нашым горадам, прадстаўнікі роду мелі тут маёмасць, у сучасным Маладзечне ёсць вуліца Агінскага, у гонар кампазітара названы музычны каледж, каля яго — помнік славутаму земляку. Па меркаванні майго апанента гэта ўсё таксама праявы местачковага патрыятызму?

Калі я абдумваў напісанне кнігі, вырашыў, па-першае, месцам дзеяння абраць родныя для мяне мясціны. Падругое, выкарыстаць падзеі вайны 1812 года як прычыну з'яўлення на Маладзечаншчыне хадзячых мерцвякоў. У наваколлях горада, як сведчаць гісторыкі, узімку 1812-га засталося шмат непахаваных жаўнераў, што загінулі ў адной з апошніх бітваў той вайны. Па-трэцяе, узяць у якасці героя якога-небудзь слыннага земляка, які пасаваў бы па гістарычным перыядзе і меў досвед удзелу ў баявых дзеяннях. Сталася так, што ніхто іншы акрамя Міхала Клеафаса Агінскага на гэтую ролю не падышоў. Безумоўна, давялося прыдумаць прычыну, чаму граф з'явіўся ў Маладзечне ў 1813 годзе, а не ў 1814, як гэта было ў рэальнай гісторыі, трохі "перапісаць мінулае", каб дадаць жывасці персанажу. Але "1813" на тое і мастацкі твор, што дае аўтару пэўную свабоду фантазіі.

Не магу сцвярджаць, што мая кніга будзе спрыяць папулярызацыі спадчыны Міхала Клеафаса Агінскага. Але добра будзе, калі хаця б адзін з сотні чытачоў зацікавіцца рэальнай гісторыяй кампазітара, прачытае яго біяграфію ці наведае музей у Залессі. Калі гэты чалавек стане наведвальнікам сядзібы-музея, няхай і з дурацкімі пытаннямі пра зомбі, якіх апасаецца спадарыня Таццяна Кляшчонак, ці дрэнна гэта для музея? Няўжо павелічэнне колькасці турыстаў хаця б на аднаго ці на дваіх — гэта тое, чаго асцерагаюцца навуковыя супрацоўнікі музейнай установы? Мяркую, усё ж не. А можа, гэта будзе якраз той чалавек, які набудзе кнігу пра дзяцінства Міхала Клеафаса, якую ў хуткім часе, спадзяюся, выдасць спадарыня Таццяна?

Уладзімір САДОЎСКІ,
краязнаўца

Ад рэдакцыі. Гэтай публікацыяй "К" завяршае палеміку пра кнігу "1813", даўшы слова і аўтару, і яго апанентам. Такім чынам, газета выканала сваю ролю дыскусійнай пляцоўкі, не ператварыўшы пры гэтым абмеркаванне ў перакідванне абвінавачваннямі і захаваўшы ўзровень палемічнасці. Дзякуем усім удзельнікам сумоўя за актыўную пазіцыю ў дачыненні да абмеркавання праяў культурнага працэсу!

Дыскусійна

Сысці з абцасаў, каб агучыць цішыню

Беларускія падмосткі даволі часта адорваюць гледача прывабным жаночым целам. Спакусліва аголенымі часткамі цела ўпрыгожваюць мізансцэны, пышнымі дэкальтэ аздабляюць афішы, прыгажунямі ў паўпразрыстых строях рамантызуюць гарачыя гісторыі кахання. Аднак ад мастацтва новага стагоддзя чакаюць не толькі пікантнай карцінкі. Ці атрымаецца ў айчыннага тэатра сысці ад клішэ і ўзняцца на наступную прыступку разумення сексуальнасці, калі цела ўспрымаецца не дадаткам, а адным з узроўняў пазнання чалавечай сутнасці?

Настасся ПАНКРАТАВА

У айчыннай тэатральнай прасторы раз-пораз узнікаюць праекты на вострыя тэмы, пра якія ў грамадстве прынята гаварыць паўшэптам. Напрыклад, эпатажная п'еса Іў Энцлер "Маналогі вагіны", што грукацела па ўсім свеце, не мінула і Беларусь. Некалькі гадоў таму за тэму супраціву сораму, які зведваюць многія жанчыны ў дачыненні да свайго цела і сваёй сексуальнасці, узнімалі рэжысёры Крысціна Вязаўская і Святлана Сугака. Далучыцца да абмеркавання выбуховай п'есы змаглі гледачы ў Мінску і Гродна.

Прафесійны тэатр таксама не стаіць у баку ад наспелых тэм, якія рэдка агучваюць на грамаду. Аляксандр Марчанка прывёў на сцэну Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі ў тым ліку і дакументальныя гісторыі пра жах хатняга гвалту. Увогуле, спектакль "Мабыць?" па п'есе Дзмітрыя Багаслаўскага стаў сапраўдным канцэнтратам няўтульных для грамадскасці тэм і ўжо два гады правакуе сваіх гледачоў на шматгадзінныя размовы пасля заканчэння дзеяння.

Званне самай скандальнай пастаноўкі сезону, цэнтральнай тэмай якой стала цела і сексуальнае жыццё сучаснай жанчыны, атрымаў спектакль "Камера, якую дала мне маці" — сумесны праект "HomoCosmos" і Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў. Ці можна казаць, што пастаноўка Кацярыны Саладуха і Дарыюша Язерскага раптам ускрыла для беларусаў табуяваныя тэмы? Хутчэй, яна стала адной з праяў вялікай размовы новага пакалення тэатральных дзеячаў са сваёй публікай, што чакае шчырых разважанняў пра набалелае.

Нячастыя тэатральныя пошукі чалавечай сутнасці праз асабістае цела вызначалі чаканую праблему: калі рэдка ўголас размаўляць пра пэўныя рэчы (ці часткі цела), то цяжка падабраць разнастайную лексіку для яе вызначэння. Прынамсі, арт-крытык, рэжысёр Таццяна Арцімовіч падчас грамадскай дыскусіі зазначыла, што ў беларускім перакладзе прозы амерыканскай пісьменніцы Сюзанны Кейсан (менавіта яе кніга стала літаратурнай асновай спектакля "Камера, якую дала мне маці") не знайшлося аналагаў слову "вагіна". "У беларускім спектаклі гучаць толькі два словы, але і яны дастаткова паэтызаваныя, таму нівеліруюць фізіялагічнасць тэксту, што ў сваю чаргу здымае напружанне гісторыі. Я бачыла постар да польскай версіі дадзенага спектакля: афіша запоўнена мноствам сінонімаў! Калі лепш папрацаваць над беларускай лексікай, эфект тэксту быў бы бліжэйшым да яго мэтаў і задач", — упэўнена прамоўца.

Мне ж здаецца, адным найноўшым тэзаўрусам сучаснай беларускай мовы праблема, як данесці кантэкст да мэтавай аўдыторыі, не вырашыцца. Справа не толькі ў тым, які тэкст казаць, але і знайсці таго, хто гэты тэкст будзе гатовы прамовіць. Ці гэта не было адной з прычын, чаму вышэйзгаданую п'есу Іў Энцлер адважыліся сыграць не прафесійныя акцёры, а аматары? Красамоўны і той факт, што на кастынг да спадара Язерскага прыйшлі актрысы, якія яшчэ не размянялі чатырох дзясяткаў гадоў. Рэжысёр разглядаў верагоднасць укласці тэкст у вусны ўзроставага персанажа, аднак… "Упэўнены, сталыя актрысы бачылі маю заяўку, але не адгукнуліся, бо раз — няёмка, два — соромна, тры — няма звычкі да такіх тэкстаў", — падсумоўвае пастаноўшчык.

Цікава, што працуючы над правакацыйным матэрыялам, пастановачнай групе ўсё ж цяжка выйсці з палону стандартнага ўспрымання гендарных роляў. Можна вынайсці неадназначны тэкст, аднак не-не ды і "павыскоквае" шаблонны візуальны шэраг. Прынамсі, даследчыца гендару і візуальнай культуры Таццяна Сяцко адзначыла: "У разуменні грамадства жанчына, каб атрымаць права казаць і быць пачутай, павінна пэўным чынам выглядаць. Таму актрыс праз адну зацягваюць у дэкальтэ і ставяць на абцасы. Але справа не толькі ў тым, каб прыбраць гэтыя атрыбуты. Галоўнае — крытычна да іх ставіцца".

Вострасацыяльны праект заўсёды рызыкуе патрапіць у пастку незадавальнення публікі. Для адных тэатр з аголеным нервам — занадта дзёрзкае відовішча. Такім гледачам хочацца схавацца ад празмерна адкрытых тэм, таму яны сыходзяць з залы, не чакаючы фіналу. Другой палове мала пачуць свае думкі са сцэны, ім не хапае рэальнага выніку ад зладжанай пастаноўкі. Грамадская дыскусія, на якой я прысутнічала, пайшла менавіта ў другім ключы. Аўтарам нагадвалі, што жаночая фізіялогія не так скрытая ў нашым кантэксце, як падаецца. Яе шмат у рэкламе, жаночых часопісах, у гэткім жа градусе яна абмяркоўваецца на шматлікіх форумах. Прамоўцам хацелася пабачыць хваробу галоўнай гераіні не ў якасці фізіялагічнай праблемы, а як сацыяльна-культурную інтэрпрэтацыю жаночага лёсу. Прынамсі, Таццяна Арцімовіч чакала пачуць маніфест сексуальнасці: "Бо ў нашым грамадстве права на секс мае толькі мужчына. Жанчыне дазваляецца ім займацца ў кантэксце сталых партнёрскіх зносін, інакш яна адразу залічваецца ў катэгорыю дам дрэнных паводзін".

Па меркаванні Таццяны Сяцко, выключна ў рамках тэатра гэтую тэму ўздымаць нельга. Яна разглядае сучасную пастаноўку ў якасці інструмента для сацыяльных змяненняў: "Проста прыносіць на падмосткі слова "вагіна" — гэта нецікава, банальна, ды і гадоў на пяцьдзясят позна. Важна агучваць праблематыку. Зрабіць пастаноўку, каб расказаць біялагічныя факты? У 2016 годзе мне гэтага мала! Пра малочніцу кожны дзень можна прачытаць у рэкламе ў вагоне метро. Гэта вельмі даўно не здзіўляе. Можна працягваць збірацца вузкім колам і хваліць, які смелы калектыў, што пускае на сваю сцэну такія пастаноўкі. Для мяне ж гэта не смела і абыдзённа. Мне не хапае крытычнай пазіцыі. Для мяне важна было б узняць тэму хатняга гвалту, шлюбнага абавязку. Ці часта абмяркоўваецца тэма нежаданага сексу ў партнёрстве? Ад сучаснага тэатра чакаеш, што аўтарская каманда не толькі тэкст перакажа, а выкажа сваю пазіцыю".

Аднак ці можна патрабаваць ад рэжысёра спраўджвання сваіх асабістых спадзяванняў? Ды ці значыцца ў галоўных задачах тэатра быць сцягам, каб весці за сабой натоўп? Здаецца, не трэба ставіць у абавязак кожнаму тэатральнаму калектыву шакіраваць гледача. Польскі рэжысёр згадаў шэраг скандальных пастановак у сваёй краіне, на якіх зала напалову пусцела яшчэ да сярэдзіны дзеяння: "Спектаклі-маніфесты маюць права на існаванне, але я не хачу займацца такімі пастаноўкамі. Павінны заставацца калектывы, якія працуюць у буфернай зоне. Я рабіў відовішча для звычайнага, удумлівага гледача, правёў шмат работы, чытаў гінекалагічныя працы, навуковыя тэксты пра сексуальныя неўрозы. Здавён моцная палова чалавецтва адмахвалася ад жаночых праблем, спісваючы ўсё на "істэрыку". Мне хацелася данесці да мужчын рэчы, якія для іх гучаць быццам дзікунства: малочніца, грыбкі, эстрагены… І я бачу вынік: пасля прэм'еры аналагічнага спектакля ў Польшчы ў зале разгортвалася шмат дыскусій!

Заканчэнне — на старонцы 11.

“Песняры” без эквівокаў

Амаль вечны ансамбль у зменлівым свеце

“Песняры”: падчас сустрэчы і рэпетыцыі. / Фота Аліны САЎЧАНКА

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

— Былы мастацкі кіраўнік БДА “Песняры” Вячаслаў Шарапаў, кажучы пра тое, што ансамблю ўдалося захаваць гледача, таго, каму за 40, чарговай задачай ставіў заваяванне маладога слухача. Мэта такая засталася?

Р.К.: — Вядома. У гэтым сэнсе мы арыентуемся на інтэлектуальную моладзь, якая цікавіцца беларускай мовай, літаратурай, культурай, гісторыяй. У новай праграме шмат песень на вершы паэтаў XIX стагоддзя, і не пра ўсіх іх шырока вядома. Невядома яшчэ і з той прычыны, што вершы іх напісаныя пад псеўданімамі, за якімі хаваліся класікі. Сёння мы ў чымсьці паўтараем шлях “Песняроў” Мулявіна, калі ад ансамбля стадыённага той калектыў перайшоў да выканання рок-опер, музычных спектакляў, выкарыстоўваючы ў тым ліку беларускую паэтычную спадчыну. І творы тыя таксама не былі разлічаны на шырокую аўдыторыю, яны прызначаліся якраз публіцы падрыхтаванай, свядомай.

— Але, набыўшы такую публіку, ансамбль усё ж вярнуўся да выканання эстрадных шлягераў ды апрацовак народных песень, да таго, чым быў папулярны ў мас, бо вялікія формы асаблівым попытам не карысталіся...

Р.К.: — А нам няма чаго ды няма каго губляць. Мы не хочам быць толькі захавальнікамі творчага музея. Так, гэта адна з задач, але не больш. “Песняры” — прафесійная школа і для вакалістаў, і для інструменталістаў, і для аўтараў песень, і для аранжыроўшчыкаў, ды шмат для каго яшчэ. І школа чалавечага сужыцця. Мы ўсе людзі маладыя, нам цікава і далей працягваць “песняроўскую” культуру, і прыдумляць сваё. Традыцыя не ў капіяванні, а ў дачыненні да мінулага, у яго развіцці і нават у кардынальным адыходзе ад яго. Ды і не працуюць копіі пад “Вологду”, пад “Каляду”, пад “Касіў Ясь канюшыну” — мы ў тым неаднаразова пераконваліся. А “арыгінальны” “Паланэз Агінскага” стрэліў, ён рэальна ўвайшоў у “залаты” фонд “Песняроў” і тых, і наогул.

— Дзве вашы апошнія пласцінкі — “Прысвячэнне Майстру...”, “Хмель малады” — ашаламляльна адрозніваюцца адна ад другой. Першая — гэта новыя песні, беларуская мова, асучаснены, мо і спрэчны, але — “песняроўскі” дух, другая змяшчае перапевы савецкіх шлягераў і алюзіі на іх...

Р.К.: — Канцэпцыя заключалася ў тым, каб зафіксаваць на аўдыяносьбіце рэчы, якія выконвалі толькі на канцэртах, і тыя, якія, назапашваючыся, за сцены студыі не выходзілі. Сапраўды, гэта і кампазіцыі з налётам настальгічнасці, чаго ад нас заўсёды чакае публіка, і тое, чаго многія не чулі. Так было вырашана зрабіць. Калі вы спытаеце пра маю пазіцыю, я — за рух наперад, без кампрамісаў, без эквівокаў у той бок. Іх у найноўшай гісторыі “Песняроў” было дастаткова, свой абавязак, калі ён быў, ансамбль таму пакаленню ўжо аддаў, зараз мы павінны ў першую чаргу спяваць для свайго і тых, хто маладзейшы за нас. І нам хочацца гэта рабіць, мы ўмеем гэта рабіць. Няхай у кожнага пакалення слухачоў будуць уласныя “Песняры” са сваім музычным ухілам — у памяці, у запісах, у паказах па тэлебачанні, на канцэртах.

— Што вас здзіўляе ў айчыннай культуры — у станоўчым ці адмоўным сэнсе?

Р.К.: — Дамы культуры, у асноўным, знаходзяцца ў добрым стане, адрамантаваныя, прыстасаваныя для канцэртаў залы. Ёсць даволі добрая апаратура, не пабітая, не лом які-небудзь. Людзі на месцах працуюць, энтузіястаў хапае, а значыць, творчасць жывая. Дзіцячая наогул знаходзіцца на досыць высокім узроўні, шмат дзяцей прыстойна спяваюць, танчаць. А вось калі яны пераходзяць у падлеткавы ўзрост, становіцца горш: перш за ўсё праз тое, што гэты сегмент мала задзейнічаны. Дзяржаве трэба звярнуць увагу на 12-17-гадовых — як і далей развіваць іх таленты, у якое правільнае рэчышча накіроўваць здольнасці.

Праблемы і зноў яны

— “Цякучка” кадраў — гэта праблема для ансамбля, калі людзі сыходзяць з “Песняроў”, прапрацаваўшы ў ім тры-чатыры гады, а то і менш? Праўда, на вольным хлебе яны не становяцца, скажам, вядомымі сольнымі выканаўцамі...

Р.К.: — Нейкая “цякучка”, вядома, замінае, пытанне гэтае для нас балючае. Напэўна, такія людзі падманваюцца ў сваіх чаканнях, разлічваючы, магчыма, на іншыя заробкі, на тое, што яны неяк па-іншаму маглі б тут творча рэалізавацца. Па-першае, “Песняры” велізарных грошай не атрымліваюць...

А.М.: — ...па-другое, завышаная самаацэнка некаторым служыць благую службу. Лёгка ацэньваць сябе, свой талент, свае магчымасці знутры, але погляд звонку часцяком больш аб’ектыўны. Калі гэтыя два бакі ўступаюць паміж сабой у канфлікт, то разумны чалавек, не спяшаючыся, разбярэцца і з уласнымі амбіцыямі, і з меркаваннем навакольных. І прыйдзе да нейкага агульнага, для ўсіх прымальнага назоўніка. Крытык назаве такую пазіцыю канфармізмам, я ж называю яе мудрасцю. Вы мне запярэчыце, а як жа геніі, якія нярэдка ішлі супраць плыні? Пакуль “Песняры” нарадзілі толькі аднаго такога чалавека. А нягеніі збівалі занадта высока задраныя планкі: амаль ніхто з тых, хто сышоў з ансамбля за апошнія гадоў дзесяць, як вы дакладна заўважылі, на сцэне пра сябе на поўны голас не заявіў.

Р.К.: — Мы — ансамбль камандны, ансамбль залатой сярэдзіны. Зыходзячы з гэтага, музыканты ў яго і падбіраюцца, папярэдне “прамацваюцца” на ўменне працаваць калектыўна. Але часам індывідуальнае ў чалавеку, якое, натуральна, уласцівае любому, пачынае браць верх над агульным. Нехта, як сказаў Артур, своечасова сябе таймуе, іншы ж сыходзіць.

— Кіт Рычардс з гурта “Rolling Stones” у сваёй кнізе-біяграфіі “Жыццё” адну з канфліктных сітуацый з Мікам Джагерам пазначыў абрэвіятурай ССВ, што расшыфроўваецца як “сіндром сола-вакаліста”. Гэта значыць, “Песнярам” вядомы такі сіндром?..

А.Ж.: — Ці трэба з намі, вакалістамі, змагацца?.. Для мяне ССВ ніколі не быў характэрны, я ведаю, на што здольны. Самае галоўнае, каб вакаліст не падхапіў “озвезденелость”: маўляў, ён ужо “зорка”, а ўсе іншыя пайшлі ў або на... Калі хтосьці трапляе ў наш калектыў, то ён становіцца такім жа шараговым, як іншыя — есць “Ролтан” з той жа творчай талеркі, што і яго калегі па ансамблі.

Аляксандр ЖЫХ (духавыя, вакал): — Мяне таксама Бог мілаваў ад гэтай хваробы, ды я і больш інструменталіст, чым спявак.

А.М.: — А мне з ёй на пачатковым этапе даводзілася змагацца, я душыў у сабе жаданне быць на паўкрока наперадзе ў параўнанні з астатнімі. І прыдушыў, здаецца.

Р.К.: — Калі ў ансамблі нехта пачынае празмерна захапляцца пафасам, мы стараемся адразу ж спыняць такія моманты. І тут ужо ад чалавека залежыць, успрыме ён крытыку ці не. З іншага боку, у “Песнярах” ніхто не заціскае ініцыятыву, усе ідэі абмяркоўваюцца, разглядаюцца да рэалізацыі. У рэшце рэшт, у кожнага з членаў ансамбля ёсць свае іншыя музычныя прыхільнасці, але ўсе прапускаюць такія ўплывы праз сябе. Часам на падобнай глебе, у сукупнасці з аўтарскай творчасцю “Песняроў”, нараджаецца цікавы сімбіёз, калектыўны, адзначу. Хочацца верыць, што цяперашні склад, касцяк, будзе доўга нязменным. У гэтым годзе ў ансамбль уліліся Мікалай Потрусаў, Ігар Дударчык — музыканты таленавітыя, самабытныя, спадзяюся, “новая кроў” пойдзе нам толькі на карысць.

— Калі набраць у “пошукавіку” запыт “Беларускі дзяржаўны ансамбль “Песняры” — у розных яго варыяцыях, дык пасля спасылак на нейкую афіцыйную інфармацыю наступнымі па папулярнасці ідуць адрасы старонак, якія змяшчаюць публікацыі на тэмы скандалаў у сувязі з барацьбой за брэнд ансамбля. І ўжо потым — спасылкі на музыку ансамбля...

Р.К.: — На жаль, гэта так. Барацьба за легітымнасць адабрала вельмі шмат часу...

— Вы не практыкуеце і навінавыя рассылкі, сайт ансамбля абнаўляецца вельмі нерэгулярна. “Песнярам” нецікава працаваць з прэсай?

Р.К.: — У “Фэйсбуку” ды “уКантакце” мы літаральна кожны дзень выкладваем свежую інфармацыю! Па астатнім — згодзен. На жаль, не хапае часу. У структуры ансамбля ўжо няма людзей, якія гэтым займаюцца: аптымізацыя закранула і нас. (Добра, што стаўкі артыстаў захавалі.) Але ёсць ідэя перарабіць сайт так, каб працэс яго насычэння не быў доўгім.

А вось калі б…

— Пра эквікі. З Полам МакКартні сёння сыгралі б, прафесійны ўзровень дазволіў бы?

А.Ж.: — Яго або наш?.. Вядома, сыгралі б.

Р.К.: — Была такая ідэя... — сыграць з Карласам Сантанам. У нас ёсць песня “Лясное возера”, яна яму пасавала б. І я зайшоў на яго сайт, паглядзеў, колькі каштуе запісаць з ім сумесную песню. 250 тысяч долараў. Нам на гэты праект грант не далі б…

— А каб вырашыліся вы аднавіць буйную форму, далі б?

Р.К.: — На гэта быў бы сэнс пайсці, каб акцыя мела шырокі рэзананс, пракат. А зрабіць нешта такое дзеля таго, каб проста зрабіць сабе прыемнае, панастальгаваць... Лепш ісці далей з новым.

— Летам-восенню гурт “Стары Ольса” праехаўся з канцэртамі па ЗША. У сувязі з яго турам згадвалі і даўнюю паездку па Злучаных Штатах “Песняроў”. Цяперашняму складу магчыма нешта падобнае паўтарыць?

Р.К.: — Масты на гэты конт не наводзілі. Напэўна, эмігрантам было б больш прыемна убачыць Барткевіча або Кашапарава.

— “...Ольса” ў Амерыцы, у асноўным, выступаў на фестывалях...

Р.К.: — На іх — так, паспрабаваць можна. Як нікому невядомаму калектыву.

— Калі “Стары Ольса” не пабаіцца канкурэнта-земляка, дык звязаліся б з гуртом — яны ж зноў мяркуюць махнуць за акіян...

Р.К.: — Выдатная каманда. Як і “Троіца” — непараўнальнае трыа, якое падымае абсалютна іншы народны пласт, чым мы, выконвае аўтэнтыку зусім інакш, чым “Песняры”. На жаль, мы не знаёмыя з удзельнікамі гурта. Я, дарэчы, некалькі разоў імкнуўся запрасіць музыкантаў (але не Кірчука) паіграць з намі, нешта запісаць разам.

— А чаго Івана Іванавіча “ў ігнор”?

Р.К.: — Ну, Кірчук — глыба! Для мяне ён — іншая творчая вагавая катэгорыя, адзінка самадастатковая, са сваёй музыкай.

— У наступным годзе вы будзеце выпускаць новы альбом. Да краўдфандынгу не думаеце звярнуцца?

Р.К.: — Сур’ёзна мы пра гэта не задумваліся. У нас ёсць сталая праца, стабільны заробак, хай і пакідае жадаць большага, ёсць студыя, апаратура, абсталяванне. Нам па вялікім рахунку грэх на нешта скардзіцца, каб выходзіць да слухача з працягнутай рукой. Мы б з задавальненнем папрацавалі на якой-небудзь знакамітай заходняй студыі, на “Эбі Роад”, скажам.

— Шэраг навучальных устаноў краіны з’яўляюцца і велізарным сховішчам аўтэнтычнага музычнага матэрыялу, сабранага этна-экспедыцыямі ў розных кутках краіны. Вялікая яго частка дагэтуль “на лічбу” не перанесеная, плёнка псуецца, матэрыял знікае...

Р.К.: — Мы былі б шчаслівыя выкарыстоўваць гэтае багацце ў сваёй працы. Абавязкова будзем усталёўваць кантакты.

“Кухня”. Новы-стары сезон

— Вы ж таксама выконваеце план платных паслуг? Наогул, цікавыя вашы гаспадарчыя ўзаемаадносіны з дзяржавай.

Р.К.: — Мы павінны даць пэўную колькасць канцэртаў у год. План, як правіла, перавыконваем. “За што” лік мерапрыемстваў нам павялічваюць. Але неяк з планам не справіліся, і тады колькасць выступленняў на наступны год нам знізілі...

За кошт атрыманых даходаў ансамбль жыве, выплачвае зарплату, прэміі. Дзяржава калектыў субсідуе, вылучаючы сродкі для аплаты часткі камунальных паслуг, на арэнду памяшканняў, на набыццё інструментаў, але і ставіць перад намі задачу, каб “Песняры” сваімі сіламі максімальна пагашалі датацыі, таму за тыя ж камуналку, арэнду, інструменты і мы самі даплачваем з заробленага. Грантамі мы не карыстаемся і фактычна ўсю апаратуру ды інструменты купляем за свой кошт. Між іншым, не абнаўлялі іх ужо даўно, і пытанне гэта цяпер стаіць перад намі востра.

— Ад ідэі стаць гасразліковым суб’ектам вы адмовіліся?

Р.К.: — Мы апроч сваёй, уласна, творчай задачы — складаць ды запісваць песні, дарыць іх людзям, з прычыны свайго дзяржаўнага статусу выконваем і ідэалагічныя функцыі, і агульнакультурныя. Кажучы высокімі словамі — прапагандуем Беларусь

і ўнутры краіны, і за яе межамі: песнямі, людзьмі, якія іх напісалі. Мы гэтым ганарымся, нам гэта па-добраму прыемна. Сыходзячы на гаспадарчы разлік, "Песняры" пазбавіліся б гэтага статусу, перайшоўшы ў іншую юрыдычную плоскасць, страцілі б свайго заснавальніка — Міністэрства культуры. Што гэта азначае? Што зноў пачалася б катавасія з пераафармленнем дакументаў, з наданнем ансамблю іншага становішча. Усё гэта не проста адняло б час, а адбілася б на творчасці калектыву ў выглядзе прастою ў працы. Выйгралі б мы потым грашова? Наўрад ці. А вось падладжвацца пад публіку давялося б, давялося б станавіцца больш камерцыйным калектывам, недзе адмовіцца ад беларускамоўных твораў у сваім рэпертуары, асабліва калі гаворка зайшла б пра замежныя выступы. Працаваць "пад дзяржавай" нас задавальняе, спадзяюся, і ансамбль як рухавік беларускага мастацтва дзяржаву задавальняе.

— Дзіўна чуць аб частковай адмове ад песень на беларускай мове за мяжой ад ледзь ні адзінага ў краіне поп-калектыва, кампазіцыі якога на беларускай заўсёды "на ўра" прымаюцца замежнай публікай...

Р.К.: — Напрыклад, у Расіі нам прасцей катаць праграму са старымі песнямі, на яе попыт ёсць. Аднак не факт, што прапануй мы цалкам беларускамоўны канцэрт, гледачы на яго пайшлі б. Як украпванні песні на беларускай — так, сустракаюцца з захапленнем. Але — у кантэксце блока папулярных беларускамоўных песень. Зусім не ўпэўнены, што праграма на вершы беларускіх паэтаў XIX стагоддзя за мяжой будзе збіраць аншлагі.

— Вядома, як арганізуе свае канцэрты ў Беларусі Аляксандр Саладуха. Як арганізуеце выступы вы?

Р.К.: — Калі не нас запрашаюць, дык звязваемся па тэлефоне напрамую з пляцоўкамі. Амаль так, як Саладуха робіць. З канцэртамі сёння складана, людзі ў глыбінцы (і не толькі) не могуць дазволіць сабе марнаваць "лішнія" сродкі на забавы, ды і няма ў іх такіх грошай. Да таго ж "Песняры" — не сольны выканаўца, які бярэ з сабой на гастролі толькі гукарэжысёра ды, у лепшым выпадку, двух чалавек на падтанцоўку і спявае пад "мінусавую" інструментальную фанаграму. Мы — ансамбль цалкам "жывы", вязем з сабой цэлы аўтобус апаратуры: транспартныя выдаткі — самыя вялікія сярод іншых у такіх турнэ. А ганарар за выступ у нас не нашмат большы, чым у сольнага артыста.

Постшарапаўскае

— Пасля таго, як "Песняры" пакінуў Вячаслаў Шарапаў, цяжар адміністрацыйнай і кіраўнічай працы лёг на плечы Рамана Козырава...

Р.К.: — Гэта так.

— Альтэрнатыва была, сход калектыву?..

А.Ж.: — "Раба на галеру" выбралі аднагалосна.

Р.К.: — Я быў бы рады, каб іншыя прэтэндэнты знайшліся. "Чужы" ніхто не разглядаўся, а ўнутры і вылучылі мяне. Думалі над тым, каб падзяліць пасады дырэктара і мастацкага кіраўніка, але прыклад Славы паказаў, што іх сумяшчэнне магчымае, і карысць прыносіць, таму вырашылі нічога не мяняць. Міністэрства культуры маю кандыдатуру зацвердзіла.

— Сыход Шарапава раптоўным для ансамбля не стаў?

А.Ж.: — Натуральна, ён нас рыхтаваў да гэтага. Казаў пра тое, як нам можна было б жыць далей. Чалавек сумленна зрабіў справу, велізарную справу, і палічыў сваю місію выкананай. Ён вярнуў дзяржаве брэнд "Песняры" — прынёс на сподачку літаральна. Чатырнаццаць гадоў вёў гэты няпросты карабель, фарміраваў яго экіпаж, не даваў памерці старым песням, аднаўляў забытыя, сам напісаў некалькі выдатных кампазіцый, падрыхтаваў новыя праграмы. Мы яму за ўсё толькі ўдзячныя, і за яго спіной ніхто сыходу не радаваўся.

Р.К.: — Узначаліўшы "Песняры", сутыкнуўшыся са штодзённай нятворчай працай, я толькі цяпер зразумеў, наколькі Славу з яго творчым патэнцыялам было цяжка адцягвацца на руціну, якая не мела дачынення да музыкі. Як усё гэта засмоктвае, "грузіць", не пакідаючы часу на мастацтва, ні на што іншае наогул! Я ўяўляю, як яму спалося, калі эканамічныя крызісы білі па ансамблі, як яму даводзілася круціцца. Слабы збег бы тады, а ён калектыў не пакідаў, шукаў шляхі для яго прымальнага існавання ў тыя перыяды і знаходзіў іх. І зараз ён не вызваліўся ад яго, як ад невыноснай ношы, а пакінуў у добрым фінансавым стане і ў нядрэннай творчай форме. Дзякуй яму за ўсё! Мы расталіся з вялікай павагай адзін да аднаго. Зрэшты, Слава часам і сёння прымае ўдзел у нашых канцэртах.

А.Ж.: — Ён чалавек усебакова развіты. У нейкай ступені нават палітык. З гадамі, можа, і стане ого-го якой фігурай на гэтым полі.

— Няма жадання на новым этапе, пасля "змены ўлады", сабраць калектывы, якія маюць у сваіх назвах словы "песняры" — прынамсі тыя, чые ўдзельнікі працавалі з Уладзімірам Мулявіным, і зладзіць нешта накшталт фармальнага прымірэння, ліквідаваць прабелы ў адносінах, сыграць адзін для аднаго, пагаварыць па душах, а потым апублікаваць такую "канферэнцыю"?

Р.К.: — Мы перыядычна супрацоўнічаем з кім-небудзь з такіх музыкантаў, яны звяртаюцца да нас з прапановамі. Я разумею, што некаторым былым "песнярам" тых "скліканняў" было складана шукаць для сябе новыя брэнды. Хачу пажадаць, каб ім хапіла смеласці выступаць пад сваімі імёнамі, не затуляцца нейкімі абрэвіятурамі і "залатымі галасамі". Упэўнены, поспех яны мелі б. А зараз што атрымліваецца? Іх прадзюсары дзесьці хітраць, падманваюць, паказваючы на афішах, што прыязджаюць "Песняры", і мы займаемся непрыемнай, вымушанай, нятворчай працай, перапыняючы гэтыя намеры. У Беларусі пару выпадкаў было...

"Кантрольнае"

— У адной з расійскіх тэлеперадач стваральнік ВІА "Арыэль" Валерый Ярушын выказаўся пра яшчэ "мулявінскіх" "Песняроў" у тым сэнсе, што ансамбль, вядома, быў выдатным, але, на яго погляд, так скажам... з сапраўдным мужчынскім драйвам у ім было слабавата...

Сяргей БАЁК (бас-гітара): — Вы паглядзелі б, як мы па панядзелках іграем у футбол, з якім запалам, не шкадуючы сябе. Не, з пачаткам усё ў парадку.

Р.К.: — Зірніце на Артура, на бодзібілдара нашага, наколькі ў яго ўсё сур'ёзна з анатоміяй.

А.М.: — Фізічную форму ўсе падтрымліваюць. У пейнтбол вось збіраемся паіграць — цалкам мужчынская справа. У цір схадзіць кампаніяй...

Юрый ТУРАВЕЦ (ударныя): — ...пастраляць адзін у аднаго...

А.М.: — Адзін аднаму не надакучаем, карацей.

Пытанні задавалі Алег КЛІМАЎ, Яўген РАГІН, Вольга РОПАТ, Аліна САЎЧАНКА, Сяргей ТРАФІЛАЎ

К

Лістападаўскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць кампазітар, прадзюсар Леанід ШЫРЫН (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

Аўдыя & Відэа



АЎДЫЯ

Праект "Tvorca", міні-альбом "Мара"

А.: Складана сказаць пра гэты праект нешта абсалютна асэнсаванае... Адчуваецца ўплыў "Muse", але ў адрозненне ад "арыгінала", які не шкадуе матэрыялу ў кожнай са сваіх кампазіцый, тут меладычнай разнастайнасці менш. Ці раптам ідуць абрывы і паглыбіцца ў тэмы не паспяваеш. Неапраўдана доўгія ўступленні, што не нясуць інфармацыю. Ёсць прэтэнзіі да запісу, калі за гукам часам дрэнна чутны тэкст. З таго, што пачуў, асобныя вобразы спадабаліся, як і шэраг гармоній. Наогул, цікава было б пагутарыць з аўтарам работы: што ён хацеў ёй сказаць, што хацеў данесці?

В.: Вушы ў мяне доўгія, і Сяргея Малашонка, які хаваецца за назвай "Tvorca", я пачуў. Прыемная электроніка, з мінімальнымі наваротамі, некалькі танцавальнага складу, прытым, што тэксты нясуць пэўную нагрузку сацыяльнага характару. З мелодыямі, праўда, бедна: паменшыць бы і без таго міні-рэліз (з пяці кампазіцый) трэкаў да двух, пакінуўшы, скажам, "Mara" (на беларускай мове) і "Madness" (кавер "Muse"), і асадачку тады не засталося б. А так вось ён, на дне, у выглядзе міні-рэцэнзіі.

Гурт "Drwiwy", альбом "Cyrk Biezzahanny"

А.: З такім светапоглядам, з такой падачай я знаёмы добра, досыць згадаць запісы "Аўкцыёну" або Пятра Мамонава канца 1980-х: гэткія музычныя ды тэкставыя брутальнасць і фрыкаватасць, тэатральнасць. Увесь час ловіш сябе на тым, што і тое было, і гэта: здавалася б, надзейна забытае старое, ды не — усплыло. З гэтай прычыны, я думаю, пры быццам бы ўяўным уласным абліччы, ідэнтыфікаваць гурт нават пры яго зусім нетрывіяльнай назве нялёгка. Сёння мяне падобная творчасць не вельмі чапляе. Цікава, наколькі блізкая такая пазіцыя цяперашняму пакаленню меламанаў? Асобныя песні нядрэнныя, падышлі б як саўндтрэкі да адпаведных фільмаў, але ў цэлым, як канцэпт, альбом занадта ідэйна перагружаны ды манатонны меладычна. Але спробе сказаць сваё слова ў музыцы, тым больш на беларускай мове, я паставіў бы "залік".

В.: Усё гэта хараство мінска-гомельскага складу апісаць словамі вельмі цяжка, а таму настойліва рэкамендую работу дадзеную адшукаць, у інтэрнэце, вядома. Нават тыя, хто потым стане адчайна лаяцца, усё ж ткі карысць ад гэтага працэсу атрымаюць — яны пазбавяцца ад назапашанай у арганізме адмоўнай энергіі. Але, мне здаецца, эмоцый больш будзе станоўчых. Панурая псіхадэліка з дзіўнымі гукамі ды рыфмаванай... ну хай будзе эквілібрыстыкай (а, як я!). З першых, хто прыйшоў у галаву, расійскіх "аналагаў" — гурты "Аўкцыён", "Н.О.М.", "Авія".

Макс Корж, альбом "Малы пасталеў. Ч. 1"

А.: Такое адчуванне, што дадзены альбом Каржа — дэбютны, а яго папярэднія дыскі — паспяховае развіццё гэтага. І музычны, і тэкставы спектры рэлізу не вельмі шырокія: як бы аўдыторыя Макса пасля такога альбома не звузілася да зусім падлеткавага ўзросту. Навацый не прапанавана, ёсць хіба новыя песні выканаўцы, менш хітовыя, з немудрагелістымі аранжыроўкамі. Можа, у пары выпадкаў толькі гітара прыцягвае ўвагу. Попытам работа карыстацца будзе, бо шлях Максам ужо накатаны, але асабіста я больш расчараваны, чым натхнёны.

В.: Корж назбіраў трэкаў на альбом. Нягледзячы на тое, што і без таго немалы малы пасталеў, жах бярэ, калі ўявіш сабе, што і праз 10 гадоў саракагадовы Макс будзе "гнаць" усё тое ж для "шкалаты". Ну гэта як амаль пяцідзесяцігадовы Грыгор'еў-Апалонаў з калегамі працягвае выводзіць для дзяўчынак ды іх мам, што хмары, як людзі. Але аўдыторыя ў Макса — не раўня нашаму тыражу. (А лепш бы было наадварот.) Можа, нам таксама рэдакцыяй у рэперы падацца?

ВІДЭА

Гурт "The Superbullz", кліп "Чарка-шкварка"

А.: І кліп і кампазіцыя зроблены прафесійна. І сыграна, і праспявана, і запісана песня на ўзроўні высокім. Трошачкі закранула тое, што тэкставы негатыўны пасыл адрасаваны менавіта беларускаму чалавеку — нейкаму прыстасаванцу, бо такіх людзей, — што "жывуць" на канапе — мільёны ва ўсім свеце. Відэа, напэўна, адпавядае нейкаму сучаснаму трэнду, моднай тэхналогіі. Мне ад яе ні халодна, ні спякотна. Глядзіцца? Глядзіцца.

В.: Гурт, раней вядомы як "The Superboyz", спявае песню пра людзей, чыя пазіцыя ў гэтым жыцці ў тым, каб была чарка са шкваркай, а астатняе — не важна. Ілюстрацыяй жа да сацыяльнага опусу стала відэа, дзейнымі асобамі якога з'яўляюцца дзяўчына ды юнак. Яна вывучае кнігу з работамі Леніна (пакажыце мне наяве такую паненку), а ён у паралельнай рэальнасці выказвае сваю жыццёвую пазіцыю шляхам здзеку над выданнем. Гофман з Лінчам, карацей. Інакш кажучы — і кампазіцыя ні пра што, і кліп.

У Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, што ў Бабруйску, паставілі спектакль "Гэта ўсё яна" паводле аднайменнай п'есы маладога беларускага драматурга Андрэя Іванова. Два месяцы таму тая ж п'еса была ўвасоблена ў сталіцы — у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Спектаклі атрымаліся прынцыпова рознымі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Яна — гэта...

Сцэна са спектакля "Гэта ўсё яна".

Драма супраць меладрамы ў трох версіях

П'еса, створаная чатыры гады таму ў час выязной лабараторыі ЦБД — Цэнтра беларускай драматургіі, адразу атрымала міжнароднае прызнанне. За адзін толькі 2013 год яна ўвайшла ў шортліст Міжнароднага конкурсу драматургаў "Еўразія", у конкурсную праграму фестывалю "Любимовка", была надрукавана ў маскоўскім часопісе "Октябрь". Дый у Мінску яе ўвасаблялі неаднойчы — найперш у форме чытак, прычым у адным з праектаў рэжысёрам выступаў аўтар. Два гады таму Аляксандр Марчанка, які ўзначальвае згаданы ЦБД, паставіў п'есу ў Віцебску ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа.

Нядаўняя прэм'ера ў РТБД адметная тым, што рэжысёрам выступіла Моніка Дабраўлянска з Польшчы. Яна выкарыстала ўвесь арсенал сучасных тэатральных прыёмаў, уключаючы відэапраекцыі, прыём вымаўлення маналогаў на камеру, аздобіла дзеянне жывой музыкай — быццам бязмоўным сведкам-каментатарам падзей (Канстанцін Гарачы). Ды ўсё ж трагічны фінал, у п'есе вырашаны як рэзкі пералом ад віртуальнай ідыліі да жорсткай рэчаіснасці, тут не выклікаў мурашак-дрыжыкаў па целе. Бо спектакль, уласна кажучы, пачынаўся з гэтай апошняй сцэны (маці ўсё бяжыць, бяжыць, бяжыць, але так і не можа выратаваць сына) — і нам заставалася хіба сачыць, як героі, пры ўсёй выбітнасці іх акцёрскага ўвасаблення, няўмольна рухаюцца ў бездань на фоне фігуратыўна зменлівай, але глухой да іх непаразуменняў сцяны. Міжволі згадвалася вельмі сціплая, але не менш сімвалічная сцэнаграфія адной з чытак: маленькія хаткі-шпакоўні, што асацыяваліся з тэмай адзіноты, безабароннасці, птушкі-душы.

Бабруйскі жа спектакль увогуле стаў падобны да шматлікіх расійскіх меладрам — тых мініг-серыялаў (з удзелам беларускіх артыстаў, зразумела), якімі шчодра запаўняюць суботні тэлеэфір. Рэжысёр Сяргей Карбоўскі, скім — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова, Раман Салаўёў (Сын) і Арцём Герак (Крумкач).

Ды ўсё ж, улічваючы расплаўсюджанасць сюжэтаў пра віртуальныя падмены-падманы (чым не новы "архетып інтэрнэту", народжаны сучаснасцю?), можна было ўвогуле напісаць новую п'есу, бо ад раней шай застаўся хіба драматургічны "шкілет", дый тое з прыкметамі хірургічнага ўмяшальніцтва. Калі ў коласаўцаў і ў РТБД п'еса была перакладзена на беларускую мову, дык адначасова выступіўшы аўтарам сцэнаграфіі, самастойна ажыццявіўшы падбор музыкі і відэа, прапанаваў, па сутнасці, аўтарскі праект. Ён не толькі значна скараціў і перапрацаваў п'есу, але і дапісаў у яе сваё заканчэнне — абсалютна нечаканае. Адпаведна, унёс некаторыя змяненні ў папярэдні тэкст. Але захаваў чатырох дзеючых асоб, як гэта і было ў аўтара. Бо ў многіх ранейшых версіях тым артыстам, якія іграл рэальных персанажаў — Маці і Сына, рэжысёры аддавалі і ролі іх віртуальных "двайнікоў" — Тофі і Таўэрскага Крумкача, пад якімі героі перапісваліся ў сацыяльнай сетцы: у сталічным спектаклі заняты заслужаная артыстка краіны Людміла Сідаркевіч і Дзмітрый Давідовіч, у віцебскім — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Таццяна Ліхачова, Раман Салаўёў (Сын) і Арцём Герак (Крумкач).

Ды ўсё ж, улічваючы расплаўсюджанасць сюжэтаў пра віртуальныя падмены-падманы (чым не новы "архетып інтэрнэту", народжаны сучаснасцю?), можна было ўвогуле напісаць новую п'есу, бо ад раней шай застаўся хіба драматургічны "шкілет", дый тое з прыкметамі хірургічнага ўмяшальніцтва. Калі ў коласаўцаў і ў РТБД п'еса была перакладзена на беларускую мову, дык у Бабруйску, пры захаванні рускамоўнага арыгінала, з тэкста зніклі не толькі найбольш вострыя сітуацыі (да прыкладу, калі сын знаходзіць у маці фалаімітатар), але і моўная ідэнтыфікацыя персанажаў. Замест маладзёжнага сэнгу з ненармаванай лексікай, што само па сабе стварала сітуацыю канфлікту, атрымаліся "прыгладжана-прыпамажаныя" фразы.

У фінале ж спектакль хацелася перайменаваць: маўляў, "Гэта ўсё?.." Праблема бацькоў і дзяцей "разрулівалася" сама сабой, нават без "Бога з машыны", уласцівага старажытнагрэчаскаму тэатру: стоячы на падваконніку шматпавярхоўкі, сын не рабіў апошняга ў жыцці кроку, а раптам кідаўся ў матчыны абдымкі і прасіў у яе прабачэння. А каб хэпі-энд стаў шчаслівым удвая, раздаваўся званок у дзверы: гэта прыйшла рэальная Тофі — дачка матчынай сяброўкі. Ну, проста ўсё для працягу серыялу: вядома, між маладымі павінна быць нерэальнае каханне, але, для большай драматычнасці, з перашкодамі — да прыкладу, з боку згаданай матчынай сяброўкі, якая з самага пачатку ведала пра "інтэрнэт-гульні", але чамусьці спакойна ставілася да таго, што фота яе дачкі выкарыстоўваецца як "прыманка" для хлопца.

З'яўленне рэальнай Тофі насамрэч дадае яшчэ адну праблему, пазычаную з "Сірано дэ Бержэрака" Эдмона Растана: дык у каго быў закаханы герой? Калі яго прыцягвала перапіска (а менавіта так і адбываецца і ў п'есе і ў спектаклі) — значыць, сам таго не ведаючы, у матчыну душу. Калі ж "запаў на фота" — значыць, у "партрэтную" Тофі, незалежна ад яе ўнутранага свету, які, несумненна, будзе адрозніваца ад матчынага. У стасунках маці з сынам нічога не змяняецца: яна так і застаецца неаспрэчным лідарам, нават сама, як высвятляецца, дзяўчынку для яго знаходзіць. І што, складаны падлетак з усім гэтым пакорліва пагодзіцца?

Шмат пытанняў узнікае і да ўласна тэатральных сродкаў, для малой сцэны, дзе надта пукатая "выразнасць" успрымаецца ненатуральна ці ўвогуле парадыйна. Мужчынская (Сяргей і асабліва Уладлен Васіленкі) — у больш сучаснай, набліжанай да кіно і рознага роду "дакументалістыкі", дзе пануе простая гаворка — "як у жыцці". Хочаш ці не, а пачынаеш успрымаць гэта як намёк на непераадольнасць мяжы. Няўжо гэта свядомы прыём? Але ён значна спрашчае характары, перашкаджае ўбачыць, што кожны з герояў — ахвяра і кат адначасова.

Тым не менш, ухвалення варты сам зварот бабруйскага тэатра да сучаснай беларускай драматургіі. Прычым не ўпершыню за апошні час! Увесну там паставілі "Лондан" Максіма Дасько, запрасіўшы маладога сталічнага рэжысёра Алену Сілуціну. Спектакль атрымаў розгалас, пабываў не толькі ў Мінску, але і ў Кішынёве, стаўшы лаўрэатам VIII Міжнароднага фестывалю-лабараторыі "Молдфест.Рампа.Ру".

Прэм'ера спектакля "Гэта ўсё яна", мяркуючы па аншлагавай зале і зацікаўленым абмеркаванні пасля прагляду, таксама выклікала гарачую зацікаўленасць гледачоў і крытыкаў (на прэм'еры прысутнічаў кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Рыгор Баравік). Старэйшае пакаленне ўбачыла ў ім працяг тургенеўскай тэмы "бацькоў і дзяцей". Маладшае — адыход ад "праўды жыцця". Усе разам — адзначылі цудоўнае сцэнічнае існаванне дэбютанта Уладлена Васіленкі, якога рэжысёр прывёў у тэатр менавіта на ролю Крумкача.

Дык што такое тэатр — люстэрка ці паралельная рэальнасць? І ў чым яго прызначэнне — ускрываць праблемы ці супакойваць і без таго збалелыя душы? Пытанні засталіся без адказу. Але тое, што бабруйскі тэатр хаця б звярнуўся да іх, закрануўшы няпростую тэму, — ужо добра. Ёсць спадзеў, што наступным крокам стануць пошукі гарманічнага сінтэзу між вастрынёй праблематыкі, яе адэкватным данясеннем і ўласна мастацкасцю пастаноўкі. К

Конкурс "Францыск Скарына і сучаснасць" па стварэнні твораў для драматычнага тэатра, пераможцы якога былі вызначаны ў кастрычніку, атрымаў першы практычны вынік. 11 лістапада ў Магілёўскім драматычным тэатры адбылася прэм'ера спектакля "Скарына" паводле твора Мікалая Рудкоўскага "Доктар вольных навук", уганараванага ў намінацыі "Сучасная п'еса". Праўда, у графе аўтарства да прозвішча драматурга дадалося імя галоўнага рэжысёра тэатра Саўлюса Варнаса, які не проста зрабіў сваю сцэнічную рэдакцыю, а дадаў новыя фрагменты тэксту.

Надзея БУНЦЭВІЧ, Мінск — Магілёў — Мінск

Ад Скарыны да Фаўста

Сцэна са спектакля "Скарына". / Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ

Як прызнаўся дырэктар тэатра Андрэй Новікаў, разлічвалі атрымаць звычайны асветніцкі праект, прызначаны найперш для школьнікаў — у якасці гэткага "вучэбнага дапаможніка". Раз-пораз "Скарыну" і сапраўды паказваюць у больш ранні час, для падлеткава-юнацкай аўдыторыі. Але спектакль атрымаўся сапраўдным высокамастацкім творам — з арыгінальнай канцэпцыяй і адметнай тэатральнай мовай. У адпаведнасці меры ён можа быць прызначаны і для студэнцтва, і для сталай інтэлігенцыі, і для "прасунутых" сем'яў, дзе выхоўваюць школьнікаў сярэдніх і старэйшых класаў і не цураюцца філасофскіх пытанняў, а сярод іх галоўнага — аб прызначэнні чалавечага жыцця. Бо спектакль — менавіта пра гэта. Навошта ў тэатры пераказваць біяграфію? Кожны школьнік ведае: калі раптам спатрэбіцца, яе можна будзе "загугліць", а для большай дакладнасці — зазірнуць у энцыклапедычны даведнік. Тэатр — для іншага: эстэтычнай асалоды і палёту думак. Усё гэта і дае "Скарына".

П'еса, у якой шмат ад жанру фэнтэзі, пачыналася з размовы ў купэ цягніка. Пасажыры, якія потым ператвараліся ў герояў эпохі Адраджэння, дыскутавалі пра ролю папяровых інфармацыйных носьбітаў: маўляў, ці не заменяць іх электронныя кнігі ды іншыя тэхнічныя вынаходніцтвы. Рэжысёр адмовіўся ад гэтай сцэны, замяніўшы яе іншай — інтэрактыўнай, якая адразу ўцягвае гледачоў у эпіцэнтр падзей і адначасова носіць менавіта асветніцкі характар: акцёр, які будзе іграць маладога Скарыну (Іван Трус, нядаўна ўганараваны Нацыянальнай тэатральнай прэміяй за лепшую мужчынскую ролю — Познышава ў "Крэйцаравай санаце", пастаўленай тым жа Варнасам), праходзіць праз глядзельную залу і, не ўзыходзячы на сцэну, звяртаецца да публікі, бы той "пектар-прапагандыст": маўляў, сёння мы пагаворым пра Скарыну — і пачынае расказваць яго біяграфію. Але тут жа раздаецца "голас з залы", які перабівае "вядучага", удакладняе ці аспрэчвае навуковыя факты. Знаўцы радасна пазнаюць акцёра Васіля Гальца, астатнія ж крыху пазней разумеюць, што менавіта гэты "апанент" становіцца ў спектаклі Майстрам. Праз такі "пралог" адразу акцэнтуюцца дзве надзвычай важныя ў асветніцтве (і не толькі) рэчы. Што навуковыя версіі (і, адпаведна, школьныя веды таксама) могуць быць альтэрнатыўнымі. І што любую аксіёму можна (а часам і трэба) ператвараць у тэарэму, якая патрабуе доказу, а не сляпой веры і завучвання як адзіна магчымага варыянту.

Далейшая праца рэжысёра з тэкстам п'есы нагадвае філіграннае майстэрства ювеліра, які перапрацоўвае каменьчык у вы кшталцонае ўпрыгожванне, што здзіўляе неверагодным спалучэннем хараства і адначасова практычнасці, функцыянальнасці. Спектаклі асветніцкага характару апошнім часам сталі з'яўляцца ўсё часцей, да іх можна аднесці такія абсалютна розныя па тэмах і стылёвых кірунках пастаноўкі, як "Пан Тадэвуш" паводле Адама Міцкевіча, "Дзве душы" паводле Максіма Гарэцкага, увасобленыя Мікалаем Пінігіным у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, "Камера, якую дала мне маці" Сюзаны Кейсен у пастаноўцы Дарыуша Ярэскага ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Але адкрываючы гледачу новыя, забароненыя ці не прынятыя да ўвасаблення раней тэмы, пастаноўшчыкі меней, як мне падалося, клапаціліся пра пошукі ў галіне ўласна тэатральных сродкаў, звяртаючыся да апрабаваных традыцыйных прыёмаў. Саўлюс Варнас пайшоў іншым шляхам. З аднаго боку, ён наблізіў сучасную п'есу да гістарычнай, дадаўшы ў яе інфармацыйнасці (у тым ліку, праз цітры на экране, што асацыююцца з дакументалістыкай), "упісаўшы" дзейнасць Скарыны ў сусветны гістарычны працэс (выхад першай кнігі Скарыны храналагічна супадае са знакамітымі тэзісамі Марціна Лютара, з якіх пачынаецца Рэфармацыя). З другога ж — скіраваў спектакль у эстэтычна-філасофскае рэчышча, дзе фігура першадрукара нечакана сплятаецца з тэмай Фаўста.

Спектакль атрымаўся шматслойным, неверагодна прыгожым, прывабным для вока (мастак — Ірына Камісарава), заснаваным, як і заўсёды ў Варнаса, на разгалінаваных асацыятыўных шэрагах і сінтэзе мастацтваў, уключаючы… цырк. Што ні сцэна — узнікаюць нейкія новыя прыёмы, нас увесь час чымсьці здзіўляюць. То спасылкай на Пабла Пікаса (дзяўчына на шары, падобная да анёлка на планеце-глобусе). То, літаральна ўсутыч, актуальнасцю размоў Скарыны са старэйшым братам (Уладзімір Пятровіч) пра "вечныя праблемы" — хваробы, кошты. То, быццам наўмысна для падлеткаў-хлапчукоў, зваротам да рыцарскай готыкі, што дыхае містыкай. А крыху раней (гэта ўжо для дзяўчынак) — рамантычна-рамантызаванай, бы чароўны пылок з крылаў матылька, сустрэчай Скарыны з Маргарытай (Юлія Ладзік), падобнай не да булгакаўскай гераіні, а да пракоф'еўскай гарэзы Джульеты, да Наташы Растовай, якая скарае сваёй непасрэднасцю.

Другая ж дзея пераключае апавед зусім у іншы разгорт. Мы бачым Скарыну на схіле гадоў, яго іграе іншы акцёр — заслужаны артыст Расіі Аляксандр Палкін. Змяняецца агульная танальнасць, сцішваецца дынаміка, замядляецца тэмпарытм — на першы план выходзіць повязь думак, сутэльны клубок нераасэнсаваных вынікаў і жыццёвых каштоўнасцей. Калі ў Скарыны кніга гарэла (школьнікі пасля гэтага павінны палюбіць урокі хіміі ўдвая ці ўтрая больш), дык яго памерлы брат адным дакраненнем кіёчка дае жыццё зялёнаму парастку. Парадаксальнасць, на якой заснаваны ўвесь спектакль, мадулюе са знешняй сферы ва ўнутраную. Фаўсцыянства — ад Мефістофеля, з якім асацыяюецца Майстар, да ўласна Фаўста.

У першай дзеі ўсё было "раскладзена па палічках". І галоўная ідэя здавалася цалкам зразумелай: прызначэнне чалавека — выканаць сваю місію, а значыць, пакінуць штосьці пасля сябе на зямлі, змяніць свет у лепшы бок. Скарына марыць пра кнігі, шукае грошы на іх друкаванне, знаходзіць паплечнікаў, хай часам і дзіўнаватых, лечыць людзей, змагаецца з чумой. І, зразумела, кахае. Усё як мае быць. У другой дзеі ўзнікае тэма расплаты. Не толькі за грахі — за ўсё, уключаючы добрыя намеры і жаданне "перакуліць свет". Нас раптам прыводзяць да высновы: ніякія самыя добрыя намеры не каштуюць слязінкі, а тым больш жыцця нашых блізкіх. Такі паварот ад пяршынства грамадскіх абавязкаў да сямейных стасункаў становіцца сапраўдным пераваротам свядомасці — не толькі героя ў аповеду, але і гледачоў (вось чаму спектакль — яшчэ і для сямейнага прагляду).

Біблейская прытча пра Давіда і Вірсавію (Вераніка Баранава) выглядае гэткім "устаўным нумарам". Яна згадваецца і ў п'есе, але ў спектаклі не пераказваецца, а паказваецца — няспешна, дэталёва, дазваляючы гледачам адчуць сапраўдную асалоду ад жаночай прываблівасці нават у час такой "бытавухі", па цяперашніх мерках, як мыццё ног. "Устаўны нумар" быў і ў першай дзеі — разгорнутая сцэна прысвячэння ў "брацтва вольных людзей": з запаволенай пластыкай, з вялізнай жывой змяёй — тыгровым пітонам па мянушцы Зіна. Пэўна, ад гэтага можна было б і адмовіцца. Але тады адбылося б прыблізна тое, што будзе, калі з оперы выкінуць самыя "хітовыя" арыі (бо гэта ж спыненне дзеяння!), пакінуўшы адно рэчытатыўныя фрагменты. Аднак оперна-сімфанічнае мысленне Варнаса — тэма асобнай размовы. А тэма Скарыны — адкрытая для далейшых асэнсаванняў. К

Прыватная прыгода

Ігар Словы пра мастака Ігара Цішына

Мастак і літаратар Адам Глобус працягвае дзяліцца на старонках "К" сваімі "Словамі..." пра мастакоў. Ужо апублікаваныя эсэ пра Міколу Селешчука, Андрэя Радзівонава, Руслана Вашкевіча. Сёння — тэкст з тэкстаў пра Ігара Цішына.



Адам Глобус. "Беларус. Ігар Цішын".

Рэпрадукцыі

Мастак, як усе астатнія майстры сваёй справы, мусіць старанна вучыцца ў папярэднікаў. Школа ў мастака доўгая, пачынаецца ў дзіцячай студыі, працягваецца ў вучылішчах, праходзіць у інстытуты ды акадэміі і далей ідзе ва ўласнай майстэрні. Маладым мастакам дапамагаюць настаўнікі і выкладчыкі, але акрамя іх даводзіцца вучыцца на выставах, у галерэях і ў музеях. У час нашай з Цішыным маладосці вялікую частку ведаў мастакі атрымлівалі праз кнігі. Купіць дарагую кнігу школьніку ці нават студэнту было цяжка. Большасць нашых бібліятэчак складалі кнігі танныя з кепскімі рэпрадукцыямі. Менавіта гэтыя бляклыя і няякасныя выявы рабілі на Ігара найбольшае ўражанне, бо гледзячы на іх, можна было шмат чаго дадумаць і даўяўляць. Малафарматныя рэпрадукцыі і здымкі натхнялі дый зараз натхняюць Ігара Цішына значна больш, чым карціны ў музеях. Ён і сам пра гэта шмат казаў, і на яго палотнах гэткае вынесенае з маладосці захапленне моцна адбіваецца.

Кніга

Можна нават не спрачацца з тым фактам, што сваю найлепшую кнігу мы прачытваем у дзяцінстве. Я кажу пра лёсавызначальныя кнігі. Нехта зачытваецца апавяданнямі пра Холмса і паступае вучыцца на следчага. Хтосьці захапляецца Рабінзонам Круза і прысвячае жыццё падарожжам. Гэтыя прыклады ляжаць на паверхні. Пра іх шмат напісана і шмат сказана. Ёсць кнігі і менш знакамітыя, але іх уплыў на маладога чалавека можа быць гэтаксама важным. Так на Ігара Цішына паўплывала кніга Аспавата пра мастака Рыверу. У біяграфіі Дыега Рыверы хлопчык Ігар убачыў будучыню з доўгімі гадамі вучобы, з жыццём за мяжой, з выставамі ў Парыжы, Лондане і Венецыі. Цішын не толькі пабачыў у кнізе ўласную будучыню, ён сваё жыццё выбудаваў па ёй. Нават калі Ігар змагаецца за сацыяльную справядлівасць, гэта моцна нагадвае палітычную актыўнасць мексіканца Рыверы. Праўда, трэба заўважыць, знешне творы Цішына мала чым падобныя на творы лацінаамерыканскага рэвалюцыянера.

Касцюкоўка

У мастацкую вучэльню Ігар Цішын прыехаў яркім мастаком, які нават на іспытах змог напісаць акварэллю запамінальную кампазіцыю… Праз цёмна-сінюю вясковую ноч поўз нагружаны сенам трактар. Ён свяціў блыскучымі зялёна-блакітнымі фарамі. На высокім стозе сена, пад самым зорным небам сядзелі хлопчыкі. Трактар калываўся, буркатаў і павольна наскоўваўся на гледача. Пазней, я ўсё чакаў, калі Цішын паўторыць свой экзаменацыйны шэдэўр. Ён яго не паўтарыў, быў заняты іншымі не менш запамінальнымі кампазіцыямі. Не паўтарыў сваю выразную экзаменацыйную кампазицыю і сябра Цішына — Сцяпаненка. Яны абодва выглядалі на іспытах падрыхтаванымі мастакамі. У вучэльні Цішын і Сцяпаненка трымаліся, як і большасць землякоў, разам. Быў у іх і старэйшы сябра, з іх роднага гарадскога пасёлка Касцюкоўка — Вова Ісачанка. Касцюкоўскіх у вучэльні было трое, а вось жодзінскіх — шмат, мае знаёмыя койданаўскія хлопцы вучыліся ўжо ў інстытуце, але падтрымлівалі мяне, чым маглі. Без зямляцтва, без падтрымкі старэйшых, у мастацкім свеце жыць і выжыць цяжкавата, асабліва ў самым пачатку, калі трэба пакінуць бацькоўскі дом у Касцюкоўцы і перабрацца жыць у сталічны горад. Ісачанка і Сцяпаненка моцна дапамаглі ў гэтым Цішыну, можна сказаць, што дапамаглі, як ніхто іншы.

Пано

Ёсць такі ход у сляэлівых успамінах, які пачынаецца словамі "Хацеў зрабіць і не зрабіў…" Яго шмат хто выкарыстоўвае, бо ён выдатна працуе. Таму і я зраблю падобнае. Згадаю, як разам з Ігарам Цішыным задумалі напісаць пано памерам тры на дзевяць метраў. На пано мы збіраліся зрабіць копію фрэскі з касцёла ў Мсціславе. На тым залацістохрыстым сценапісе быў памайстэрску выкраслены арган з птушкамі. У сталярнай майстэрні мы замовілі дванаццаць падрамнікаў. Ігар знайшоў у інтэрнэце будаўнікоў прасторны пакой на тэхнічным паверсе, куды мы завезлі свежыя і светлыя падрамнікі з крыжавінамі. Трэба было неадкладна пачынаць працу над пано, а мы цягнулі час. Цягнулі і дацягнулі да таго, што жаданне напісаць вялікі арган прапала. Падрамнікі мы перадалі ў рэстаўрацыйныя майстэрні. Часам мне сніцца, як разам з Ігарам Цішыным я пішу на вялікіх палотнах арган і птушак — белакрылых галубоў і шэрых саловак.

Інтэрнацыянал

Цішын скончыў аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага жывапісу. Сярод акадэмічных заданняў у інстытуце было і маляванне галавы чалавека ў вялікім памеры. Любоў да манументальных і выразна зробленых галоў Ігар культывае заўжды. Ён зрабіў шмат партрэтаў Хармса, пісаў Платонава і Эйзенштэйна, Суціна і Сартра. Героі і гераіні з фотаздымкаў рэвалюцыйнага Родчанкі цялымі атрадамі перайшлі на палотны Цішына. Не толькі любімцы і геніі робяцца ў Ігара веліканамі, разам са станоўчымі персанажамі павялічваліся і адмоўныя. Яшчэ адно акадэмічнае заданне з часоў інстытута шмат дзе прысутнічае на малюнках Ігара Цішына — шрыфты. У карціных шмат літар і слоў, многа сказаў, што складаюцца ў своеасаблівую постмадэрністычную паэзію. Жывапісная постфутурыстычная лірыка Цішына шчыльная, лаканічная і шматмоўная. Можна сказаць, што ў творах Ігара пануе праўдзівы, рамантычны і арганічны інтэрнацыянал.

У-жос

У Ігара Цішына ёсць сваё ўласнае слова для вызначэння найвялікшай кепскасці — "у-жос". У ім рускае "ужас", беларускі вужака і беларускае незвароткае "ужо здарылася непапраўнае". У майстэрні павесіўся найбліжэйшы з таварышаў Ігара Цішына, наш Валік Дзяленьдзік — у-жос! Жыццё і праца ў Расіі, у богам выклятай Пензе, сярод знаёмых, напампаваных гарэлкай, — у-жос. Пензарт? Не жарт! Пензарт — рэальны у-жос. Выкладанне ў мастацкай вучэльні — у-жос. Каб у мяне запыталі, якім адным словам можна акрэсліць усё жыццё і ўсю творчасць любімага паэта Ігара Цішына — Хармса, я акрэсліў бы яго цішынскім словам "у-жос". У творчасці самога Цішына хармсаўская "у-жоса" шмат, зашмат і яшчэ крышку.

Літаратура

На канцэрце ў Доме літаратара мастачка Тамара спытала ў мяне: "Як думаеш, пісьменнікі ведаюць пра тое, што быць пісьменнікам соромна?" Шчыра кажучы, я тады згадаў толькі аднаго пісьменніка, які пра гэта задумваўся і казаў, што без пачуцця сораму за сябе і за свае літаратурныя вопыты нічога вартага не напішацца. Таму я схіліўся да Тамары і ўтэўнена сказаў: "Леў Талстой ведаў... Пэўна і большасць тутэйшых пісак пра гэта здагадваюцца..." — "Слухаючы іх бессаромныя самаўхвалення, пра гэта не скажаш. Не ведаюць нашы пісьменнікі пра сорам ці проста ведаць не хочуць". Я не стаў спрачацца з Тамарай, бо крыху пакрыўдзіўся на яе. Нейкім чынам я і сябе залічваў да пісьменнікаў. Больш за тое, я думаю, што працаваць палітыкам ці артыстам значна больш соромна, чым займацца літаратурай. Размову з Тамарай я згадаў, калі прачытаў у тэксце Ігара Цішына наступнае: "Калі паспрабаваць уявіць сябе літаратарам, робіцца гідка..." Ігар ведае пра што кажа, бо і сам ён таленавіты і самабытны літаратар. Сам напісаў і выдаў кніжачку гратэскных апавяданняў, у якіх супрэматыст Казімір Малевіч дзейнічае разам з беларускімі сынамі — партызанамі. Галоўнае тут тое, што да сябе і да сваёй літаратурнай дзейнасці Ігар ставіцца іранічна, звышпатрабавальна і самакрытычна.

Нябёсы

Каб Ігар Цішын крычаў ці павышаў голас, я ніколі не чуў. Пэўна і прозвішча ў Ігара правільнае — адпаведнае натуры. Ён сціплы, стрыманы і ціхманы. Ён нават смяецца нягучна. Рогат, віскат і гырканне — гэта не пра яго. Таму мяне заўсёды надоўга спынялі творы Цішына, на якіх ён маляваў і перамалёўваў крык. У Ігара ёсць імправізацыі на матыў карціны Эдварда Мунка "Крык". Ёсць крыкі са стопкадраў, запазычаных з рэвалюцыйных кінафільмаў Сяргея Эйзенштэйна. Ёсць крыкі, зробленыя з плакатаў 1920-х. Немы крык — вобраз, які пераследуе мастака Цішына праз усё жыццё. Яго героі спрабуюць дакрычацца да нябёсаў, і зрэдчас у іх гэта атрымліваецца.

Плыні

Па малюнках і палотнах Цішына цячэ шчыльная плынь з выяў. У літаратуры ёсць падобны мастацкі прыём — плынь свядомасці, калі аўтар запісвае думкі, што прыходзяць у галаву. Выглядае на тое, што Цішын фіксуе на плоскасці візуальныя вобразы, якія перапаўняюць яго. Вобразы з'яўляюцца і знікаюць, яны збольшага недафармаваныя і недаакрэсленыя, яны пазначаныя, але не вызначаныя да канца. Каб давызначыцца, даправяцца, давыказацца, вобразы настойліва паўтараюцца. У творчасці Цішына шмат паўтораў, але кожны глядзіцца пераканаўча, як чорныя акуляры на носе ў летні, сонечны і гарачы дзень.

Маўчанне

З Ігарам Цішыным цяжка гаварыць, але з ім добра маўчаць. У Цішыне шмат змястоўнага маўчання. Словы яму даюцца цяжка. Яны ў яго каструбаватыя, грубаватыя, пабітыя на кавалкі. Ён іх піша на палотнах, занатоўвае на паперках, нават у кніжках выдае. Цішын, як і кожны разумны мастак, любіць і ўмее працаваць са словам, толькі ў дадатак да працы са словам ён выдатна працуе з маўчаннем, з замоўчаннем, з цішынёю… Дарэчы, найлепшыя з паслядоўнікаў Ігара вучыліся ў яго менавіта маўклівасці.

Адам ГЛОБУС,
мастак, літаратар

Каб выбіцца ў поп-зоркі...

“Баян, барабаны і лінейка!” — сцвярджае Аляксандр Патліс

У Гродне спевака Аляксандра ПАТЛІСА чакала творчая сустрэча з яго прыхільнікамі. Але першым пунктам знаходжання выканаўцы ў родным горадзе значыўся традыцыйны для герояў гэтай рубрыкі паход па ўстановах культуры. Кампанію ў візіце яму склалі чатырохгадовы сын Леон ды я. А цяпер яшчэ і вы...

Алег КЛІМАЎ, Мінск — Гродна — Мінск / Фота аўтара

Баяністам нумар адзін стаць не хацеў

У ліпені 1989 года Аляксандр Патліс быў прызваны ў шэрагі ўзброеных сіл СССР, служыў у Мінску ў “мотастралках” ды выступаў у складзе дывізіённага ансамбля. Не сыходзячы на “дэмбель”, у сталіцы і ажаніўся. Жаданне вярнуцца ў Гродна было, але жонка яго разупэўніла. З тых часоў на радзіме Аляксандр бывае наездамі, наведваючы бацькоў, даючы канцэрты.

...Прадзед Патліса граў на скрыпцы, дзед — на гармоніку, дзядзька — на баяне ды гітары: многія сваякі па лініі мамы мелі схільнасць да музіцыравання. За сталом спяваліся хіты народныя ды эстрадныя, гучалі шлягеры з магнітафонаў ды з пласцінак, і не дзіва, што маленькі Саша “галасіў” літаральна ўсюды. Нават у рэйсавым аўтобусе ладзіў сольнікі, выводзячы на ўвесь салон “Лісце жоўтае” ды “Ідзе салдат па горадзе”. У дзіцячым садку рулады дзіцяці пачулі “пакупнікі” з мінскай кансерваторыі, уразіліся ды прапанавалі пераехаць у школу-інтэрнат пры ёй. Аднак сямейны савет пад ціскам дзядулі на такі крок не адважыўся, але калі дзіцяці споўнілася сем, было прынята рашэнне аддаць яго ў музычную школу № 1. Марыў ён пра аддзяленне скрыпічнае або вакальнае, але апошняга ва ўстанове не было, а замест скрыпкі бацькі настаялі на класе баяна, ігры на якім у школе навучалі з 9-гадовага ўзросту. Так і атрымалася, што не самаму свайму любімаму інструменту (а бацькі купілі сыну белага колеру дарагі тульскі баян ручной работы) Патліс часу аддаў “ад званка да званка”. Не асаблівую стараннасць яго выкладчыкі адзначалі, ад самага строгага з іх часам перападала лінейкай па пальцах!

З “музыкалкі” падлетак выпусціўся ў музычнае вучылішча — на выбарны баян (якое не скончыў: за месяц да дзяржэкзаменаў студэнта, што не паспеў падрыхтаваць адзін з абавязковых твораў, адправілі ў акадэмічны адпачынак (вучобе “перашкодзіў” яго ўдзел у рок-гурце “Ісціна”), і ён назад не вярнуўся). Там Аляксандр і спяваў (у хоры, нярэдка “перацягваючы на сябе коўдру”, калі яго голас раптам выбіваўся з агульнай “пачкі”), як і ў агульнаадукацыйнай школе: да кар’еры вакаліста ён з нейкага моманту пачаў імкнуцца ўсур’ёз. Прычым жадаў ён не толькі спяваць, але яшчэ і адначасова граць... не, ужо не на скрыпцы, а на барабанах! Нават у народным аркестры, паралельна з вучобай па баянным профілі, ён спрабаваў свае сілы ў перкусійным майстэрстве. Але пра барабаны гаворка наперадзе, а зараз выпраўляемся ў...

Праз лінейку ў “зоркі”

...Дзіцячую музычную школу мастацтваў № 1, якая ўжо не першы год знаходзіцца ў іншым будынку. Змянілася пакаленне настаўнікаў, але пенсіянер Мікалай Мурын, той самы строгі педагог, пабачыцца з колішнім сваім падапечным завітаў. Як мне падалося, Мікалай Уладзіміравіч не без настальгіі згадваў пра тое, якімі яшчэ сродкамі ён прышчапляў вучню любоў да высокага. Але ж вынік атрымаўся! Аляксандр засяроджана слухаў, ківаў і пільна пазіраў па баках — лінейкі паблізу не было...

— Вельмі адкрытым ён быў, аднак у вучобе ленаваўся, заняткі прагульваў, — “рэзаў” праўду спадар Мурын. — Ды талент я ў ім бачыў. А сёння — таленавітыя ці не — усе ідуць у школу. Раней працэс адсейвання быў стражэйшым. А вось якасць выкладання нядрэнная, узровень цяперашніх педагогаў стаў вышэйшы ў параўнанні, дапусцім, з 1990-мі.

У ДМШМ і яе філіялах навучаецца 1082 чалавекі (дарослыя — на рэпетытарскай, платнай аснове), асвойваючы ігру на фартэпіяна, гітары, домры, балалайцы, скрыпцы, альце, віяланчэлі, кантрабасе, мандаліне, цымбалах, флейце, кларнеце, саксафоне, трамбоне, трубе, валторне, ударных, баяне, акардэоне... Ёсць аддзяленні харавое, эстраднае ды музычна-тэарэтычных дысцыплін, сем калектываў са званнем “узорны” ды некалькі вучнёўскіх. Штогод каля 30 працэнтаў выпускнікоў далей паступае ў профільныя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

— Не шмат для нашай маленькай краіны? — задаю я “дзіўнае” пытанне намесніку дырэктара па выхаваўчай працы Вользе Кавальчук.

— А ці не ўсе з іх рвуцца стаць “рыхтэрамі”. Шмат хто хоча выкладаць, балазе нават пры аптымізацыі патрэба ў музычных педагогах на сяле існуе.

Сапраўды, парадокс! Сферу скарачаюць, а наборы ў ССНУ ды ВНУ прынцыпова не змяняюцца, і пры ліквідаваных у вёсках установах культуры маладыя спецыялісты па-ранейшаму кудысьці ды размяркоўваюцца. А праблемы з інструментамі ў школе не здзівілі (зношаныя рэстаўруюцца сваімі ўмельцамі, на набыццё новых грошай не заўсёды хапае (установе ж, скажам, вельмі неабходны новы раяль)). Як і тое, што будынку патрабуецца рамонт. ДМШМ таксама з’яўляецца арганізатарам шэрагу конкурсаў, і пад іх патрэбныя фінансы...

Вольга Генадзьеўна правяла нас у залу, дзе рэпетыраваў школьны ансамбль, і Патліс па-хуткаму правёў “майстар-клас” ігры на баяне. А яшчэ паказалі нам невялікі музейны пакой, застаўлены інструментамі, па сценах якога развешаны падрабязны летапіс установы ў асобах ды падзеях. Хутка тут з’явіцца здымак Аляксандра з інфармацыяй пра спевака, паабяцала намеснік дырэктара.

Тут будзе...

Але вернемся да нашых барабанаў. У Палац культуры тэкстыльшчыкаў студэнта музвучылішча Патліса занесла з прычыны таго, што там мелася вакансія ўдарніка ў ансамблі. А барабаны ў ім прастойвалі не простыя, а вельмі і вельмі паважанай заходняй маркі. Любоў да гэтага інструмента была настолькі вялікая, што Аляксандр набыў у асабістае карыстанне фірмовую ўстаноўку, змясціў яе дома ў сваім пакоі, чым невымоўна “ўсцешыў” суседзяў. Да творчасці хатняй і палацавай дадалася вясковая — з 1986 года ў складзе “халт-каманды” ён стаў граць на сельскіх вяселлях: стукаць і адначасова спяваць (дзве “стаўкі” ён сумяшчаў і ў ПК). Слава пра юны гродзенскі талент шырылася ды мацнела, і вось тады надышла чарга перайсці яму ў вядомы па тых часах і ў горадзе, і ў краіне гурт “Ісціна”. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, а нас з Патлісам чакалі ў Гродзенскім палацы культуры (экс-“тэкстыльшчыкі”). Пра ўстанову нам трошкі распавяла дырэктар ГПК Ірына Міклашэвіч.

Дык вось, некалі ПК тэкстыльшчыкаў належаў прафсаюзам. У суровыя для галаўной арганізацыі гады ўстанова атрымала “незалежнасць” і, каб выжыць, на ўсю моц занялася арэндаздачай часткі сваіх памяшканняў. Што не перашкаджала будынку гібець. Калі старэнне стала набываць пагрозлівыя формы, Палац як самастойную юрыдычную асобу ў 2011 годзе ліквідавалі і перадалі на баланс горада, каб тут жа заняцца складаннем дакументацыі на яго рэканструкцыю. Улетку 2012-га ПК і павінны былі на яе паставіць. Чаго не здарылася. У чаканні абнаўлення яе жыццё Палаца, размешчанага ў цэнтры горада, падтрымлівалася спачатку выставамі ды арэндай. У канцы 2015 года ўжо як ГПК установа атрымлівае статус юрыдычнай асобы. Мала таго, у пачатку 2016-га яна данабірае штат служачых і ў ім прыступаюць да працы спачатку Тэатр гумару “Канкан” ды Народны маладзёжны тэатр эстрадных мініяцюр “Кантры”, а потым фрык-тэатр і гурткі спартыўна-акрабатычнага і сацыяльнага танца (апошнія два — платныя, а ад выстаў ды здачы ў арэнду вырашылі адмовіцца). Але ж паставіць Палац на рэканструкцыю збіраюцца, пакінуўшы яго філіялам Цэнтра культуры, такім чынам творчыя падраздзяленні ПК працаўладкаваныя будуць.

Унутраныя пакоі будынка сапраўды “цешаць” сваім маркотным аварыйным станам (але рамонту ды абнаўленню падвергліся сістэма ацяплення, частка труб і фасада, дах). І не верыцца, што праз некалькі гадоў на гэтым месцы паўстане не проста адрэстаўраваны Палац, а Мегапалац, Палац-сад! Сумненні мае Ірына Уладзіміраўна прагнала, паказваючы праект. Эскізы залаў, холаў, усходаў, іх інтэр’ер уражанне, вядома, ствараюць. І гэта мякка сказана. Калі ўсё задуманае будзе ажыццёўлена хоць бы на 50 працэнтаў (дырэктар згодная толькі на ўсе 100), то жыхары горада і будучыя насельнікі гэтай установы атрымаюць будынак у тым выглядзе, у якім мы можам бачыць якія-небудзь найпрыгожыя замкі з кінаказак, вытрыманыя ў класічным стылі. Спярша, праўда, ажыццяўленне праекта павінна быць прафінансавана з бюджэту, альбо праз міжнародны грант на яго рэалізацыю, і тады пачатак перараджэння можа стартаваць у 2018-м.

А пакуль і ў такім ГПК творчасць кіпіць. І каля яго. Напрыклад, летам тут праходзілі мерапрыемствы з серыі “Нядзеля каля Палаца”. Налета Палац, у якім бы становішчы ён ні знаходзіўся, мае намер ажыццявіць яшчэ шэраг эксклюзіўных праектаў: сумесную акцыю з вядомым расійскім баяністам, спеваком, кіраўніком гурта “Белы дзень” Валерыем Сёміным; “Бульба-фэст”; вялікі фестываль гарадскога раманса; культурна-спартыўнае свята з канцэртам ды футбольным матчам...

— Яшчэ артыстаў Палаца на гастролі па Беларусі выправіць бы, — марыць яго мастацкі кіраўнік Яўген Альфяровіч. — Гродзенскіх выканаўцаў наогул.

Не яго Багдановіч

Перыпетыі з пера- і падначаленнем установы, якая з 2014 года называецца Літаратурны аддзел установы культуры “Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей” (прасцей кажучы — Музей Максіма Багдановіча), магчыма, увойдуць у аналы сучаснай беларускай культуры. І хто каму дасць фору ў дадзеным аспекце — літаддзел або ГПК — гэта яшчэ як паглядзець. У Аляксандра Патліса вельмі смутныя ўспаміны пра Музей Багдановіча: школьнікам ён у ім дакладна быў, а вось пазней — не памятае. Такія ж “няпростыя” і яго адносіны з тым, чыё імя носіць установа.

— Я спрабаваў нешта скласці на яго вершы, — прызнаўся Аляксандр Валянцінавіч. — Але яны, як я іх адчуваю, нібы ўжо ўтрымліваюць у сабе мелодыі, а пры напісанні песень я заўсёды спачатку прыдумляю іх, а потым шукаю словы. Мова ў яго добрая, вобразная, ды... не мая... пакуль.

Ледзь увайшоўшы ў памяшканне, Леон прамовіў: “Клёва!” Калі глядзець на Музей метраў з дзесяці, выглядае ён сапраўды выдатна, быццам толькі што “ўведзены ў эксплуатацыю” альбо пасля рамонту. Падышоўшы ж ушчыльную, заўважаеш і парэпаную фарбу аканіц, і аблупленыя сцены. Унутры — “аўтэнтычныя” падлогі, якія патрабуюць неадкладнай замены ці хаця б афарбоўкі. Так што паспяшаўся сыночак Аляксандра з ацэнкай, зрэшты, можа, яму нейкі экспанат адразу ж спадабаўся, або магніцікі, якія тут можна набыць? А Патліс-старэйшы чамусьці зацікавіўся радаводам класіка беларускай літаратуры, пра які яму распавяла малодшы навуковы супрацоўнік Музея Кацярына... Багдановіч. (На лагічную цікаўнасць — ці не сваячка, яна звыкла з усмешкай адмоўна паматала галавой.)

Як і любая іншая ўстанова культуры, аддзел пастаянна “змагаецца” за кругазварот народу ў ім. У наступ кідаюць экскурсіі звычайныя ды тэатралізаваныя (з дэгустацыяй гарбаты), лекцыі ды тэматычныя заняткі (гульнявыя, інтэрактыўныя ў тым ліку), выязныя брэйн-рынгі ды спецыяльныя ўрокі, літаратурна-музычныя мерапрыемствы ды прэзентацыі... Аднак наведванне хочацца большага.

Якую музыку любіць Гродна?

Чым яшчэ сталася карыснай наша паездка для Аляксандра, акрамя дозы ўсё ж такі прыемнай настальгіі — тым, што ён атрымаў прапановы аб выступах у горадзе (хай пакуль і вельмі папярэднія). Як і ў выпадку з Янам Маерсам, якога родны Слуцк не спяшаецца клікаць да сябе з канцэртамі, тым жа самым Патлісу адказвае Гродна: выступаў у ім спявак у апошнія гады толькі на мерапрыемствах, пераважна ініцыяваных звонку (“Напэўна, я залішне інтэлектуальную музыку выконваю”, — сумна ўсміхнуўся артыст). Дзіўныя справы твае, беларуская поп-культура...

К

У ГПК з Ірынай Міклашэвіч і Яўгенам Альфяровічам.

Музей Максіма Багдановіча.

Аляксандр Патліс і Мікалай Мурын.

Фрагмент эскіза абнаўлення ГПК.

22 снежня ў Навуковай бібліятэцы Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта адкрылі першы бібліятэчны каворкінг "КБ-16" у Мінску.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Навошта нам каворкінг?

Калі хто не ведае, каворкінг — гэта слова, якое прыйшло да нас з англійскай мовы (co-working, "сумесная праца") і абазначае гарадскую грамадскую прастору або, скажам так, калектыўны офіс, які аб'ядноўвае людзей для зносін, навучання і творчага ўзаемадзеяння. Дзякуючы каворкінгу, людзі, якія цікавяцца якойнебудзь тэмай, могуць сабрацца на некаторы час разам, паразмаўляць, вырашыць тую ці іншую праблему і разбегчыся па сваіх справах. Менавіта такую форму сумеснай працы прапануе цяпер усім ахвотным бібліятэка.

— У каворкінгу "КБ-16", як мы плануем, будуць рэалізоўвацца студэнцкія праекты і ініцыятывы, — адзначыў "К" дырэктар бібліятэкі БНТУ Аляксей Скалабан. — Для гэтага тут ёсць усё неабходнае: зручныя крэслы, сталы, вялікая колькасць працоўных месцаў, зоны для сумеснай і індывідуальнай працы, бясплатны Wi-Fi, сучаснае аўдыя- і відэаабсталяванне. Акрамя таго, бібліятэка гатова даваць сур'ёзнае інфармацыйнае суправаджэнне карыстальнікам каворкінгу.

А сам праект паўстаў, дзякуючы намаганням супрацоўнікаў бібліятэкі і іхняга спонсара — кампаніі-рэзідэнта Парка высокіх тэхналогій "Сайберы СіАйЭс", якая ўклала ў крэатыўную ідэю эквівалент прыкладна 9 тысяч долараў. Праўда, як кажа Аляксей Скалабан, ад задумы да рэалізацыі бібліятэчных планаў прайшло шмат часу: спачатку супрацоўнікамі бібліятэкі быў распрацаваны праект, а пасля яны цэлы год грукаліся ў дзверы патэнцыйных спонсараў.

Каворкінг у Навуковай бібліятэцы БНТУ.

— У выніку спонсар знайшоў нас сам, прапанаваўшы супрацоўніцтва, — адзначыў Аляксей Скалабан. — Дзякуючы таму, што ў нас ужо быў створаны праект, мы адразу змаглі зацікавіць ім кампанію і даволі хутка яго рэалізаваць: ад заключэння пагаднення да адкрыцця каворкінгу прайшло ўсяго 50 дзён!

З цягам часу, як плануецца, на базе каворкінгу паўстане сумесная лабараторыя, якая дазволіць студэнтам засвоіць практычныя навыкі праграмавання пад кіраўніцтвам вопытных супрацоўнікаў кампаніі-спонсара або прыняць удзел у распрацоўцы ўнутраных праектаў універсітэта. Усё гэта, на думку праектантаў, прывучыць маладых людзей працаваць у камандзе і ў далейшым, магчыма, паспрыяе ў працаўладкаванні ў тую ці іншую кампанію, з якіх першай, натуральна, будзе фірма-спонсар.

Як адзначыў "К" кіраўнік кампаніі-партнёра Яўгеній Вольфсан, наступныя праекты, зробленыя сумесна з установамі культуры Мінска ці рэгіёнаў, для яго фірмы цалкам магчымыя.

— Але тут ёсць адна ўмова: каб гэты праект быў цікавым усім бакам, а таксама аказаўся добра распланаваным — сказаў Яўгеній Вольфсан. — І ў гэтым аспекце нас сапраўды вельмі парадавалі супрацоўнікі бібліятэкі: калі мы прыйшлі сюды, у іх было ўсё гатова для сумеснай працы, меўся рэальны бізнес-план, улічаны ўсе нюансы і перспектывы і гэтак далей. Названае і сталася галоўнай прычынай, чаму мы вырашылі падтрымаць ідэю. На жаль, са свайго вопыту магу сказаць, што вельмі часта сёння бывае наадварот: задумы ёсць, а іх падмацавання ў выглядзе добра пралічанага бізнес-плана ці праекта — няма.

Так што галоўны пасыл сённяшняга дня палягае ў наступным: "паветраныя замкі" варта пакідаць у мінулым, бо імі бізнесменаў наўрад ці прывабіш. Акрамя таго, да спонсара трэба ісці, грукаць у дзверы, дабівацца яго ўвагі. Інакш любыя, нават самыя цікавыя праекты, так і застануцца "жыць" адно на паперы і ў марах праекціроўшчыкаў.

Дадам, што ўваход у каворкінг "КБ-16" вольны для любога чалавека па чытацкім білеце Навуковай бібліятэкі БНТУ, а для таго, каб замовіць сабе час для калектыўнай працы, трэба спачатку зарэгістравацца онлайн.

К

Дыскусійна

Сысці з абцасаў, каб агучыць цішыню

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 5.)

Адна з самых вялікіх — супрацьлеглае ўспрыманне жанчынамі і мужчынамі розніцы паміж гвалтам і сексам без пагаднення. Я пераканаўся, што многія жанчыны глядзелі на сцэну, як у люстэрка".

Мяркую, каб прымірыць публіку з рознымі чаканнямі, неабходна перш-наперш вызначыцца, на якім полі гуляе спектакль. Тэатральны крытык Аляксей Стрэльнікаў прыгадаў міні-дыскусію ў сацыяльных сетках, калі адна з глядачак рэзка выказалася: "Я працую ў радзільным доме, і мяне ад гэтай тэмы ўжо адварочвае". Вызначыўшыся з патэнцыйнай аўдыторыяй, пастановачнай групе прасцей будзе акрэсліць мэты і задачы, для чаго ўсё закручваецца. Спадар Стрэльнікаў падсумаваў: "Я не пераацэньваў бы ролю айчыннага тэатра ў якасці публічнай прасторы для дыскусіі, не чакаў бы ад яго выбуховага рэзананасу ў грамадстве. Параўнайце з брадвейскім мюзіклам "Гамільтан", дзе ўсіх бацькоў-заснавальнікаў ЗША граюць чарнаскурыя акцёры. Спектакль узняў злабадзённую праблему стаўлення да эмігрантаў. Са сцэны нагадваюць, што Амерыку рабілі эмігранты. І, паверце, вельмі цяжка адшукаць які-небудзь тамтэйшы тэлеканал, дзе гэтыя акцёры не свяціліся б, не працягвалі б развагі, узнятыя спектаклем. У Беларусі ж не хапае размовы ў адказ. Спектакль пабачыў свет, а што далей? Пра яго будуць ведаць хіба некалькі сотняў фанатаў дадзенага тэатра. Толькі ў Мінску пастаянна функцыянуе дзясятак тэатральных пляцовак, але чакаць, што пастаўленае на іх падмостках імгненна стане рэзананснай тэмай, пакуль не даводзіцца…"

Сцэна са спектакля "Камера, якую дала мне маці". / Фота Крысціны ГРЭКАВАЙ прадастаўлена НЦСМ

У страце ўплыву на грамадскасць тэатр часткова вінаваты сам: рэпертуары ўсё часцей прапануюць забаўляльную праграму, з-за камедый скарачаючы колькасць спектакляў, што выціскаюць гледача з зоны камфорту і прымушаюць задумацца. Калі падставай для дыскусіі стане не адзін спектакль, а шэраг пастановак, што ахопяць тэму з розных бакоў, тады і размова выйдзе з вузкага кола, а чарговых пышнагрудых каралеў адно для ўпрыгожвання карцінкі зменяць шматгранныя гераіні з памкненнем зразумець прастору і час у тым ліку і праз асабістую цялеснасць.

К

З "Куфра-радцы"

"На прызбе ў пастаўскага млынара"

(сцэнарый свята)

Пляцоўка афармлена ў тэматычным стылі. Ля вываявы мельніцы размешчаны жорны, воз з мяхамі, вялізныя лялькі-сяляне, кубёл, іншыя этнаграфічныя прадметы побыту. Афармлена выстава хлябоў і караваяў мясцовых пекараў, а таксама выстава-дэгустацыя лепшых узораў хлебабулачных вырабаў райспажыўтаварыства. Для наведвальнікаў падворку праводзяцца атракцыёны, прапануецца сфатаграфавацца з шаблонам —"Сялянкай".

Гучыць мясцовая полька ў выкананні народнага ансамбля.

1-я ўдзельніца:
Прывітанне ўсім з Пастаў!
Хтосьці чуў, а хтось бываў.
2-я ўдзельніца:
Старажытны палац і касцёлы,
115 прыгожых азёраў…
3-я ўдзельніца:
Таксама ведаюць наш край,
Што тут музычны фестываль.
4-я ўдзельніца:
Сёння славім хлебаробаў,
Што сабралі ўраджай.
Працай шчыраю штодзённай
Здабыты цуда-каравай!
5-я ўдзельніца:
У пашане ён. З часоў сівых
Прыйшоў да нас, а малады заўсёды.
Між скарбаў самых дарагіх
Найдаражэйшы дар прыроды.

(Пад хуткую музыку выбягае абсыпаны мукой Млынар.)

Млынар:
Пэўна, на свяце так закруціліся,
Што нават на мяне забыліся.
Трэба намалоць спачатку мукі,
Каб спячы каравай і пірагі.

(Пад музыку з'яўляецца незадаволеная няўвагай Жонка Млынара.)

Млынарка:
А калі ветрыка няма,
Жорны я кручу сама.

(Пад імклівую музыку выбягае Дачка Млынара.)

Дачка:
Бач, мама, якія спрытныя хлопцы ў Гарадку,
Можа, я, нарэшце, суджанага знайду!..
Хлопцы, хто майму татку дапаможа —
Памалоць зерне жорнамі зможа?

(Пад музыку выходзіць Хлопец.)

Хлопец:
Дзеля красы тваёй, дзяўчына,
Такая праца — не кручына.

Дачка:
А я побач пастаю,
Пакручуся, павярчу.

Млынар:
Выкрунтасы пачакаюць,
Яны рабоце не спрыяюць.

Млынарка:
Як сказаць… Нам, жанчынам, лепей знаць…

(Маладыя людзі падыходзяць да жорнаў, якія размешчаны на стале побач з лупкамі для зерня. Раптам пад музыку з-пад стала вылазіць Кот з мяшэчкам зерня на плячы.)

Хлопец: Ой, хто тут?

Кот: Гэта я, можна сказаць, сек'юрыці — старажу і клець, і амбары. Вось, колькі зерня ў мышэй адабраў, хоць і не такі рухавы!

(Кот пачынае высыпаць зерне ў лупку. Хлопец меле.)

Дачка:
До, до… Не высыпай усё!
Каточак, дай мне свой мяшочак!

(Забірае ў Ката мяшок.)

Глядзі, у нашага катка якая стаць,
Хочаш і ты такім паважным стаць?

Хлопец: І, праўда, чаго ты, кот, такі сыты?

Кот: Работа такая. Толькі на лаве ляжу, праз адно вока гляджу. Не турбуйся, харчоў тут хапае. *(Паказвае мыш.)*

Млынарка:
Добра намалоў мукі — будуць сёння пірагі!

Дачка кідае ў мяшок свой пярсцёнак.

Дачка: Знойдзеш ў жыце персцень мой —
Буду я ўвесь век з табой!

Хлопец знаходзіць персцень і надзявае Дачцэ на палец.

Млынар:
Ціху, ціху, не спяшайся,
На ўвесь век не заракайся.

(Косіцца незадаволена на Млынарку.)

Пагляджу, ці дужы зяць.
Зможаш лёгка мех узяць?

Хлопец:
Які ж гэта мех?..
Такому малайцу на смех!

(Уздымае высока мех.)

Млынар:
Спрытна мех схапіў — я бачу.
Бяры ўжо і дачку ў прыдачу!

Млынарка:
Паглядзіце, акурат
Пастаўскіх караваяў рад:
Для штодня і для бяседы,
Для талакі і для вяселля!

Дачка *(бярэ каравай на ручніку, каб аднесці гледачам на спробу):*

Каравай ты наш прыгожы,
Што з табой зраўняцца можа?..
У пастаўскіх караваях
Усё найлепшае ад краю:
Ад дзевяці палёў пшаніца,
Ад дзевяці крыніц вадзіца,
Ад дзевяці каровак масла,
Паспрабуйце, калі ласка!

Удзельнікі народнага клуба "Традыцыя" спяваюць беларускую народную песню "Пра мельніка".

1-ая ўдзельніца:
Няхай што благое перамелецца
І на лепшае зменіцца!

2-ая ўдзельніца: Каб былі ў вашай хаце заўсёды згода і багацце!

3-я ўдзельніца:
Аўсом-жытам абсыпаем,
Шчасце-долю пасылаем!
Як вы добра працавалі,
Так на Дажынках пагулялі!

(Ідзе абрад абсыпання зернем. Ансамбль працягвае сваю праграму.)

Сцэнарый прадастаўлены Віцебскім абласным цэнтрам народнай творчасці. Аўтар — вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна Людміла ЧАТОВІЧ

Музей, які стварыў

Заснавальнік Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея, археолаг, калекцыянер і мастак Георгій Пех (1897 — 1969) сёння амаль забыты і нідзе не прыгадваецца. Яго постаць застаецца не самай вядомай да гэтага часу не толькі на Ваўкавышчыне, але і ў Беларусі наогул нават сярод тых, хто займаецца гісторыяй, краязнаўствам, археалогіяй. Даследчыкі ведаюць, што быў такі Пех, але ягоны лёс, творчасць і пошукі ніхто ніколі грунтоўна не даследаваў. А гэта быў таленавіты, адукаваны, апантаны сваёй справай чалавек. Ён шмат зрабіў для беларускай археалогіі. Прымаў удзел у археалагічных раскопках Ваўкавыска, Мінска, Слоніма, Турыйска, падрабязна іх апісаўшы, у тым ліку і ў друку. Гэта чалавек, які любіў і даследаваў свой край, які ва ўсіх анкетах і біяграфіях, дзе б ні жыў, заўсёды пісаў, што ён — беларус.

Пасведчанне асобы тэлеграфіста Георгія Пеха.

З біяграфіі

Георгій Пех нарадзіўся 17 снежня 1897 года ў горадзе Луга былой Санкт-Пецярбургскай губерні Расіі ў сям'і беларуса Іосіфа Пеха (родам з Беласточчыны), што быў шанаваным чалавекам, працаваў на чыгунцы тэлеграфістам, потым механікам. (Тэлеграфісткай працавала і маці Георгія Клаўдзія Васільева (паходзіла з сям'і рускага генерала Васільева) і яго дзед.) Бацька нашага героя быў яшчэ і дужа прыкметным чалавекам пры росце каля двух метраў і вазе не менш як паўтара центнера. Кажуць, мясцовыя рамізнікі не хацелі падвозіць Іосіфа на сваіх брычках, бо баяліся, каб ён іх не зламаў.

Перад Першай сусветнай вайной Іосіфа Пеха накіравалі ў Свянцяны Віленскай губерні на пасаду кіраўніка тэлеграфа, дзе абслугоўваўся ўчастак чыгункі ад Нарвы да Панявежа. Ён пераехаў з усёй сям'ёй. Сын Георгій скончыў ў новым мястэчку гарадское чатырохкласнае вучылішча, адразу ж паступіў у гімназію. Але ў верасні 1915 года праз эвакуацыю гімназіі ў Невель вучобу спыніў, зноў пераехаўшы з бацькамі ў Лугу. Восенню 1916-га Георгій паступіў у 12-ю Петраградскую гімназію, аднак доўга там не павучыўся: разам з бацькам выехаў у Чарнавіцы і стаў сам працаваць тэлеграфістам на чыгунцы Галіцыі і Букавіны (у падпарадкаванні ваеннага ведамства). Георгій добра ўмеў працаваць на апараце Морзэ. Праўда, з Чарнавіц як вайскоўца яго хутка адкамандзіравалі ў чацвёрты дарожна-чыгуначны атрад, што падпарадкоўваўся сёмаму корпусу арміі генерала Аляксея Брусілава.

У маі 1917 года, калі расфарміравалі атрад, Георгій Пех зноў вярнуўся ў Петраград, дзе скончыў электратэхнічныя курсы, атрымаў спецыяльнасць механіка тэлеграфа, працаваў на станцыях Нарва, Луга. А калі Віленшчыну вызвалілі ад немцаў, у лютым 1919 года быў прызначаны ў Віленскую акругу шляхоў зносін на станцыю Панявеж. Там ён працаваў да мая, пакуль у горад не ўвайшлі літоўскія войскі. Потым Георгій захварэў на тыф, каля двух месяцаў праляжаў у бальніцы, а калі ачуняў — паехаў у Нова-Свянцяны, дзе спаткаўся з маці і братамі. Ад іх і даведаўся, што падчас захопу Нова-Свянцян белапалякамі загінуў бацька (яго там жа і пахавалі).

У Нова-Свянцянах Георгій працуе канторшчыкам службовага руху дарожна-чыгуначнага транспарта. А з 1931 года ён пераехаў у Ваўкавыск. За палякамі Пех, як сцвярджае ваўкавыскі краязнаўца Мікалай Быхаўцаў, працягваў вучобу ў Віленскай тэхнічнай школе (але ў сваіх аўтабіяграфіях пра яе Пех не згадвае. — **С.Ч.**), скончыўшы яе з адзнакай. Як выдатнага спецыяліста, яго накіроўвалі на працу ў Беласток. Там малады, высокі і прыгожы Георгій знаёміцца з Аляксандрай Чапчук, якая працавала на прадзільнай фабрыцы. Маладыя людзі бяруць шлюб. У хуткім часе спецыяліста запрасілі ў Ваўкавыск, куды ён з жонкай і паехаў. Пазней ў горад прыехалі яго маці з братамі.


Просьба аб дапамозе музею з Беластоцкага абласнога аддзела народнай асветы. 1940 год.

І археалогія

З юнацтва Георгій стаў цікавіцца гісторыяй Бацькаўшчыны, марыў працаваць у музеі. З часам стаў калекцыянаваць манеты, старыя рэчы, моцна захапіўся краязнаўствам і археалогіяй. А ў 1925 годзе ў Гародні пазнаёміўся з археолагам Восіпам Ядкоўскім (Юзафам Іадкоўскім). Апошні запрасіў Пеха прыняць удзел у раскопках "Шведскай гары" каля Ваўкавыска — першых раскопках Георгія.

Наогул, Ядкоўскі шмат разоў гасцяваў у Пехаў, яны разам абышлі амаль усю Ваўкавышчыну. А ў 1935 годзе тамтэйшы інжынер Давыдоўскі прапанаваў Георгію Пеху ў сутарэннях будынка старостава адкрыць музей. Гэты год і лічыцца заснаваннем Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя Баграціёна, які існуе і сёння. Для захоўвання прадметаў Давыдоўскі выдаткаваў Пеху некалькі шафаў. А наш герой пачаў ездзіць то ў Вільню, то ў Варшаву (балазе меў права на бясплатны праезд) па экспанаты: кнігі, манеты, археалагічныя знаходкі...

У той час ён пачаў даследаваць Ваўкавышчыну і суседнія паветы. А ў 1937 годзе даследчык роднага краю становіцца сябрам Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства, і яго актыўна запрашаюць на канферэнцыі. З прыходам савецкай улады ў Ваўкавыск, Георгія Пеха з 1 студзеня 1940 года прызначаюць дырэктарам Ваўкавыскага краязнаўчага музея. Адпрацаваў ён на гэтай пасадзе да 31 снежня 1940 года. А з 1 студзеня да 23 чэрвеня 1941 года працаваў на пасадзе загадчыка гістарычнага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага музея. Калі пачалася Вялікая Айчыннай вайна, Пех разам з сям'ёй пераязджае ў Беласток да жончыных сваякоў. Там ён уладкаваўся памочнікам машыніста на манеўровым паравозе, а жонка гандлявала гароднінай, якую скупляла ў вяскоўцаў. Таксама для беластоцкай газеты "Новая дарога", якую рэдагаваў паэт Хведар Ільяшэвіч, у 1943-м Пех пісаў гісторыка-археалагічныя артыкулы. Мне ўдалося адшукаць тры такія тэксты.

У Ваўкавыску

Калі немцы пакінулі Ваўкавыск, Георгій Пех з сям'ёй вяртаецца ў вызвалены горад. Найперш яго цікавіў лёс музея і музейных экспанатаў. Ён пачаў абыходзіць мясцовых жыхароў. Але знайшлося дужа мала, большая частка каштоўных рэчаў знікла. Аднак ваўкавыскі руплівец не апусціў рук: ён збірае па наваколлі савецкую і нямецкую зброю, уніформу, узнагароды, дакументы часоў акупацыі. А 18 студзеня 1945 года Ваўкавыскі аддзел народнай адукацыі прызначае яго дырэктарам краязнаўчага музея.

Праз год Пех піша ліст народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу з просьбай дапамагчы знайсці сродкі для аднаўлення музея. І Якуб Колас дапамагае: на гэтыя мэты паступіла 500 рублёў. Пасля шматлікіх клопатаў у 1948 годзе пад музей аддаюць адно памяшканне ў былым панскім маёнтку каля дарогі на Слонім, дзе ў 1812 годзе некалькі дзён знаходзіўся штаб Другой Заходняй арміі рускага войска з генералам Пятром Баграціёнам. Сам будынак быў пабудаваны ў 1805 годзе, сёння з'яўляецца помнікам архітэктуры класіцызму. Але аднаго пакоя для музея і тады было мала. Пех дабіўся, каб пад музей з цягам часу аддалі ўвесь будынак. А 27 лютага 1953 года музей быў ператвораны з краязнаўчага ў ваенна-гістарычны імя Баграціёна.

Пасля Другой сусветнай вайны вялікія музеі Савецкага Саюза абавязаны былі дапамагаць мясцінам, якія знаходзіліся пад акупацыяй. На жаль, беларусы такую магчымасць амаль не выкарысталі. Але Георгій Пех з Ваўкавыска яе не абмінуў. У пачатку 1950-х у Ленінградзе быў ліквідаваны інжынерна-артылерыйскі музей, і Пех дабіўся, каб частку экспанатаў адтуль перадалі ў Ваўкавыск, асабліва тыя, што тычацца вайны 1812 года: гусарскія мундзіры, зброя, карціны, гравюры, кнігі... У Ваўкавыскім музеі захоўваецца ці не адзіная ў Беларусі поўная калекцыя рускіх узнагарод таго часу. З Ленінграда і Масквы Георгій Пех вёз старую кальчугу, заходнееўрапейскія, персідскія, турэцкія, расійскія шаблі, мячы, рапіры, шлемы. І тое, што ён меў ва ўласнай калекцыі, таксама аддаў установе. Многія яго экспанаты і сёння захоўваюцца ў іншых музеях Беларусі, а таксама ў прыватных калекцыях. Дарэчы, Пех збіраў манеты і паштовыя маркі: яго калекцыя налічвала звыш 15 тысяч паштовых марак. Была там і першая марка Расійскай імперыі 1857 года.

Раскопкі "Шведскай гары" ў Ваўкавыску (Георгій Пех у другім шэрагу трэці справа). 1954 год.

Мерапрыемства ў Ваўкавыску, прысвечанае вайне 1812 года (Георгій Пех — трэці злева). 1962 год.

Раскопкі

З Георгіем Пехам як з дырэктарам музея, калекцыянерам даўніны, выдатным археолагам, навукоўцам раіліся кандыдаты і дактары навук, супрацоўнікі інстытутаў гісторыі акадэмій навук БССР і СССР, яго запрашалі на навуковыя канферэнцыі, на чытку лекцый. Але да таго, каб стаць кандыдатам, а пасля і доктарам навук, гэтага яго не дапускалі. Ніхто ніколі яму нават не параіў абараніць дысертацыю па беларускай археалогіі. Нават мала публікавалі яго працы, а тыя, якія выходзілі ў навуковых выданнях — вельмі скарачалі.

Летам 1948 года Георгія Пеха запрашаюць прыняць удзел у раскопках Мінскага замчышча. Пех пагадзіўся. І з 15 чэрвеня да 3 верасня 1948 года з'яўляўся начальнікам атрада археалагічнай экспедыцыі. У працоўнай дамове, копія якой захоўваецца ў аўтара гэтых радкоў, ад 8 чэрвеня 1948 года пазначана, што Пех меў выканаць шэраг работ: кіраваць рабочымі пры раскопках на Мінскім замчышчы плошчай да 100 квадратных метраў, выконваць шэраг рабочых замалёвак, чарцяжоў, асобныя даручэнні кіраўніка раскопак, звязаных з арганізацыяй і правядзеннем раскопак, праводзіць фіксацыю і этыкеціраванне знаходак, рабіць чарнавыя запісы ў дзённіку раскопак і гэтак далей. Георгій Пех усё выконваў шчыра і з вялікім задавальненнем, а прымаў ён удзел у раскопках Мінскага замчышча і ў 1946, і ў 1947 і ў 1949 гадах.

31 жніўня 1948 года Георгій Пех атрымлівае ліст з Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР, у якім паведамляецца, што яму дазваляецца праводзіць раскопкі на гарадзішчы "Шведская гара" ў Ваўкавыску. І ўсе "савецкія і грамадскія арганізацыі Ваўкавыскага раёна заклікаюцца дапамагаць археолагу ў паспяховым выкананні ўскладзеных на яго даручэнняў". І Пех "ускладзеныя на яго даручэнні" выканаў. А ў 1958 годзе ў Ваўкавыску ён зноў праводзіць самастойныя раскопкі, даследуе таксама ваколіцы — Аменічы, Рыбакі, Зубаўшчыну, Лазы, Мітрані, Мсцібаву, Турэйскае гарадзішча, курганны могільнік каля вёскі Чырвонае Сяло і іншыя.

Георгій Пех умеў сябраваць. У яго па ўсім былым Савецкім Саюзе, а таксама ў Польшчы ставала шмат сяброў-аднадумцаў. Ён з імі перапісваўся, даваў парады, сам у іх раіўся па розных музейных і археалагічных справах, аднадумцы бывалі адзін у аднаго ў гасцях. Так, шчыра шмат гадоў Георгій Пех сябраваў з заснавальнікам Слонімскага краязнаўчага музея і такім жа, як ён сам, апантаным калекцыянерам, краязнаўцам і музейшчыкам Язэпам Стаброўскім (1870 — 1968). У 1946 годзе Пех завітаў да яго ў Слонім. Тут, у траншэі на замчышчы, на глыбіні каля двух метраў, ён знаходзіць некалькі фрагментаў сярэднявечнай керамікі і кавалак шклянога бранзалета жоўтага колеру. Знойдзеныя прадметы сталі падставай для правядзення на замчышчы археалагічных раскопак у 1953 і 1959 гадах, у выніку чаго лакалізавалі гістарычны цэнтр Слоніма.

Першыя раскопкі ў райцэнтры і ў вёсцы Васілевічы Слонімскага раёна Георгій Пех правёў восенню 1953

года. У маім хатнім архіве захоўваюцца копіі двух адкрытых лістоў на дазвол Пеху праводзіць раскопкі ў Слоніме (на месцы былога замка Агінскага) і аднаго кургана ў вёсцы Васілевічы. Па іх выніках Георгій Пех зрабіў некалькі пісьмовых справаздач, а таксама публікацыю ў кнізе "Древности Белоруссии".

Дарэчы, Георгій Пех з 1 чэрвеня па 15 верасня 1946 года працаваў у самім Слонімскім краязнаўчым: Язэп Стаброўскі ўзяў яго да сябе, бо ў Ваўкавыску тады з-за розных музейных непаразуменняў з мясцовым кіраўніцтвам ён некалькі разоў звальняўся з працы. Але яго зноў клікалі ў Ваўкавыск, і ён вяртаўся…

Георгій Пех — мастак

Георгій Пех быў таксама добрым жывапісцам і скульптарам. Дагэтуль у ваўкавыскім музеі і ў іншых скарбніцах Беларусі знаходзяцца яго скульптурныя і жывапісныя карціны, на якіх адлюстраваны гусар гродзенскага палка на кані, Баграціён, Карбышаў, скульптурная група піянераў-падпольшчыкаў, бой каля Ваўкавыска ў 1812 годзе, бюсты Леніна і гэтак далей. Дарэчы, бюстаў Леніна скульптар у тыя 1940-я — 1950-я нарабіў шмат. На той заробак, які ён пры жыцці

Пех

атрымліваў, пражыць і пракарміць сям'ю было цяжка, таму і ляпіў ён правадыра, прадаваў тыя бюсты калгасам, якія з радасцю іх куплялі і ставілі ў свае "чырвоныя куткі". Пры гэтым Георгій Пех ніколі не быў членам кампартыі, таму савецкія партыйныя чыноўнікі і глядзелі на яго заўсёды неяк асцярожна. Аднойчы Пеха нават хацелі ўзнагародзіць ордэнам, але даведаліся, што ён беспартыйны і ордэн "замялі". Заахвочвалі ж краязнаўцу і музейшчыка толькі ганаровымі граматамі.

Пакінуў музей Георгій Пех у 1967 годзе, тады яму было ўжо 70 гадоў. А праз два гады яго не стала (19 мая 1969-га). Перад смерцю ён прадаў шмат каштоўных выданняў са сваёй уласнай бібліятэкі, калекцыю манет і іншыя рэчы з прыватнай калекцыі, бо баяўся, што сваякам не будзе за што яго пахаваць.

Памяць

Пра знакамітага беларуса, заснавальніка Ваўкавыскага музея, археолага, краязнаўцу, мастака, калекцыянера мала хто і калі згадваў. Маленькая інфармацыя пра яго ёсць у энцыклапедыі "Археалогія і нумізматыка Беларусі", прыгадваў пра яго і краязнаўца з Ваўкавыска Мікалай Быхаўцаў, і мінскі журналіст Віктар Корбут. Вось, бадай, і ўсё. А Георгій Пех заслугоўвае большай памяці, асабліва ў Ваўкавыску, дзе пакінуў вялікі і арыгінальны музей. Музей, які павінен насіць яго імя, і помнік Георгію Пеху мусяць быць у Ваўкавыску, як і вуліца яго імя.

Сяргей ЧЫГРЫН,
краязнаўца, літаратар

Тое самае фота, якое падпісаў аўтару Томас Мальданада.

Рыцар дызайну

Томас Мальданада. "Фармальная кампазіцыя"…

… кампазіцыя "Неарыентаваная паверхня".

… настольныя свяцільні.

У кастрычніку 1955 года ў заходнегерманскім горадзе Ульме ішла цырымонія ўрачыстага адкрыцця новай вучэбнай установы — вучылішча мастацкага канструявання, якое потым стане вядомым на ўвесь свет як Ульмская школа дызайну. На цырымоніі прысутнічалі ганаровыя госці: Вальтар Гропіус — заснавальнік і першы дырэктар знакамітай дызайнерскай школы Баўхаўз , а таксама 92-гадовы Генры ван дэ Вельдэ — у свой час лідар нямецкага мадэрну, стваральнік веймарскай школы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, папярэдніцы Баўхаўза. Ды ўсё сведчыла: новая школа за ўзор узяла акурат апошні, першую школу дызайну сучаснага тыпу, яго ідэі і педагагічную сістэму. Менавіта Баўхаўз упершыню стаў рыхтаваць мастакоў, якія маглі б працаваць з масавай прамысловай формай. Гэта дызайнерская школа мела вялікі ўплыў на развіццё еўрапейскай, а потым і сусветнай мастацкай культуры перадваеннага часу, аднак, у 1933 годзе была закрытая нацыстамі. Адрадзіць традыцыі даваеннага Баўхаўза — такую мэту паставіў стваральнік Ульмскай школы, дызайнер Макс Біл, які і ўзначаліў яе. Сярод яго прыхільнікаў былі амаль усе, каго Біл запрасіў у школу ў якасці выкладчыкаў. Аднак…

На цырымоніі прысутнічаў малады выкладчык, аргенцінец па паходжанні, мастак і дызайнер Томас Мальданада. Ён вельмі паважаў Вальтара Гропіуса, лічыў работу школы Баўхаўз вялікім момантам у развіцці сусветнага дызайну, але, па яго меркаванні, не трэба рэстаўраваць аджылае. Да таго ж Мальданада бачыў хібы, якія існавалі ў методыцы гропіўсаўскага Баўхаўза. Яго не задавальняў, як ён яго называў, "фармалістычны функцыяналізм", затое яму імпанаваў "сацыяльны функцыяналізм" позняга Баўхаўза, калі яго кіраўніком стаў архітэктар Ганес Маер.

Супрацьстаянне паміж Максам Білам і Томасам Мальданада выявілася ад пачатку работы Ульмскай школы дызайну. І ў Мальданада былі свае прыхільнікі — у асноўным маладыя, радыкальна настроеныя дызайнеры. Нарэшце, маладосць перамагла. У 1956 годзе Макс Біл пакінуў пост дырэктара, а ў наступным годзе наогул пайшоў са школы, а кіраўніком вучылішча стаў Мальданада. У сваёй дзейнасці ён паслядоўна адстойваў сацыяльна-культурны падыход да прафесіі дызайнера, гуманістычныя пазіцыі ў дызайнерскім праектаванні, развіваў і замацоўваў тэорыю сувязі фарміравання рэчавага асяроддзя з тэндэнцыямі развіцця грамадства.

Так, менавіта ён вылучыў ідэю так званага апераджальнага праектавання. Па меркаванні Мальданада, праектаванне мела быць звязаным з пытаннямі кіравання і прагназавання культуры, дызайнеры абавязаны звярнуцца да рашэння ў сваёй дзейнасці сацыяльных, палітычных і культурных праблем. Трэба адзначыць, што ідэі героя гэтага эсэ наогул вылучаліся большай рацыяналістычнасцю ў параўнанні з рамантычнай тэорыяй даваеннага Баўхаўза. Мальданада не ставіў у прамую залежнасць характар фарміравання рэчавага свету і непасрэдную пабудову ідэальнага грамадства, пра што марыў Гропіус. Ён разумеў, што змены ў грамадстве падпарадкоўваюцца значна больш складаным сацыяльна-палітычным працэсам. У сувязі з гэтым Мальданада ў сваіх тэарэтычных работах вялікае месца надаваў крытыцы капіталістычнага грамадства з уласцівымі для яго фетышысцкімі адносінамі да рэчавага асяроддзя.

Менавіта дызайн, па яго меркаванні, павінен узяць на сябе функцыю кантролю паўнаты задавальнення чалавечых патрэб у галіне рэчавага асяроддзя. Гэта значыць, што дызайнер мае па-навуковаму падыходзіць да фарміравання рэчавага свету, не бяздумна множыць колькасць рэчаў, а вызначаць структуру функцыянальных працэсаў, якія складаюць жыццядзейнасць сучаснага чалавека, і ў адпаведнасці з гэтым ствараць вырабы, якія найлепшым чынам забяспечвалі б ажыццяўленне тых самых працэсаў, задавальняючы пільныя патрэбы.

Аднак з часам Мальданада прыходзіць да высновы аб несумяшчальнасці навукова абгрунтаванага дызайнерскага праектавання і рэалій грамадства. І ў 1967-м ён пакідае Ульмскую школу, якая, пазбавіўшыся ідэйнага натхняльніка, налета спыняе дзейнасць. Але, нягледзячы на тое, што ідэйны лідар у сваіх тэарэтычных поглядах прыйшоў да пэўнага тупіку, дзейнасць установы адыграла ролю ў развіцці еўрапейскага пасляваеннага дызайну.

Пра сустрэчу з Мальданада, які перамог, расчараваўся і рушыў далей

Дызайнер жа пасля сыходу з Ульмскай школы больш займаецца агульнагуманітарнымі, філасофскімі праблемамі праектавання. У 1967 — 1969 гадах ён кіруе міжнародным саюзам дызайнерскіх устаноў ІКСІД, выкладае на кафедры архітэктуры Прынстанскага ўніверсітэта ў ЗША. Пасля пасяляецца ў Італіі, дзе ў Балонскім універсітэце на факультэце літаратуры і філасофіі стварае кафедру праектавання асяроддзя, а таксама выкладае ў Міланскім політэхнічным універсітэце, піша кнігі.

Адна з галоўных тэарэтычных работ Мальданада гэтага перыяду "Надзеі праектавання. Асяроддзе і грамадства", напісаная ў процівагу авангарднаму дызайнерскаму руху т.з. "новых левых", якія адмаўлялі не толькі існуючую культуру, але і стваральную дзейнасць наогул. Майстар лічыць, што ў сапраўднасці асяроддзе можна змяніць толькі шляхам яго рэальнай перабудовы. Ён паказвае, што праектаванне павінна быць звязана з праблемамі кіравання і прагназавання культуры ўвогуле. Дызайн — гэта перш за ўсё рэальная сіла вытворчасці, фактар, які трывала ўваходзіць з ёй у кантакт.

У 1975 годзе Мальданада прыязджаў у Маскву на IX кангрэс ІКСІД. На пленарным пасяджэнні кангрэса ён выступіў з дакладам на тэму "Дызайн і будучае навакольнага асяроддзя". У сваёй прамове ён сцвярджаў: "…мы лічым, што праблемы распадаюцца на часткі, якія носяць назвы лямп, халадзільнікаў, пральных машын, аўтамабіляў, пасудамыечных машын. У сапраўднасці, рэальныя праблемы называюцца асвятленнем, зберажэннем прадуктаў, праннем, індывідуальным і калектыўным перасоўваннем, мыццём посуду. У любой стратэгіі кантролю нашай першаснай задачай будзе вызваленне саміх сябе ад фетышызму рэчаў…"

Як дэлегат кангрэса я чуў цікавы даклад Мальданада. А потым, у перапынку пасяджэння, мне пашчасціла крыху пазнаёміцца з ім асабіста. Ён сядзеў на лесвічнай прыступачцы і нешта пісаў у сваім нататнічку (зусім як Ленін на вядомых кадрах кінахронікі). Я тады збіраў аўтографы знакамітых гасцей, просячы іх падпісаць мне фатаграфіі, якія былі зроблены ў час кангрэса. У мяне меўся фотаздымак, на якім быў засняты першы рад залы пасяджэнняў, дзе сядзеў Мальданада побач з іншымі замежнымі дызайнерамі. Я падышоў да яго, прывітаўся і папрасіў паставіць свой аўтограф на фотаздымку. Ён усміхнуўся, знайшоў сваю выяву, знізу фатаграфіі паставіў свой подпіс і ад яго правёў стрэлку, якая ўказвала на яго постаць. Гэты аўтограф быў для мяне самым дарагім з тых, што я атрымаў на кангрэсе.

Ну а ў наступным пасля кангрэса годзе Мальданада, не пакідаючы выкладаць, пачынае рэдагаваць адзін з найбуйнейшых італьянскіх часопісаў па архітэктуры і дызайне "Касабела". Ён публікуе новую праграму часопіса ў першым нумары за 1977 год і рэзка крытыкуе выданні, якія толькі рэгіструюць падзеі без спроб вызначыць вартасць зробленага…

■■■

З таго часу прамінула сорак гадоў. І новае тысячагоддзе Мальданада сустрэў у поўным росквіце творчых сіл. На парозе дзясятага дзясятка ён заняўся аналізам асаблівасцей новага лічбавага асяроддзя. Ну а ў красавіку 2016-га Мальданада споўнілася 94 гады. Ці тое яшчэ будзе!

Якаў ЛЕНСУ,
кандыдат мастацтвазнаўства

Клічаўскія тайны

Дзякуючы паланісту Алегу Палянскаму мне ў рукі трапілі вытрымкі з рамана Фларыяна Чарнышэвіча "Надберазінцы". Твор напісаны па-польску, малавядомы ў Беларусі, ні на беларускую, ні на рускую мовы не перакладаўся. Аднак дзеянне рамана пачынаецца ў Бабруйскім павеце (частка, што цяпер уваходзіць у склад Клічаўскага раёна) 1910-х гадоў. Тэкст уражвае дакладнасцю апісанняў, рэгіянальнымі беларускімі слоўцамі ў польскай транскрыпцыі. Аўтабіяграфічны раман, напісаны па дзіцячых і юнацкіх успамінах аўтара, з'яўляецца каштоўнай крыніцай па этнаграфіі і гісторыі сённяшняга Клічаўскага раёна. Прапаную вытрымкі з "Надберазінцаў" ва ўласным перакладзе з польскага выдання 2014 года.

Падрыхтавала Алена ЛЯШКЕВІЧ



Падкур у экспазіцыі "Пчалярства" Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. / Фота Аляксандра ФІЛІМОНАВА

Загадка Воньчы

Месцам нараджэння Фларыяна Чарнышэвіча (1900 — 1964) у польскіх крыніцах называецца Бабруйск, але той жа Алег Палянскі мяркуе, што пісьменнік нарадзіўся дзесьці ў Бабруйскім павеце. Вось і адпаведна раману "Надберазінцы" месца нараджэння галоўнага героя Стаха Балашэвіча — хутар Рогі Бабруйскага павета. Чарнышэвіч удзельнічаў у польска-савецкай вайне, застаўся ў Вільні, бо яго малая радзіма ўвайшла ў склад СССР. Працаваў у паліцыі, расчараваўся ў польскім урадзе і ў 1924 годзе з'ехаў у Аргентыну, дзе і выдаў у 1942-м свой твор.

У першых главах "Надберазінцаў" згадваецца шэраг населеных пунктаў Бабруйскага павета: хутар Рогі, засценак Смалярня, мястэчка Воньча, вёскі Ніты, Ямы і Храпачоў. Воньчай у рамане завецца мястэчка, дзе ў 1911-м годзе пачынае вучыцца галоўны герой Стась Балашэвіч. Аўтар апісвае гэты куток так: "*Людзі тут жылі здаўна. Над самай ракой мясцовасць высокая, палі спадзістыя, урадлівыя, амаль як спуцкія. За ракой — бясконцыя лясы. Даўней вёска і маёнтак, уласнасць аднаго з самых магутных магнатаў Рэчы Паспалітай. Воньча была толькі маленькім кавалкам багацця магната, адной з незлічоных вёсак у яго ўладаннях, але адрознівалася ад астатніх тым, што амаль кожную зіму гаспадар туды прыязджаў на паляванне са світай. […] Цяпер, калі гэтыя лясы за ракой моцна павыцерабленыя, амаль кожную зіму ў Смалярскай пушчы забіваюць па мядзведзі, можна пабачыць лося і рысь. А што ж у даўнейшых лясах, калі ў ваколіцах за 40 вёрст не было ні палянкі?*

Цяпер Воньча — звычайнае мястэчка […]: драўляныя будынкі, вуліцы без бруку і без тратуараў; валадаранне яўрэяў, крамы, майстры, млын, царква, манапалька, пошта, сінагога і школа. Агульнаадукацыйная чатырохкласная школа, адзіная на 350 квадратных вёрст. Будынак школы малы, старасвецкі, амаль не адрозніваецца ад прыстойнай прыватнай хаты: на адзін бок — клас для заняткаў […] на другі — памяшканне настаўніка з вялікай печчу пасярэдзіне, сені і камора. У школе больш за сто дзяцей і адзін настаўнік. Па нацыянальнасці дзеці дзеляцца наступным чынам: яўрэяў 16 працэнтаў, палякаў — 12, татараў — 4, а рэшта — беларусы ці стараверы. Была ў мястэчку і яўрэйская школа, але некаторыя хлопцы, каб авалодаць мовай, наведвалі і рускую. У раёне Воньчы жыло шмат палякаў, а малы працэнт польскіх вучняў у школе тлумачыўся тым, што польскія хутары і засценкі былі рассяроджаны па ўсёй ваколіцы, часта ў глухіх, недасяжных закутках, таму ў школу аддавалі дзяцей толькі тыя […] у каторых было дастаткова грошаў, каб аплаціць дзецям у мястэчку кватэру і харчаванне…"

У гэтым апісанні цікава тое, што ўрадлівасць палёў вакол Воньчы апісваецца праз параўнанне са Случчынай. Землі слуцка-нясвіжскай зоны да меліярацыі Палесся давалі бадай што самы высокі ўраджай у Беларусі. У гісторыі Воньчы згадваецца магнат, але не называецца яго прозвішча. Верагодна, гэта граф Патоцкі, які меў у той мясцовасці вялікія ўладанні.

Фота традыцыйнага адзення з Клічаўскага раёна. / З архіва Студзіцкага этнаграфічнага таварыства

Алег Палянскі мяркуе, што пад назвай Воньча Фларыян Чарнышэвіч "схаваў" Клічаў. Даследчык абгрунтоўвае сваю думку тым, што на картах пачатку XX стагоддзя Воньча знаходзіцца значна далей ад Смалярні, чым апісана ў рамане, і не большая за яе. Па сюжэце ж гэта мястэчка з крамамі, млынам, царквой, сінагогай і школай. Далей па творы ў Воньчы знаходзіўся цэнтр савецкай улады ў воласці. І ўсё ж: апісаная Воньча — гэта Клічаў? У ім у 1901-м, скажам, заснаваны шклозавод. Наўрад ці аўтар яго не згадаў бы, апісваючы мястэчка.

Ёсць вялікая спакуса прыняць за Воньчу Чарнышэвіча вёску Вонічы Клічаўскага раёна (раней уваходзіла ў Бацэвіцкую воласць Бабруйскага павета), але яна ўтворана толькі ў 1927-м і да 1940-га звалася Мяжное. Палякі, што шукалі Воньчу ў 2012-м, прыйшлі да высновы, што гэта цяперашняя вёска Гонча Клічаўскага раёна. Яны грунтаваліся на пазначанай у рамане адлегласці ад Воньчы да Смалярні і на звестках з "Геаграфічнага слоўніка Польскага каралеўства", у 13-м томе якога знаходзім: "Wonicze zl. Goncza". На месцы сучаснай Гончы пазначана назва "Воничы" на карце 1910 года з "Вялікага сусветнага настольнага атласа Маркса" (выдадзены ў Санкт-Пецярбургу). Таму можна сказаць, што паралельна з назвай "Гонча" ўжывалася "Вонічы" і ў польска- і ў рускамоўных крыніцах. Што да "Вонічы — Воньча", дык у мясцовых назвах часта сустракаецца фанетычная варыятыўнасць. Замест "афіцыйнай" назвы "Нясета" на Клічаўшчыне кажуць "Нясята", замест "Пярэкалле" — "Пярэкаль", на той жа карце 1910 года сучаснае Усакіна пазначана як "Осокина".

Але ж у Гончы ў 1908-м годзе быў 21 двор і 201 жыхар, а ў 1917-м — 23 двары, Чарнышэвіч жа апісвае Воньчу як досыць вялікае паселішча. Да таго ж у рамане пазначана, што школа ў Воньчы была адзінай на 350 квадратных вёрст. Школу ў Гончы адчынілі толькі ў 1926-м, а ў Клічаве школа дзейнічала з другой паловы XIX стагоддзя. Але і яна на 1911 год не была адзінай у наваколлі. Мабыць, пакуль варта спыніцца на тым, што Воньча Чарнышэвіча — зборны вобраз усходнебеларускага мястэчка, "спісаны" і з Клічава, і з Гончы, магчыма, з аўтарскімі дадумкамі.

Рагі і Рогі

Хутар Рогі і засценак Смалярня з "Надберазінцаў" можна ідэнтыфікаваць з аднайменнымі сённяшнімі вёскамі ў Клічаўскім раёне. Але пытанняў узнікае не менш, чым з Воньчай.

Рогі, дзе нарадзіўся Стась Балашэвіч, апісваюцца так: "*У бясконцай глушы лясоў за Беразіной, між дзвюма рачулкамі, хутар валокі на тры. Палова з іх лугі […] ад лесу нанасныя, ад поля — мурожныя, для авечак і коняў*". У "Надберазінцах" змяшчаецца гісторыя стварэння Рогаў пасярод пушчы ў 1875-м дзедам галоўнага героя: "*Палёў у тых краях тады яшчэ было вельмі мала. Глухія, некранутыя лясы на дзясяткі вёрст не прыносілі, акрамя палявання, амаль ніякай карысці і гаспадары імкнуліся ўсімі сіламі зрабіць там апрацаваныя палі, што прыносілі б прыбытак. Прасілі людзей, каб у тых лясах закладалі паселішчы, дазваляючы выбіраць, акрамя глушы, дзе толькі падабаецца, і абяцалі не браць на працягу пяці гадоў з новых пасяленцаў арэнды.*

Балашэвіч ранняй восенню, акурат пасля жніва, праехаў некалькі дзясяткаў вёрст лесам і ўпадабаў месца між рачулкамі. Казаў, будзе дзе лавіць рыбу на посны дзень, а жонцы — бялізну і пялёнкі лёгка ў праточнай вадзе паласкаць. Поля, каб паставіць хату, не было зусім. Пушча стаяла вакол глухая і некранутая, як цяпер. Бліжэйшае поле і чалавечае паселішча было вёскай Ніты, за пяць вёрст. Жыхары яе выбранае Балашэвічам міжрэчча, куды часам выпраўляліся па арэхі ці лыка, звалі Рогамі.

Абраў месца, ссек дзесяціны дзве лесу, зладзіў буданы для сябе і худобы, працерабіў сцежку да дарогі за тры вярсты і на прадвесні пераехаў з усёй сям'ёй і маёмасцю". На той момант арандатару Балашэвічу было 37 гадоў, пераехаў ён з жонкай, шасцю сынамі і дачушкай. Ужо ў Рогах нарадзілася яшчэ дзве дачкі. Унукам ад аднаго з сыноў быў Стась, галоўны герой рамана. Пасля таго, як сям'я Балашэвіча ў 1911-м набыла зямлю ў Смалярні і пакінула Рогі, там пасялілася ўжо тры сям'і арандатараў. Гэты расповед часткова пацвярджаецца гістарычнымі звесткамі: вёска Рагі Клічаўскага раёна вядомая з XIX стагоддзя як хутар, у 1897-м там 3 двары, але ў 1908-м — ужо 19 двароў. Адпаведна раману ад Рогаў да Воньчы дзевяць вёрст (троху больш за дзевяць кіламетраў). Ад сучасных Рагоў да Клічава 17 кіламетраў. Гэта яшчэ больш заблытвае лакалізацыю названых Чарнышэвічам населеных пунктаў: ці то Рогі ў рамане — гэта не сучасныя Рагі, ці то Воньча — усё ж такі не Клічаў. Ад сучасных Рагоў да Гончы акурат 9 кіламетраў. Зрэшты, пішучы ў 1942-м годзе пра падзеі 1911-га, аўтар мог і памыліцца ў лічбах.

Так выглядае Смалярня цяпер. / Фота Магілёўскага польскага дома

Клічаўская шляхта

Паводле расповеду Чарнышэвіча, жыццё шляхты ў Рогах мала чым адрозніваецца ад сялянскага: гаспадар сам апрацоўваў зямлю разам з сынамі, займаўся бандарствам, каб падзарабіць, дочкі яго збіралі арэхі, а сыны хадзілі на паляванне і прадавалі здабытых тхароў, ліс ды гарнастаяў.

Смалярня апісваецца так: "*Па левым баку стаяць будынкі, па правым — сады. Дамы крытыя гонтай, вялікія, на тры-чатыры пакоі. Панадворкі і вуліца абгароджаны вострымі каламі, абсаджаны курчавымі дрэвамі. За садамі знаходзяцца агароды з капустай, а да агародаў шчыльна падыходзіць пушча; за хлявамі — гумны, за гумнамі — выган, за выганам — поле, за полем — луг, за лугам іншы лес, але не пушча… Глеба там была не найлепшая, але каля лесу, зручна, да таго ж людная […] вёска. […] У Смалярні 22 гаспадаркі*". Дом Балашэвічаў у Смалярні выглядаў так: "*Ад вуліцы была святліца з грубай і рускай ляжанкай, у сярэдзіне насупраць ганку невялікія сені, ззаду — кухня з вялікай печчу і сталовая, якая часткова выкарыстоўвалася і як спальня*". У Смалярні не было касцёла, бо ў ноч на Вялікдзень Чарнышэвіч апісвае ўсяночную ў хаце. Адпаведна з гістарычнымі крыніцамі сучасная вёска Смалярня (4 км ад Клічава на паўднёвы захад) заснаваная ў канцы XIX стагоддзя выхадцамі з навакольных вёсак і Клічава, што арандавалі ці набылі там зямлю. Мой дзядуля Мікалай Мельнічонак 1928 года нараджэння (амаль усё жыццё пражыў у Клічаве і раёне) кажа, што ў гэтай Смалярні шляхта ніколі не жыла, але была яшчэ іншая Смалярня, дзе сяліліся вартаўнікі панскага леса, і тая акурат была шляхецкай. Яна знаходзілася на лясной дарозе з Усакіна на Мацевічы, над прытокам Ольсы, і дзесь у 1930-х была пакінутая жыхарамі. Гэта прыкладна 24 км на поўнач ад Клічава.

Вёсак Ніты, Ямы і Храпачоў, якія адпаведна раману знаходзіліся ў ваколіцах Рогаў, на старых картах адшукаць не атрымалася.

Апісанні — дакладныя

Раман утрымлівае шмат этнаграфічна дакладных апісанняў. Балашэвіч, заснавальнік Рогаў, у 73 гады выглядаў наступным чынам: "*барадаты, сівы стары, апрануты звычайна, па-засцянковаму: шчыльная шляхецкая шапка, крамная чорная марынарка, саматканыя штаны ў кратку і дужыя боты з шырокімі паморшчанымі халявамі*". У такім адзенні Балашэвіч хадзіў на рыбу. Шляхта апраналася "па-засцянковаму" і едучы ў Воньчу, бо настаўнік, прыгледзеўшыся да строяў Стаха і яго бацькі, здагадаўся: "*А вы што, не местачковыя!*"

Ляснік Васілевіч — "*чалавек пад 40 год, рослы, мажны… з тварам, румяным як бурак і рудой кароткай барадой. На галаве меў выцвілую фуражку, на сабе — кароткую бурую світку, шэрыя ваўняныя самаробныя штаны, на нагах — лапці. На грудзях перакрыжоўваліся два шырокія рамяні: адзін ад стрэльбы, што вісела за спінай, другі — ад паляўнічай торбы з казінай скуры пры левым сцягне. Да рамяня ад торбы была ля сэрца прышчэплена жоўтая бляха шырынёй з далонь з выбітым па-руску надпісам "Лесной сторож"*.

25-гадовы местачковы настаўнік Міхаіл Грывень "*быў апрануты ў шаўровыя боты з глянцаванымі халявамі, сінія штаны, цёмную блузу і блакітны рускі пояс з кутасамі. Меў кароткі стрыжаныя валасы вожыкам, твар старанна паголены*".

З "Надберазінцаў" можна атрымаць уяўленне і пра шляхецкія звычаі. Сустрэўшы Балашэвіча з унукам, ляснік Васілевіч кажа: "*Нехжаж бэндзе похвалёны Езус Хрыстус!*" і цалуе старому руку. Балашэвіч адказвае "*На векі векув!*" і цалуе ляснічага ў патыліцу. У сваю чаргу, Стась цалуе руку лясніку, а той лашчыць малога па галаве. Развітваючыся, зноў малодшыя цалуюць руку старэйшым. Настаўніка ж вітаюць "па рускім звычаі" і на рускай мове: "*Здравствуйте, господин учитель!*"

Можна заўважыць шэраг іншых цікавостак: стары Балашэвіч клянецца гонарам і продкамі. Калі бачыць ляснічага і паведамляе, што адразу пазнаў, той адказвае: "*Значыць, ніколі заможным не стану*" — напалову жартам, напалову верачы ў прыкмету. Сяляне дражняць Балашэвіча "ляхам".

З "Надберазінцаў" можна даведацца аб пчалярстве: "*На мурожным лузе стаяць радком […] тры магутныя дубы. Ствол кожнага з іх, на вышыні двух-трох сажняў* [3,5 — 6 метраў] *апаясаны квадратным памостам, на які набітыя шчыльна знізу вялікія цвікі. Калі глядзець знізу, гэтыя памосты нагадвалі старасвецкія драўляныя бароны, адно што былі шчыльныя і ў чатыры разы шырэйшыя. Мясцовыя жыхары завуць іх "падкурамі". Над памостамі стаялі парамі адзін над другім на суках вуллі… У пчольніку 25 старых рояў*".

Дзякуючы "Надберазінцам" вёсачка Смалярня (ці тая, Чарнышэвічава?) трапіла ў польскамоўную Вікіпедыю. Цалкам верагодна, што на Клічаўшчыну паедуць "літаратурныя турысты" з Польшчы. І тады пытанне, ці тая самая гэта Смалярня, ці тыя Рогі і што за Воньча, паўстане востра. Дарэчы, чаму не распрацаваць загадзя турыстычны маршрут? Да ўсяго, і з гістарычнага, і з літаратурнага пункту гледжання "Надберазінцы" заслугоўваюць таго, каб быць цалкам перакладзенымі на беларускую мову.

К

Ратаванне скарбаў

Намаганнямі беларускіх навукоўцаў падчас спецыяльных экспедыцый 1990-х гадоў удалося сабраць і захаваць шматлікія помнікі этнаграфіі, узоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва забруджанага пасля чарнобыльскай катастрофы рэгіёна. Усё гэта аформілася ў адмысловы фонд пры аддзеле старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сёлета з "К" сваімі ўспамінамі пра экспедыцыі ў тыя мясціны падзяліўся адзін з іх кіраўнікоў Міхаіл Філістовіч (у "К" № 18). Цяпер жа, напрыканцы года, калі мы прыгадвалі 30-годдзе чарнобыльскай бяды, яшчэ адзін багаты на факты матэрыял. Засяродзімся ў ім менавіта на згадках пра самі экспедыцыі.

Кадры са спецыяльных экспедыцый 1990-х гадоў у забруджаныя пасля чарнобыльскай катастрофы рэгіёны. / Фота прадастаўлены Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

Вясной 1991 года ў аддзеле старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору паўстае пытанне аб уратаванні шматлікіх тысяч помнікаў этнаграфіі і народнага мастацтва адселеных вёсак і раёнаў. Тагачасным загадчыкам аддзела быў Віктар Шматаў, паляшук, які паходзіў з гарпасёлка Камарын, што пацярпеў ад аварыі і апынуўся ў трыццацікіламетровай зоне. Шматаў, які не з чужых словаў ведаў аб наяўнасці ў тых краях незлічоных скарбаў, і падняў пытанне аб спробах уратаваць пласт магутнай вясковай культуры з яе моцнымі артадаксальнымі традыцыямі і ладам жыцця. На той час яго ініцыятыва была ўспрынята даволі скептычна і нават з насцярогаю, бо людзі ўжо баяліся слоў "Чарнобыль" і "радыяцыя". Тым больш у зацікаўленых супрацоўнікаў не было аніякага адмысловага абсталявання і транспарту, адсутнічалі нават дазіметры. Але ініцыятыву Шматава падтрымалі некаторыя калегі, якія пасля аказаліся ў складзе першых энтузіястаў, што выпраўляліся ў "чарнобыльскія" экспедыцыі. Нарэшце, ствараецца рэспубліканская спецыялізаваная навуковая арганізацыя і накіроўваецца Дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

Першая экспедыцыя ў складзе Віктара Шматава, Мікалая Мельнікава, Аляксея Хадыкі і Юрыя Піскуна выправілася 3 чэрвеня 1991 года. А паколькі ў інстытуце свайго транспарту не мелася, накіравалася яна ў Брагінскі раён, дзе Шматава добра ведалі, таму можна было разлічваць на дапамогу. Экспедыцыя сталася "разведкай" і, як аказалася, вызначальнай для далейшых даследаванняў і экспедыцый у гэты край. Да самога Брагіна са сталіцы дабраліся на звычайным рэйсавым аўтобусе. Мясцовы аддзел культуры з ахвотаю адгукнуўся на просьбу дапамагчы і выдзеліў транспарт. Агулам да 10 чэрвеня былі абследаваныя вёскі Вязок, Жэрднае, Калыбань, Пучын і Ясені.

Першым пунктам на шляху даследчыкаў апынулася Калыбань, якая знаходзілася за 18 кіламетраў ад Чарнобыля і дзе навукоўцы былі вельмі ўзрушаныя з дзвюх праяў. Па-першае — гэта запусценне, зараснікі хмызняку і пустазелля, вышэйшыя за чалавечы рост, пакінутыя і абрабаваныя вясковыя хаты. А па-другое — палеская вёсачка ўяўляла з сябе сапраўдны скансэн, бо лічы ў кожнай хаце можна было рабіць асобны міні-музей, настолькі многа мелася разнастайнага хатняга і гаспадарчага начыння: кросны, ступы, жорны, самапрадкі, грабяні, кадаўбы, куфры і шматлікая "мяккая" этнаграфія, якая, на жаль, збольшага ўжо спарахнела праз занядбанасць. Забраць усё багацце было немагчыма, асабліва мэблю, і таму цэлы дзень, без абеду і абліваючыся потам, адбіралі лепшыя па захаванасці і мастацкай вартасці прадметы, адначасова праводзілі фотафіксацыю народнай архітэктуры. Удалым было тое, што ў гэтай вёсцы жыла адзіная жыхарка-"вяртанка" — Галіна Ятчанка, якая дапамагала навукоўцам і паказвала, дзе будзе найбольшы "ўлоў".

Увечары ўсё сабранае прывезлі да рэчкі Брагінка. А паколькі ўсе адабраныя рэчы былі зроблены яшчэ да аварыі і захоўваліся пад дахам, то дастаткова было проста ў рацэ пры дапамозе шчотак, рачнога пяску ды мыла вычысціць ўсе прадметы — такой была першасная "дэзактывацыя" ў тых умовах. Прадметы ткацтва вымывалі позна ўвечары ў гасцініцы.

У наступныя дні наведаліся і ў іншыя вёскі, якія, на жаль, у этнаграфічным і матэрыяльным плане былі больш бедныя ў параўнанні з Калыбанню, але цікавых знаходак і там ставала. Пасля ўсе сабраныя матэрыялы былі складзеныя і пакінутыя ў Брагіне, амаль усе супрацоўнікі вярнуліся ў сталіцу. Не паехаў тады адзін Шматаў, які арганізаваў грузавую машыну і пазней прывёз прадметы ў Мінск.

На той час сярод супрацоўнікаў інстытута ўзнялася нават паніка, бо "прывалаклі" радыяцыю! Тады давялося выклікаць прадстаўнікоў санэпідэмстанцыі і праводзіць замеры, па выніках чаго выдалі нават адпаведныя дакументы: прывезеныя прадметы бяспечныя і іх фон не перавышае дапушчальныя нормы.

Першая, чэрвеньская экспедыцыя 1991 года даказала бяспечнасць, слушнасць і вартасць працягу такіх экспедыцый, і пачаў фарміравацца "Чарнобыльскі фонд".

Наступная экспедыцыя адбылася ў чэрвені 1992 года. Тады выехала ўжо 8 чалавек. Свой базавы лагер раскінулі на "чыстай" тэрыторыі ў дуброве недалёка ад Камарына. У той час і пазней ужо дапамагала мясцовае лясніцтва: прадастаўляла транспарт — двухмастовы Газон-66 — махіну, якая была актуальнай ва ўмовах бездарожжа і адсутнасці людзей на тэрыторыі, якая вывучалася. Прынамсі, былі выпадкі, калі самі дапамагалі мясцовай міліцыі выцягнуць іх затопленыя машыны. У той экспедыцыі вывучылі 8 вёсак Брагінскага раёна. І ўсё паўтаралася: удзень па вёсках, нават з удзелам мясцовых энтузіястаў, збіралі прадметы, а ўвечары іх мылі ў Дняпры. Як вынік, сабрана каля 200 прадметаў музейнага значэння.

У 1992 годзе пасля стварэння адмысловай Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі стала ажыццяўляцца належнае фінансаванне. Далейшыя экспедыцыі ўжо праходзілі не толькі па Гомельскай, але і па Магілёўскай вобласці. Напрыклад, трэцяя адбылася ў Кармянскім раёне Гомельскай і Краснапольскім раёне Магілёўскай абласцей. Багацце народнай культуры тут уразіла сваёй захаванасцю, насычанасцю і разнастайнасцю. Але паколькі ў выселеных вёсках жыхары не забівалі дошкамі хаты, бо ўжо не спадзяваліся вярнуцца ў родныя мясціны, то і разбурэнняў пабачылі болей. Напрыклад, у чэрвені і жніўні 1996 года давялося прысутнічаць падчас пахавання забруджаных вёсак у Слаўгарадскім раёне. Супрацоўнікі аддзела не толькі збіралі рэчы па хатах, якія пасля закопвалі, але і даволі падрабязна фіксавалі ўвесь гэты працэс на фотавідэаносьбіты. Прынамсі, цягам усіх экспедыцый убачанае пастаянна фіксавалася, а Шматаў яшчэ і рабіў замалёўкі, па выніках чаго была нават арганізаваная выстава гэтых унікальных малюнкаў.

Найбольш уражвальнымі і каштоўнымі былі экспедыцыі ў Нараўлянскі раён, арганізаваныя ў 1993, 1995 і двойчы ў 1997 гадах. Тады грузавым транспартам дапамагаў нараўлянскі аддзел культуры. Разам з шыкоўнай мясцовай прыродай і ракой Прыпяць, гэты край аказаўся багаты і разнастайны на розныя творы этнаграфіі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод знойдзенага было шмат мэблі: разныя сталы, шматлікія ложкі, куфры і інш. Маляваныя ж дываны, шматлікія ўзоры ткацтва, бандарныя вырабы вялікіх памераў сустракаліся і ў суседнім Хойніцкім раёне. А, напрыклад, у Ельскім раёне была знойдзена ўнікальная нажная ступа, з'ява вельмі рэдкая для Беларусі — такія ступы супрацоўнікі аддзела раней бачылі толькі на ілюстрацыях.

Усяго на працягу 1991 — 1994 гадоў навукоўцамі было праведзена 8 экспедыцый і абследавана амаль 70 адселеных вёсак Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Пры адсутнасці свайго транспарту, без спецадзення, амаль не абсталяваныя тэхнічна, супрацоўнікі выратавалі сотні і сотні помнікаў традыцыйнай народнай культуры і мастацтва. У Мінску была праведзена іх экспертыза ў Інстытуце радыябіялогіі і галоўным упраўленні па гідраметэаралогіі пры Савеце міністраў на наяўнасць радыяцыйнай небяспекі для людзей. Як вынік, былі выдадзеныя адпаведныя дакументы з рэкамендацыямі аб магчымым далейшым выкарыстанні рэчаў у музейных экспазіцыях.

Аляксандр ГАЛКОЎСКІ,
захавальнік чарнобыльскай калекцыі, малодшы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
- "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
- "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
- "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
- "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
- "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".

Выставы:
- Выстава твораў рускага жывапісу XIX—XX стст. са збору Аляксандра Валадчынскага — да 6 лютага 2017-га.
- Выстава **"Свет нябесны на зямлі"** — да 30 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Майстры Віленскай школы Міхась Сеўрук і Пётра Сергіевіч. Жывапіс і графіка з прыватных калекцый"** — да 23 студзеня 2017-га.
- Выстава твораў Юрыя Карачуна (1931–1997), прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння мастака — да 23 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Калядная казка"**, прысвечаная святу Раства Хрыстова — да 10 студзеня 2017-га.
- Цыкл лекцый **"Музейныя гісторыі"** — да 11 студзеня 2017-га (кожную сераду а 19-й, Малая зала).

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
- **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
- **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
- Выстава чароўных лялек мастака Настассі Адамовіч **"Краіна цудаў"** — да 23 студзеня 2017-га.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Дзіцячая навагодняя праграма **"На Каляды ў музей!"** — 24 снежня і 14 студзеня.
- Кожную суботу ў 12.00 — майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:
- Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
- "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
- "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".

Выставы:
- Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** — да 1 чэрвеня 2017-га.
- Выстава **"Нацыянальны гістарычны: дзень мінулы — дзень сённяшні"** — да 29 снежня.
- Выстава **"Час цудаў. Зімовыя святы і забавы"** — да 28 лютага 2017-га.
- Выставачны праект **"Час нямых зорак. Ад чорна–белага да чырвонага"** — да 15 студзеня 2017-га.
- Выстава фотаздымкаў Вадзіма Качана **"Стары Мінск"** — у галерэі музея.
- Акцыя **"Вольнае піяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
- Майстар-клас **"Калядныя вянкі"** — 24 і 30 снежня. Пачатак а 17-й.
- Казачныя чытанкі ў музеі — 24 снежня. Пачатак а 17-й.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі.
- Выстава **"Музей ёлачных цацак"** — да 31 студзеня 2017-га.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:
- "Геалогія і палеанталогія".
- "Сезонныя змены".
- "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
- "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
- "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
- "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
- "Выстава насякомаедных раслін".

г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
- Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"** — да 13 сакавіка 2017-га.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
- Атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.
- Выстава **"Сафары парк"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:
- "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
- "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
- "Беларуская музычная культура XX ст.".
- "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
- Выстава **"Стары куфар і прыгажуня ёлка"** з калекцыі Наталлі Кавалёвай — да 15 студзеня 2017-га.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
- Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:
- **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
- Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.
- Выстава **"Запаветныя жаданні"** ў рамках праекта "Спадарыня лялька" — да 15 студзеня 2017-га.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Пастаянная экспазіцыя.
- Навагодняя рэтраспектыва **"Неверагодныя прыгоды"** (добрыя фільмы для ўсёй сям'і Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм") — да 5 лютага 2017-га.
- Тэматычны вечар **"Рэха "Анімаёўкі-2016"** — 26 снежня. Пачатак у 18-30.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"На мой кліч вечавы..."**, прысвечаная жыццю і творчасці Янкі Купалы ў перадваенны час і ў першыя гады Вялікай Айчыннай вайны, — да 2 студзеня 2017-га.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль
- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстава **"Спадчына Святой Еўфрасінні Полацкай"** — да 15 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Апладысменты скрозь стагоддзі"** — да 15 студзеня 2017-га.

Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
- Выстава **"Нясвіжскі праменад"** Ларысы Зарубінай — да 29 студзеня 2017-га.

Ратуша
- Пастаянная экспазіцыя.
- Музейны праект **"Забытыя мелодыі"** — да 31 студзеня 2017-га.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя
- Выстава **"На варце. З гісторыі формы СССР"** — да 15 студзеня 2017-га.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:
- **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
- Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
- Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
- Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.

Акцыі:
- **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
- Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.
- Музейная творчая майстэрня.
- **"Да Коласа на Новы год"** (святочная праграма для дзяцей).
- Выстава мастацкіх работ Людмілы Пятруль да 90-годдзя зборніка алегарычных апавяданняў **"Казкі жыцця"** — да 20 студзеня 2017-га.
- Выстава карыкатур **"Без слоў"** заслужанага дзеяча мастацтваў Азербайджанскай Рэспублікі Байрама Гаджызадэ — да 29 снежня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:
- Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
- **"Калядкі ў Купалавым доме"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў, іх бацькоў і настаўнікаў — да 31 студзеня 2017-га (акрамя суботы і нядзелі).

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:
- **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
- Выстава **"ROBO ART"** — да 29 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Польшча. Архітэктура"** — да 15 студзеня 2017-га.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
- **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
- Міжнародная выстава сучаснага мастацтва **"Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока"** — да 5 лютага 2017-га.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
- **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
- Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:
- **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
- Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:
- "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
- Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
- Выстава фатаграфіі **"Дарогай майстра"** удзельнікаў фотаклуба "Мінск" на пацвярджэнне звання "Народны самадзейны калектыў" — да 8 студзеня 2017-га.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
- Выстава **"Па слядах мамантаў"** — да 15 студзеня 2017-га.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
- **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
- **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
- **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** .

Выставы:
- Выстава **"Прыстанак міласэрнасці. Мастацтва тыбецкага будызму"** са збору Дзяржаўнага Эрмітажа — да 22 студзеня 2017-га.
- Персанальная фотавыстава Юрыя Бірукова **"Бласлаўлёная зямля. Падарожжа па будысцкіх месцах"** — да 22 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Прыватная калекцыя"** Кацярыны Ражджэсцвенскай (Масква) — да 15 студзеня 2017-га.
- Выстава фотаздымкаў пачатку XX стагоддзя з відамі парку і інтэр'ераў палаца Паскевічаў **"Сведкі палацавай эпохі"** — да 22 студзеня 2017-га.
- Выстава **"Тры цвікі"** (у рамках праекта "Новае ў археалогіі Гомельшчыны").
- Выстава **"Свет старажытных людзей"** — да 5 лютага 2017-га.

Вежа палаца

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выставы:
- Міні-выстава да 95-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака Мікалая Палянкова.
- Выстава **"Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай ракі Сож"** — да 31 снежня.
- Выстава **"Норавы эпохі ў еўрапейскім рамане"** — да 31 снежня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Zooterra"**.

Выстава:
- Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад
- **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.

Вежа агляду.

Спачывальня князёў Паскевічаў.
- Інтэрактыўны праект для школьнікаў **"Вялікі музей для цікаўных сяброў"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.
- Выстава **"У баях за вызваленне"**.
- Выстава **"Ваенна-гістарычная мініяцюра"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

Пастаянныя экспазіцыі:
- **"Прырода Лідчыны"**.
- **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:
- Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
- **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
- Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
- Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
- Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
- Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
- Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
- Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
- Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2-68-96
- Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
- Выставы **"Беларускія яўрэі", "Другая сусветная вайна"**.
- Выстава габеленаў Марыі Старасцінай **"Натхненне"**.
- Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2-43-40 (каса)
- Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
- Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.
- Выстава **"Таямніцы майстэрства"** Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
- Выстава **"Зачараванне вышытых карцін"** клуба "Сузор'е" — з 26 снежня да 12 студзеня 2017-га.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
- **24 — "Бахчысарайскі фантан"** (балет у 2-х дзеях) Б.Асаф'ева. Пачатак а 12-й.
- **24, 29, 30 — Гала-канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі.**
- **26 — "Тры парсючкі"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Пачатак а 14-й.
- **27, 28 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
- **27 — "Блакітны агеньчык"** (канцэрт). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
- **31 — "Жар-птушка"** (балет у адной дзеі) І.Стравінскага. Пачатак аб 11-й.
- **31 — Гала-канцэрт зорак Вялікага тэатра Беларусі.** Пачатак а 18-й.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
- **24 — "Мая цудоўная лэдзі"** (мюзікл у 2-х дзеях) Ф.Лоу.
- **26 — "Баль у "Савоі"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
- **27 — "Вяселле ў Малінаўцы"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Б.Аляксандрава. Пачатак а 18-й.
- **28 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К. Брэйтбурга.
- **29 — "Мэры Попінс"** (шоу-мюзікл у 2-х дзеях) М.Дунаеўскага. Прэм'ера.
- **30 — "Лятучая мыш"** (аперэта ў 3-х дзеях) І.Штрауса.
- **31 — "Новы год у стылі Галівуд"** (музычнае шоу). Пачатак а 18-й.

Спектаклі для дзяцей:
- **26, 27, 29, 30** (пачатак аб 11-й і а 14-й) **— "Баль у Папялушкі"** (музычны шоу-канцэрт для дзяцей і дарослых у адной дзеі).
- **28 — "Снежная каралева"** (мюзікл у 2-х дзеях) Г.Шайдулавай. Пачатак аб 11-й і а 14-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
- **24, 26, 27, 28, 29, 30 — "Залатое сэрцайка"** (інтэрактыўная казка для дзяцей і іх бацькоў) С.Навуменка. Пачатак аб 11-й і а 14-й.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **24** (пачатак аб 11-й і а 14-й)**, 25** (пачатак аб 11-й, а 14-й і а 17-й)**, 27, 28, 29** (пачатак а 17-й)**, 30** (пачатак у 10.30 і 13.30) **— "Прынцэса цырка і Дзед Мароз"** (танцавальна-забаўляльная праграма **"Новы год у краіне гномаў"** для дзяцей ад 3 гадоў).